Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

9 КРАСАВІКА 2008 г.
СЕРАДА
№ 67 (26180)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прамая лінія

ЯК ПАПЯРЭДЗІЦЬ АСТЭАПАРОЗ І ЯК З ІМ ЗМАГАЦЦА?

Якія метады прафілактыкі і лячэння хваробы ёсць сёння? Гэтыя і іншыя пытанні вы можаце задаць падчас «прамой лініі» **загадчыцы кабінета астэадэнсітаметрыі Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Наталлі Аляксееўне ВАСІЛЬЕВАЙ.** ***«Прамая лінія» адбудзецца 11 красавіка ў пятніцу з 15.00 да 16.30 па нумарах 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па тэлефонах 8 (017) 287 18 36 (Вольга Шаўко) і 287 18 29 (Святлана Барысенка).***

«Прамая лінія» па вашых просьбах!

ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ

Забытае... Новае... Вечнае... Як дзіўна ўплятаюцца ў канву сучаснасці сімвалы нашых продкаў. Што нясуць у сабе гэтыя пасланні? У хуткім часе ў чытачоў «Звязды» з'явіцца магчымасць аб гэтым даведацца.

Як лепш справіць вяселле? Хто можа быць хросным бацькам ці маці і якія правілы існуюць у дачыненні да правядзення хрэсьбін? Як правільна правесці пахаванне і памінанне? Як арганізаваць улазіны? На гэтыя і іншыя пытанні, якія датычацца ролі і месца народных традыцый у сённяшнім жыцці, а таксама некаторых аспектаў народнай медыцыны, адкажуць падчас чарговай «прамой лініі» нашы пастаянныя аўтары **загадчык кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат філалагічных навук Іван Іванавіч КРУК і старшы выкладчык гэтай жа кафедры Аксана Веніямінаўна КАТОВІЧ.**

«Прамая лінія» пройдзе 24 красавіка з 15.30 да 17.00. Тэлефануйце ў рэдакцыю па нумарах: 292 38 92; 292 38 21. (Кантактны тэлефон для папярэдніх званкоў — 292 21 03)

Беларусь і В'етнам маюць трывалы фундамент для пашырэння эканамічнага супрацоўніцтва

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 8 красавіка ў другі дзень афіцыйнага візіту ў Сацыялістычную Рэспубліку В'етнам прыняў удзел у цырымоніях ускладання вянкоў да Манумента паўшым героям і Маўзалея Хо Шы Міна ў Ханоі.

Затым кіраўнік беларускай дзяржавы зрабіў кароткую экскурсію па Музеі Хо Шы Міна.

Аляксандр Лукашэнка таксама сустрэўся з выпускнікамі беларускіх ВНУ, прадстаўнікамі таварыства дружбы «В'етнам—Беларусь», навуковых колаў, прафсаюзаў, Саюза жанчын і іншых грамадскіх арганізацый В'етнама.

Як заявіў Прэзідэнт на сустрэчы, блізкасць мадэлі развіцця Беларусі і В'етнама стварае трывалы фундамент для пашырэння эканамічнага складальніка двухбаковых адносінаў. На яго думку, у краін ёсць магчымасці для дынамічнага нарошчвання аб'ёму тавараабароту і развіцця сумесных вытворчасцяў. Беларусь і В'етнам маюць вялікія перспектывы супрацоўніцтва ў галіне нафтахімічнай прамысловасці, машынабудавання, сельскай гаспадаркі, навукі і тэхнікі, аховы здароўя і культуры.

Кіраўнік дзяржавы з задавальненнем канстатаваў, што пазіцыі дзвюх краін па важнейшых пытаннях міжнароднага парадку дня супадаюць або блізкія. «Перш за ўсё па такіх, як неабходнасць руху да шматпалярнага свету, умацаванне аўтарытэту і ролі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, недапушчальнасць умяшання звонку ва ўнутраныя справы суверэнных дзяржаў», — удакладніў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што беларуская сістэма адукацыі гатова прымаць в'етнамскіх грамадзян на навучанне.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў Беларусі надаюць вялікае значэнне стварэнню максімальна камфортных умоў для студэнтаў з іншых краін, пытанням іх бяспекі і прафесійнага станаўлення. «Спадзяюся, магчымасці беларускай сістэмы адукацыі будуць у поўнай меры выкарыстоўвацца в'етнамскай дзяржавай», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, узаемадзеянне дзвюх краін у галіне адукацыі ўжо мае багатыя традыцыі. У гэтай сферы Беларусь супрацоўнічае з В'етнамам з 1962 года. За гэты перыяд для СРВ падрыхтавана больш за 1100 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, 152 кандыдаты навук, 3 доктары навук. 155 грамадзян В'етнама скончылі тэхнікумы, 1816 — прафесійна-тэхнічныя вучылішчы Беларусі. Многія выпускнікі беларускіх ВНУ сталі выдатнымі партыйнымі дзеячамі В'етнама, аўтарытэтнымі вучонымі, паспяховымі бізнэсменамі.

Афіцыйны візіт Прэзідэнта Беларусі ў В'етнам завяршыўся.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Ва Ўрадзе

Кожнаму жыхару малога горада — гарантаваная праца з дастойнай зарплатай

«Сёння ёсць канкрэтныя гарады, дзе людзі не забяспечаныя працай. Вось наш галаўны боль», — зазначыў на ўчарашнім пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі. Кіраўнік урада, пад старшынствам якога былі падведзены вынікі рэалізацыі летась Дзяржаўнай комплекснай праграмы развіцця рэгіёнаў, малых і сярэдніх гарадскіх пасяленняў Беларусі на 2007—2010 гады, падкрэсліў, што перад краінай стаіць задача за тры гады ліквідаваць праблемы занятасці насельніцтва ў малых гарадах. І тут, на думку Сяргея Сідорскага, апроч усяго, патрабуецца і ініцыятыва мясцовых уладаў, якія могуць і павінны выходзіць з прапановамі аб стварэнні новых прадпрыемстваў і вытворчасцяў.

Прэм'ер, у прыватнасці адзначыў, што немагчыма зрабіць так, каб усё насельніцтва працавала на буйных прадпрыемствах, якія даюць валавыя паказчыкі рэгіёну. Нездарма праграма накіравана на развіццё ў малых гарадах невялікіх прадпрыемстваў, якія вырабляюць спажывецкія тавары. Акрамя таго, неабходна тут развіваць сферу паслуг, сэрвісу, каравей, усё тое, што дае стабільныя працоўныя месцы. «Людзі ў малых гарадах павінны мець гарантаваную працу і дастойную зарплату», — канстатаваў прэм'ер.

Міністр эканомікі Мікалай Зайчанка праінфармаваў, што ўсім абласцям удалося выканаць толькі тры паказчыкі — узровень беспрацоўя, стварэнне новых працоўных месцаў і рост намінальна налічанай сярэднямесячнай зарплаты. У сярэднім узровень беспрацоўя склаў усяго 1,4 працэнта да колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва. Створана больш як 28 тысяч новых рабочых месцаў, што больш як на 7 тысяч месцаў перавысіла заданне. У снежні намінальная налічаная зарплата ў сярэднім склала больш як 665 тысяч рублёў. Разам з тым, па чатырох паказчыках — колькасці занятых у эканоміцы, прадукцыі прамысловасці, вытворчасці спажывецкіх тавараў і колькасці малых прадпрыемстваў — заданне выканалі не ўсе вобласці. Колькасць занятых у эканоміцы малых і сярэдніх гарадскіх пасяленняў склала 767,5 тысячы чалавек пры заданні 820,8 тысячы. Гэты паказчык, дарэчы, выканалі толькі Гомельская і Мінская вобласці.

У цэлым у малых і сярэдніх гарадскіх пасяленнях у рамках рэалізацыі праграмы было ўкладзена 2,9 трыльёна рублёў інвестыцый. Гэта сума складае 11,5 працэнта ад агульнага аб'ёму інвестыцый па краіне. Як падкрэсліў Мікалай Зайчанка, рэалізавана 202 праекты, што істотна больш, чым было ўключана ў пералік найважнейшых інвестыцыйных праектаў на 2007 год. Фактычнае выкананне планавага задання было перавышана на 43,3 працэнта, што, паводле слоў міністра, сведчыць пра дастатковага актыўную працу як па пошуку інвестараў, так і па працэсу мадэрнізацыі прадпрыемстваў. У ліку завершаных інвестпраектаў, напрыклад, тэхнічнае пераўзбраенне цэха сухога абястлушчанага малака ў ААТ «Лунінецкі малочны завод», арганізацыя шклатарнай вытворчасці з выпускам шкляного слоіка дробнага асартыменту на Гомельскім шклатарным заводзе. Разам з тым, з 48 інвестыцыйных праектаў, якія атрымалі летась статус найважнейшых, завершаныя толькі 26. Астатнія 22 аб'екты ў тэрмін не былі ўведзены. Гаворачы аб прычынах зрыву ўводу аб'ектаў, Мікалай Зайчанка назваў, у прыватнасці, несвоечасовую падрыхтоўку праектна-каштарыснай дакументацыі, у выніку чаго затраты на аб'екты аказаліся вышэйшымі, чым планавалася, недаатрыманне крэдытаў, рашэнне айчынных і замежных уласнікаў аб пераносе тэрмінаў увядзення аб'ектаў, несвоечасовае выкананне падрадчыкамі сваіх абавязацельстваў.

— Сёлета мы стварылі ўсе перадумовы, каб спрацаваць па праграме значна лепш, — заўважыў Мікалай Зайчанка. — Да таго ж, сёння агульная сітуацыя лепшая, чым летась». Усімі рэспубліканскімі органамі дзяржкіравання і абласканкамамі распрацаваны каштарыс расходаў на фінансаванне інвестпраектаў і мерапрыемстваў на 2008 год. У каштарысах указаны аб'ёмы фінансавання па кожным малым і сярэднім пасяленні, што ўключаны ў праграму. Урад, заявіў Мікалай Зайчанка, будзе штоквартальна адсочваць ход рэалізацыі інвестпраектаў у кожным малым горадзе.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Аптымістычная дэмаграфічная нотка

Па выніках першых двух месяцаў гэтага года, упершыню за апошнія 20 гадоў, смяротнасць сярод гарадскога насельніцтва Беларусі не перавысіла нараджальнасць. Увогуле на працягу трох апошніх гадоў у Беларусі назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя да росту нараджальнасці. Аб гэтым паведаміў на 10-м пасяджэнні пастаянна дзеючага семінара пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі намеснік міністра аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Віктар Рудэнка.

Сярэдняя чаканая працягласць жыцця беларусаў за апошнія гады стабілізавалася і складае цяпер 69 гадоў. Па-ранейшаму высокай застаецца смяротнасць мужчын у працаздольным узросце, асабліва ў сельскай мясцовасці, а працягласць жыцця вяскоўцаў намнога меншая ў параўнанні з гараджанамі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Гомель прызнаны лепшым горадам у СНД

У Маскве адбыўся першы міжнародны конкурс-агляд «Лепшы горад СНД», які праводзіла Міжнародная асамблея сталіц і буйных гарадоў. Сярод 92 гарадоў з дзевяці краін СНД Гомель выйшаў пераможцам у справе ўкаранення інавацыйных тэхналогій у гарадской гаспадарцы і ў захаванні і падтрымцы культурна-гістарычнай спадчыны.

— 75 працэнтаў жыллёвага фонду абсталявана прыборамі групавога ўліку цяпла, — расказвае генеральны дырэктар КВУП «Гомельская гарадская ЖКГ» Ігар Каршакоў. — Праходзіць апрабацыю так званы новы прадукт «Дамавы ўлік затрат», дзякуючы якому неўзабаве жыхары, звярнуўшыся ў ЖЭУ, змогуць даведацца аб затратах на бягучы і тэхнічны рамонт свайго дома і г.д.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Ці многія з нас памятаюць сваю калыску? Тую, што ў далёкія ці не вельмі гады чула твой дзіцячы голас, матуліны калыханкі, была ў свой час не толькі неад'емнай часткай хатняга інтэр'еру, але і цэнтрам увагі родных і зусім невядомых людзей.

«...калыхалі мяне ў самаробнай калысцы, якую зрабіў калісьці для майго таты яго дзед. Гэта калыска цяпер у нашым школьным музеі...» Я прыводжу радкі, напісаныя адзінаццацікласніцай Таццянай Бойка, якая вучыцца ў Мётчанскай школе Барысаўскага раёна. Цытую дзеля таго, каб засведчыць, дзякуй Богу, яшчэ існуючую шкалу каштоўнасцяў у сістэме светаўспрымання сучаснай моладзі. Гэтыя радкі дзяўчына напісала ў сваёй даследчай рабоце, з якой прыехала на IV рэспубліканскую навукова-практычную канферэнцыю «Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання».

(Заканчэнне на 8-й стар.)

Юлія БУЛЫГІНА працуе мастаком ў раённым Доме рамёстваў гарадскога пасёлка Акцябрскі. Гэты населены пункт Гомельшчыны вядомы сваёй багатай спадчынай, назапашанай народнымі майстрамі, спевакамі, музыкамі. Гэтымі днямі ў пасёлку прайшла IV рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя «Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання».

Справы суседскія

Расійскія парламентарыі наведаюць ваенныя падраздзяленні сваёй краіны, размешчаныя ў Беларусі

Міжпарламенцкае ўзаемадзеянне Беларусі і Расіі — без сумненняў, плённае і трывалае. Падчас рабочых візітаў абмяркоўваюцца пытанні, якія могуць быць вырашаны выключна сумеснымі намаганнямі. Днямі дэлегацыя Камітэта Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расіі па абароне і бяспецы на чале з намеснікам старшыні камітэта Валерыем Трушнікавым наведала Беларусь.

— Мэта нашай паездкі — паглядзець, як нашы ваеннаслужачыя ў вас жывуць, якія ёсць праблемы, у тым ліку і ў заканадаўчым плане, — адзначыў кіраўнік дэлегацыі падчас сустрэчы з Мікалаем Чаргінцом, старшынёй Пастаяннай Камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы. — За апошнія два гады мы пабывалі практычна паўсюль за мяжой, дзе ёсць расійскія ваенныя падраздзяленні, і ўяўляем кола тых пытанняў, якія ўзнікаюць, — пытанні грамадзянства, жылля, пенсій. На некаторыя з іх адказаць вельмі складана, будзем спрабаваць вырашаць іх.

Мікалай Чаргінец зазначыў, што такія сустрэчы «дазваляюць зверыць гадзіннікі, намеціць дадатковыя меры, якія могуць быць прынятыя».

— Для нас, беларускіх парламентарыяў, важна паслухаць сваіх калег аб становішчы спраў у Расіі, асабліва напярэдадні зменаў у найвышэйшым кіруючым эшалоне, — дадаў палітык.

Ад праблем двухбаковых — да праблем сусветных: падчас сустрэчы сенатары таксама абмеркавалі магчымае размяшчэнне на тэрыторыі Чэхіі і Польшчы элементаў амерыканскай проціракетнай абароны. Беларускія і расійскія парламентарыі выказаліся супраць такой перспектывы. У саміх гэтых краінах стаўленне да гэтага неадназначнае, паводле слоў Валерыя Трушкіна, «у чэшскім урадзе — за, у парламенце працэнтаў 70 дэпутатаў, у тым ліку і кіраўніцтва парламента, катэгарычна супраць гэтага, і насельніцтва Чэхіі супраць. Тым не менш, пры галасаванні ў парламенце меркаванні падзялілася 50 на 50». Мікалай Чаргінец выказаў сумненні наконт таго, што элементы абароны не будуць выкарыстаныя амерыканскім бокам для размяшчэння наступальнай зброі, у тым ліку і ядзернай. Палітык таксама адзначыў, што «Расію проста вымушаюць прымаць адэкватныя меры рэагавання». «Мы ўражаны вытрымкай прадстаўнікоў Расіі», — дадаў ён.

Ала МАЧАЛАВА.

Салодкі «корт» ад Максіма Мірнага

Юбіляру Уладзіміру Валчкову яго напарнік ужо падарыў арыгінальны торт, але каманда жадае «паднесці» імянінніку яшчэ адзін прэзент — перамогу над швейцарцамі

З 11 па 13 красавіка ў мінскім футбольным манежы адбудзецца матч Кубка Дэвіса Беларусь — Швейцарыя. Учора гаспадары і госці далі свае прэс-канферэнцыі напярэдадні турніру.

Лідар беларускай каманды Максім Мірны выказаў думку, што перамога ў гэтым матчы дазволіць не толькі прабіцца ў Сусветную групу, але адначасова стане добрым падарункам на юбілей яго напарніку Уладзіміру Валчкову. Праўда, свой прэзент на 30-годдзе сябру ён ужо зрабіў: кандытары кафэ Мірнага стварылі арыгінальны торт у выглядзе тэніснага корта.

Сам жа імяніннік пашкадаваў, што ў складзе швейцарцаў, на жаль, не будзе наймацнейшага тэнісіста свету Ражэ Федэрара. «Зоркі» такой велічыні ў Мінску яшчэ не было, — згадзіўся Максім Мірны. — Прыезд Федэрара стаў бы прыемнай навіной для ўсіх аматараў тэніса, але ён аддаў перавагу не каманднаму спаборніцтву, а сваёй падрыхтоўцы да індывідуальнага турніру». «А яшчэ нам было б вельмі прыемна перамагчы Федэрара дома», — дадаў капітан каманды Дзмітрый Татур. На гэту рэмарку журналісты адрэагавалі здзіўленнем: усё ж Федэрар — першая ракетка.

«Нашы ігракі падышлі да матча без траўмаў, з палепшаным рэйтынгам, — растлумачыў сваю ўпэўненасць у камандзе Дзмітрый Татур. — Радуе, што ў нас цяпер, як ніколі, збалансаваны склад, бо моладзь прагрэсуе, і праз паўтара—два гады Уладзімір Ігнацік і Андрэй Каратчэня стануць нашым надзейным тылам».

Аднак нягледзячы на адсутнасць Федэрара ў складзе каманды швейцарцы на сваёй прэс-канферэнцыі заявілі, што «прыехалі ў Беларусь па перамогу». Значыць, матч лёгкай прагулкай не стане.

«Для нас не мае ніякага значэння замена былога пакрыцця новым, — прызнаўся Максім Мірны, — для нас больш значыць тая атмасфера, якую ствараюць беларускія балельшчыкі на дамашніх сустрэчах». Сапернікі ж паведамілі, што яны з радасцю згуляюць на тэрафлексе, бо гэты варыянт для іх не горшы за грунт. Хоць яны выглядалі вельмі ўпэўнена і рвуцца ў бой, капітан беларусаў Дзмітрый Татур выказаў спадзяванне, што «сваёй гульнёй нашы тэнісісты разгоняць хмары і прынясуць сонца ў кожны дом». Я так разумею, гэта быў намёк на добрае завяршэнне матча. Днём у чацвер у мінскай Ратушы пройдзе жараб'ёўка, якая вызначыць парадак выхаду ігракоў на корт.

Ірына ПРЫМАК.

ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ПАВІНШАВАЎ КОФІ АНАНА З 70-ГОДДЗЕМ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў старшыню Савета заснавальнікаў Сусветнага гуманітарнага форуму Кофі Анана з 70-годдзем.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

БУДУЧУЮ АЭС ПЛАНУЕЦЦА АБАРАНЯЦЬ СІЛАМІ ППА

Аб гэтым паведаміў камандуючы ВПС і войскамі ППА Беларусі Ігар Азаронак.

«Цяпер гэта пытанне ўсебакова вывучаецца. Думаю, што для прыкрыцця беларускай АЭС будуць выдзелены сілы і сродкі ППА», — сказаў ён. Ігар Азаронак таксама дадаў, што, згодна з сусветнай практыкай, аб'екты такога тыпу, як правіла, непасрэдна прыкрываюцца сіламі і сродкамі ППА.

МПЗ СТАНОЎЧА АЦЭНЬВАЕ ВЫНІКІ ПЕРАХОДУ ІП У ПУП

Аб гэтым заявіў журналістам намеснік міністра па падатках і зборах Беларусі Аляксандр Дарашэнка.

Паводле яго слоў, міністэрства адсачыла вынікі дзейнасці часткі прадпрымальнікаў, якія перарэгістраваліся ў ПУП. У выніку ўстаноўлена, што аб'ём рэалізаванай імі прадукцыі павялічыўся, узрасла колькасць наёмных работнікаў, а таксама сума выплачаных падаткаў у бюджэт. Пры гэтым Аляксандр Дарашэнка адзначыў, што непасрэдна ў сам пераходны перыяд аб'ём рэалізацыі прадукцыі прадпрымальнікамі некалькі знізіўся, але гэта было часовай з'явай.

ПАВЯЛІЧАНА ДОЛЯ ДЗЯРЖАВЫ Ў СТАТУТНЫХ ФОНДАХ 28 ААТ

Такое рашэнне прынята пастановай Савета Міністраў № 507.

У пералік адкрытых акцыянерных таварыстваў, якія павінны перадаць у 2008 годзе ва ўласнасць дзяржавы свае акцыі, увайшлі ў асноўным прадпрыемствы канцэрнаў «Беллегпрам», «Белхарчпрам», у тым ліку тры цукровыя заводы — гарадзейскі, жабінкаўскі і скідзельскі, а таксама машынабудаўнічыя прадпрыемствы — ААТ «Лідагапраммаш», ААТ «БАТЭ». Акцыі кожнага з гэтых прадпрыемстваў перадаюцца дзяржаве ў кошт пакрыцця ў 2007 годзе са сродкаў рэспубліканскага бюджэту часткі працэнтаў за карыстанне банкаўскімі крэдытамі. У асноўным крэдыты выдзяляліся на тэхнічнае абнаўленне і мадэрнізацыю вытворчасцяў.

БЕЛТА.

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 09.04.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 145,00
1 еўра	3 381,70
1 латвійскі лат	4 856,24
1 літоўскі літ	979,36
1 чэшская крона	135,08
1 польскі злоты	974,11
1 расійскі рубель	91,15
1 украінская грыўня	429,09

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў
Цэнтрабанк РФ

USD	23,5330
10 UAH	46,7268
1000 BYR	10,9609
EUR	37,0433

Курс у гандлёвых кампаніях (на 08.04.2008 г.)

USD ..... 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ISSN 1990 - 763X

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

МАГІСТРАЛЬНЫ ЦЯГАЧ ПЕРАКУЛЕНЫ ВЕТРАМ

на аўтатрасе ў Віцебскай вобласці. На дарогу вылілася каля тоны тэхнічнага масла. Вадзіцель фуры не пацярпеў.

БЕЛАРУСБАНК ПАЧАЎ АЖЫЦЦЯЎЛЯЦЬ ВАЛЮТНА-АБМЕННЫЯ АПЕРАЦЫІ З КІТАЙСКІМ ЮАНЕМ

Як паведамілі БЕЛТА ў банку, пакуль што такія аперацыі ажыццяўляюць філіял № 100 — Брэсцкае абласное ўпраўленне, філіялы № 121 у Пінску, № 802 у Баранавічах, а таксама № 511, № 520, № 524 у Мінску. У бліжэйшы час аналагічныя аперацыі будуць праводзіцца ва ўсіх абласных цэнтрах і філіялах Мінска.

ЗАТРЫМАНЫ АЎТО З ТАВАРАМ НА 311 МЛН

У Мінску праваахоўнікамі на тэрыторыі аўтастаянкі па вуліцы Будслаўская затрыманы аўтамашыны «МАН» і «Мерседэс-Бенц».

Паводле звестак аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, частка тавару, які знаходзіўся ў аўто, не мела акцызных марак і спецыяльных знакаў Беларусі, а частка — перавозілася па дакументах, якія не адпавядалі рэчаіснасці. У прыватнасці, з Расіі машыны перавозілі віно і гарэлку розных найменняў у шкляной тары вытворчасці РФ і Балгарыі (5500 бутэлек аб'ёмам 4000 літраў) на суму 95 мільёнаў рублёў, а таксама 5000 метраў тканіны кітайскай вытворчасці на суму 180 мільёнаў рублёў, 140 квадратных метраў фінскага паркету — на 16,2 мільёна рублёў і японскія і расійскія тэлевізары «Ташыба», «Дэо» (37 штук) — на 20,1 мільёна рублёў. Аўтамашыны разам з грузам дастаўлены на склады часовага захоўвання мытнага камітэта.

Ігар ГРЫШЫН.

ВЫСТАЎКА «КВЕТКІ. НАСЕННЕ. САД. АГАРОД-2008» ПРОЙДЗЕ Ў МІНСКУ З 16 ПА 19 КРАСАВІКА

Восьмая міжнародная спецыялізаваная выстаўка «Кветкі. Насенне. Сад. Агарод-2008» пройдзе ў Мінску з 16 па 19 красавіка ў выставачных павільёнах ЗАТ «МінскЭкспа», паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў аргкамітэце.

На закрытай і адкрытай выставачных пляцоўках будуць прадстаўлены сучасныя абсталяванне і інструменты, якія аблягчаюць працу садавода і агародніка, сродкі аховы раслін, цяпліцы, парнікі, аранжарэі, збудаванні, канструкцыі для саду і многае іншае. Значную частку экспазіцыі займае шырокі асартымент пасадачнага матэрыялу: элітныя саджанцы пладовых, дэкаратыўных дрэў і кустоў, насенне і расада агародніны і кветак, газонныя травы і іншага пасадачнага матэрыялу, адаптаванага да мясцовых умоў. І, безумоўна, галоўным упрыгажэннем выстаўкі будуць жывыя кветкі — ад простых да экзатычных, зрэзаныя, гаршковыя, кадушачныя.

На працягу работы выстаўкі кожны дзень будуць праводзіцца майстар-класы па фларыстыцы. Наведвальнікам прапануюць вялікі выбар спецыяльнай літаратуры па садоўніцтве, кветкаводстве, садовым дызайне, аранжыроўцы. А яшчэ можна будзе атрымаць прафесійную кансультацыю спецыялістаў-практыкаў па пытаннях азелянення, добраўпарадкавання і догляду раслін. Навінкай гэтага сезона будзе адкрыццё спецыялізаванага салона-кірмашу «Заасвет». Яго ўдзельнікі прадставяць тавары па доглядзе жывёл, ветэрынарныя прэпараты.

$5800 — ЗА 15 ХВІЛІН

5800 долараў, а таксама 112 тысяч беларускіх рублёў страцыў 41-гадовы жыхар Гродна, які пакінуў на 15 хвілін свой аўтамабіль без нагляду.

Здарэнне адбылося на аўтадарозе паблізу пасёлка Аксакаўшчына Мінскага раёна. Тут на пачатку пятай гадзіны вечара аўтааматар пакінуў на непрацяглы час сваю машыну і адышоў па справах. Невядомы зладзюжка нібыта толькі гэтага і чакаў: падабраўшы ключ, ён пранік у салон, адкуль выкраў барсетку з грашыма і знік. Праваахоўнікі адшукваюць «шчасліўчыка».

Ігар ГРЫШЫН.

П'ЯНЫ ВАДЗІЦЕЛЬ МЕЎ НАМЕР НЕЗАКОННА ПЕРАСЕКЧЫ БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКУЮ ГРАНІЦУ

Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-цэнтры Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі.

У Воранаўскім раёне Гродзенскай вобласці ад мясцовых жыхароў была атрымана інфармацыя аб тым, што невядомы аўтамабіль «Фольксваген-Пасат» рухаецца ў бок дзяржаўнай граніцы, расказалі пагранічнікі. Пагранічны нарад, высланы для праверкі інфармацыі, за 30 метраў ад лініі дзяржграніцы знайшоў аўтамабіль у кюветы з пашкоджаннямі бампера і капота. Вадзіцель машыны спаў за рулём. Як вывілася, ён знаходзіўся ў стане моцнага алкагольнага ап'янення.

З КАЗЫРКА — ДЫ Ў БАЛЬНІЦУ

трапіў мужчына, жыхар шматпавярховіка ў Гомелі.

— Добра падвыпіўшы і не кантралюючы па гэтай прычыне сваіх дзеянняў, ён вываліўся з кватэры на казырок пад'езда і ляжаў там з траўмамі да таго часу, пакуль у справу не ўмяшаліся работнікі абласнога ўпраўлення МНС. Яны і выклікалі хуткую медыцынскую дапамогу.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

МЕТАДОН ЗАБРАЎ У ТУРЭМНЫ ПАЛОН

Да 10 гадоў пазбаўлення волі асуджана 20-гадовая мінчанка за незаконнае захоўванне і збыт наркотыкаў.

Паводле звестак упраўлення інфармацыі і сувязяў з грамадскасцю Генеральнай пракуратуры, дзяўчына была затрыманая ў момант продажу 0,2249 грама метадону. Пры сабе яна мела яшчэ 5,66785 грама гэтага наркотыку, дастатковага для прыгатавання прыкладна 50 дозаў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

ВЕЛЬМІ ХАЦЕЛАСЯ ВЫПІЦЬ...

За апошнія выхадныя на Гомельшчыне зафіксавана адразу пяць фактаў адкрытага крадзяжу алкагольных напояў.

Так, раней судзімы жыхар Брагіна з прылаўка магазіна райцэнтра схапіў бутэльку гарэлкі і знік. Тое ж самае зрабіў і шмат разоў судзімы гамяльчанін, які задаволіўся трыма бутэлькамі віна. А ў вёсцы Печышча Светлагорскага раёна алкагольная смага прывяла на злачынную сцежку, дарэчы, як і ў горадзе Васілевічы Рэчыцкага раёна, двух мужыкоў, якія сілаю завалодалі бутэлькай гарэлкі і віна. Усе затрыманыя заявілі ў міліцыі, што ім вельмі хацелася выпіць.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ІРАН ПАЧАЎ УСТАНОЎКУ 6000 НОВЫХ ЦЭНТРЫФУГ ДЛЯ ЎЗБАГАЧЭННЯ ЎРАНУ

Аб гэтым заявіў прэзідэнт Ісламскай Рэспублікі Махмуд Ахмадзі Нежад пасля наведвання завода па ўзбагачэнні ўрану ў Натанзе. Такім чынам анансаваная напярэдадні заява аб новых дасягненнях мясцовых атамшчыкаў спраўдзілася.

Кіраўнік IPI наведаў завод па ўзбагачэнні ўрана ў Нацыянальны дзень ядзерных тэхналогій, які адзначаецца штогод 20-га чысла першага месяца па іранскім календары (сёлета ён выпаў на 8 красавіка).

АПУБЛІКАВАНЫ САКРЭТНЫ ПЛАН ЗША ПА БУДУЧЫНІ ІРАКА: АМЕРЫКАНЦЫ НЕ СЫДУЦЬ НІКОЛІ

У распараджэнне The Guardian патрапіў канфідэнцыйны праект дамовы з нагоды перспектываў амерыканскіх сілаў у Іраку, які ўключае пункт аб неабмежаванай па часе вайсковай прысутнасці ЗША ў краіне.

Гэты дазвол у дакуменце названы «часавым», таксама адзначаецца, што ЗША «не імкнуцца да стварэння пастаянных баз або да пастаяннай вайсковай прысутнасці ў Іраку». Аднак адсутнасць часавых лімітаў і абмежаванняў для ЗША і іншых кааліцыйных сілаў, уключаючы брытанскія, азначае, што, верагодна, гэтая дамова натыкнецца на магутнае супраціўленне як у Іраку, так і ў ЗША. Іракскія крытыкі паказваюць, што дамова не ўтрымлівае абмежаванняў колькасці амерыканскага кантынгенту, зброі, якую маюць права выкарыстоўваць вайскоўцы, легальнага статусу ці паўнамоцтваў у дачыненні да іракскіх грамадзян.

У МАСКВЕ НА ВУЛІЦЫ КАРАЛЁВА МАГЛА ВЫБУХНУЦЬ САМАРОБНАЯ БОМБА

Паводле вынікаў папярэдняга расследавання, прычынай выбуху ў жылым доме на вуліцы Каралёва ў Маскве стала прыведзенае ў дзеянне выбуховай прылады, начыненай аміячнай салетрай. Магутнасць «бомбы» ацэньваецца ў 25 кг у трацілавым эквіваленце.

Нагадаем, напярэдадні пракурор Масквы Юрый Сёмін заявіў, што выбухатэхнікі не выявілі слядоў выбуховых рэчываў на месцы здарэння. Следства схілялася да версіі выбуху газу, аднак, як высветлілася пазней, можа выключыць і яе.

РАЗ'ЮШАНЫ ДЗІК УВАРВАЎСЯ НА ТЭРЫТОРЫЮ ДЗІЦЯЧАГА САДКА Ў ЯПОНІІ: 5 ПАРАНЕНЫХ

У дзіцячым садку японскага горада Касівабара ў цэнтры галоўнага вострава краіны Хансю адбылося ЧП. На тэрыторыю дзіцячага садка ўварваўся раз'юшаны дзік. Ён лёгка раніў іклямі пяцярых дарослых людзей. Усе яны знаходзіліся на тэрыторыі садка і ў прылеглым парку. Дзеці не пацярпелі.

Раней гэты ж кабан збіваў на вуліцах горада веласіпеды і напаў на жанчыну на аўтобусным прыпынку. Тэрмінова выкліканыя члены мясцовага паляўнічага таварыства высачылі жывёлу і змаглі яе злавіць. Цяпер дзік чакае рашэння свайго лёсу ў клетцы. Як мяркуюць спецыялісты, кабан зайшоў у горад з суседніх гор і ўпаў у агрэсію, спалохаўшыся шуму аўтамабіляў.

Акцыі — дзяржаве, крэдыты — фермерам, асартымент — магазінам...

«Прамую лінію» з жыхарамі вобласці ў эфіры тэлеканала «Лад» правёў старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін Сумар.

Падчас «прамой лініі» ў студыю патэлефанаваў 121 тэлеглядач, апаратура зафіксавала таксама чатыры тысячы з лішкам спробаў дазваніцца да першай асобы вобласці. Таму цалкам мелі рацыю тыя, хто пакінуў свае пытанні загадзя па тэлефонах, якія паведамляліся праз рэгіянальныя сродкі інфармацыі. На папярэднія пытанні Канстанцін Сумар даваў грунтоўныя адказы з лічбамі, фактамі, высновамі. Некаторыя званкі спецыялісты аблвыканкама паспелі праверыць. Так, фермер з Брэсцкага раёна скардзіўся на тое, што банк адмовіў у прадастаўленні крэдыту на пасяўную ў суме 19 мільёнаў рублёў. Старшыня аблвыканкама меў на руках патрэбную інфармацыю і растлумачыў чалавеку, чаму банк заняў такую пазіцыю. З-за нізкай плацежаздольнасці фермерскай гаспадаркі фінансавая ўстанова не пайшла на рызыку. Але сам-насам з праблемамі вясковага земляроба не пакінулі: яму паабяцалі крэдыт у памеры дзевяці мільёнаў рублёў.

У ліку папярэдніх пытанняў была таксама скарга жыхаркі брэсцкага мікрараёна «Граеўка» на тое, што па вуліцы Баброва толькі адзін прадуктовы магазін, а яго асартымент вымушае жадаць лепшага. Каментуючы гэта пытанне, губернатар адзначыў, што пакуль там узвядзенне новага гандлёвага пункта не плануецца. А вось асартымент прадукцыі будзе значна пашыраны. У бліжэйшы час пакупнікі знойдуць на паліцах, напрыклад, малочныя вырабы не толькі ад «Савушкіна прадукту», але і ад іншых вытворцаў вобласці ў адпаведнасці з пажаданнямі пакупнікоў. Аптымістычны адказ атрымаў жыхар гарадскога пасёлка Антопаль Драгічынскага раёна, які звяртаўся з прапановай адкрыць аўтазапраўку ў ваколіцах іх населенага пункта. Заправачная станцыя ў Антопалі хутка з'вяцца.

Пытанні былі вельмі розныя, людзі гаварылі пра ўсё, што іх хвалюе. Некаторыя са зваротаў былі запісаны тэлевізійнікамі загадзя і прагучалі ў эфіры ў форме відэасюжэтаў. Пыталіся пра добраўпарадкаванне і медыцынскае абслугоўванне, пра далейшую рэканструкцыю Брэсцкай крэпасці і пра лёс Ружанскага палаца, нават спрабавалі высветліць пазіцыю першай асобы вобласці наконт 12-гадовага школьнага навучання. Сваё стаўленне да апошняй праблемы аўтар пытання выказала словамі: «Хіба ж гэта правільна, калі ў выпускных класах нашы школьнікі будуць ствараць свае сем'і?»

Яшчэ ў ходзе «прамой лініі» супрацоўнікі тэлеканала згрупавалі пытанні па тэмах і падсумавалі вынікі. Аказалася, што з болей чым сотні паступіўшых званкоў найбольш было па тэме жыллёвага будаўніцтва. Адказваючы на адно з такіх пытанняў, Канстанцін Сумар адзначыў, што ў паляпшэнні жыллёвых умоў маюць патрэбу больш за 90 тысяч сем'яў у вобласці. Цяпер на стадыі распрацоўкі знаходзіцца праграма, паводле якой аб'ёмы будаўніцтва жылля да 2011 года ўзрастуць удвая. Такім чынам, у год па вобласці будзе ўзводзіцца 1,5 мільёна квадратных метраў жылля, з іх у Брэсце — да 350 тысяч. Летась у рэгіёне было пабудавана 770 тысяч квадратных метраў. Але чэргі яшчэ — вялікія. Рэалізацыя праграмы дазволіць скараціць працягласць чаргі да 7—9 гадоў да 2010 года, а праз пяць гадоў — да 3—5 гадоў.

Відаць, не магло не ўзнікнуць пытання пра заторы на дарогах абласнога цэнтра, якія за апошнія год—два сталі звычайным атрыбутам гадзіны пік. У ходзе адказу было заўважана, што заторы — прыкметы вялікіх гарадоў. Значыць, наш горад вырас. Старшыня аблвыканкама адзначыў, што нараканні вадзіцеляў справядлівыя, наспела неабходнасць будаваць у горадзе над Бугам падземныя пераходы. Першыя з'явяцца ў раёне тэхнічнага ўніверсітэта і вуліцы Лакіёнава, будуць таксама рэканструяваны некаторыя з галоўных магістраляў, і праз некалькі гадоў перамяшчацца па горадзе стане зручней.

Асобным пытаннем сталі прабламныя заводы і фабрыкі абласнога цэнтра, якія яшчэ нядаўна не без падстаў называліся горадаўтваральнымі прадпрыемствамі, а цяпер знаходзяцца ў цяжкім стане. Паводле слоў Канстанціна Сумара, становішча на Брэсцкім электралямпавым заводзе можна змяніць да лепшага, калі ўдасца рэалізаваць праект па арганізацыі выпуску энергазберагальных асвятляльных электралямпаў. Гэта будзе прадукцыя, аналагічная той, якую даводзіцца купляць за мяжой.

Некалі ААТ «Дываны Брэста» славіліся на ўвесь Саюз, а цяпер прадпрыемства ў глыбокім крызісе. Яго можна выратаваць з дапамогай дзяржаўных ільгот і субсідый, але пры абавязковай умове — ільвіная доля акцый «Дываноў Брэста» павінна перайсці дзяржаве. Пакуль жа каштоўныя паперы знаходзяцца ў руках былых кіраўнікоў ААТ. Выкупіць іх прадпрыемства не можа, сума для яго — астранамічная. «Але ў хуткім часе пытанне павінна быць вырашана, падыходы да вырашэння знойдзены», — паабяцаў старшыня аблвыканкама.

Яшчэ адзін былы савецкі гігант — завод «Колератрон» можа неўзабаве стаць цэхам, але цэхам з поўнай вытворчай загрузкай.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Жахлівыя лічбы

НЕ ЗБЕРАГЛІ...

Летась на Гомельшчыне загінулі і памерлі 207 дзяцей

Як паведамілі «Звяздзе» ва ўпраўленні інфармацыі і сувязяў з грамадскасцю Генеральнай пракуратуры, нядаўна ў Гомельскай вобласці былі прааналізаваны прычыны гібелі непаўнагадовых у 2007 годзе. Ад розных хвароб памерлі 163 дзіцяці, у тым ліку 52 немаўляці. Ахвярамі пажараў сталі 7 непаўнагадовых, утапіліся — 11, скончылі жыццё самагубствам — 6, столькі ж атрымалі смяротныя траўмы ў выніку ДТЗ. 14 дзяцей загінулі ад рук злачынцаў. Былі зафіксаваны проста жахлівыя выпадкі забойстваў немаўлят іх жа бацькамі. У вёсцы Камаровічы Петрыкаўскага раёна п'яны бацька да смерці забіў сваю зусім маленькую дачку. Нелюдзь ужо асуджаны да 16 гадоў пазбаўлення волі. Летась камісіямі па справах непаўнагадовых ў нядбайных бацькоў былі адабраны 688 дзяцей.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

ОАО «Завод «Продмаш»

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

за 2007 год

(млн руб.)

АКТИВ	Код стр.	На конец отчетного периода
Основные средства (01, 02)	110	2436
Вложения во внеоборотные активы (07, 08)	140	1
Запасы и затраты	210	445
Готовая продукция и товары (40, 41, 43)	215	179
Товары отгруженные, выполненные работы, оказанные услуги (45, 46)	216	78
Налоги по приобретенным ценностям (18, 76)	220	10
Дебиторская задолженность	230	16
Денежные средства (50, 51, 52, 55, 57)	250	135
БАЛАНС	300	3044
ПАССИВ		
Уставный фонд (80)	410	1632
Резервный фонд (82)	420	36
Добавочный фонд (83)	430	1009
Нераспределенная прибыль (84)	450	131
Кредиторская задолженность	730	231
БАЛАНС		3044

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

с 1 января 2007 г. по 31 декабря 2007 г.

Наименование показателя	Код стр.	За отчетный год
1. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ		
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	2548
Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	432
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей) (010-020)	020	2116
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	1894
Прибыль (убыток) от реализации (030-040-050-050)	060	222
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ		
Операционные доходы	070	155
Налоги, включаемые в операционные доходы	071	1
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы)	080	154
Операционные расходы	090	151
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ		
Внереализационные доходы	130	5
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы)	140	5
Внереализационные расходы	150	61
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (140-150)	160	-56
Прибыль (убыток) (060+120+160)	200	169
Налоги и сборы, производимые из прибыли	210	83
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-210-220)	240	82

Информация об ОАО «Завод «Продмаш» за 2007 год

1. Количество акционеров: всего	чел.	14
в том числе: юридических лиц		1
физических лиц	чел.	13
2. Начислено на выплату дивидендов	млн. руб.	5,2
3. Дивиденды, приходящиеся на 1 акцию	руб.	13,5
4. Обеспеченность акции имуществом Общества	млн. руб.	5,2
5. Количество простых акций, находящихся на балансе Общества	шт.	388671
6. Просроченная дебиторская задолженность	млн. руб.	116
7. Просроченная кредиторская задолженность	млн. руб.	77
8. Среднесписочная численность	чел.	74

Директор **Н.Д. Щетинко**

Главный бухгалтер **Л.М. Потапенко**

УНН 100016885

Абзац

■ **МПЗ Беларусі распрацавала чатыры варыянты змянення шкалы ставак падаходнага падатку. Аб гэтым паведаміў журналістам у Мінску намеснік міністра па падатках і зборах Беларусі Аляксандр Дарашэнка. У тым ліку, паводле яго слоў, разглядаецца і магчымасць пераходу з 2009 года на адзіную стаўку гэтага падатку.**

■ Улады горада Турына (Італія) запрасілі каля 700 авечак для падтрымання травы ў гарадскіх парках у падстрыжаным стане. Дзякуючы дапамозе жывёл за два месяцы горад плануе зэканоміць каля 30 000 еўра. Жывёлы пасуцца на аддаленых участках, пры іх перамяшчэннях з аднаго парку ў другі паліцыя перакрывае дарогі. У 2007 годзе для гэтых жа мэтаў прыцягваліся не толькі авечкі, але і каровы. Аднак ад паслуг апошніх давялося адмовіцца, бо яны пакідалі пасля сябе занадта шмат гною.

■ **У індыйскім штаце Керала 8-гадовая дзяўчынка выпадкова павесілася, паказваючы для брата сцэну самагубства з фільма, які яна паглядзела. Дзіця замкнулася ў пакоі хаты, завязала пятлю на аконнай рашотцы і прасунула ў яе галаву. За ўсім гэтым назіраў пяцігадовы брат дзяўчынкі. Бацькоў у момант трагедыі ў хаце не было. Следства ўстанавіла, што Шрутхі ўбачыла сцэну самагубства па тэлевізары ў суседзяў.**

■ Ва ўніверсітэцкім шпіталі ў Кракаве маладая мама нарадзіла пяць дзяўчатак-блізнят. «Дзеці сапраўды адчуваюць сябе добра, улічваючы тое, што нарадзіліся заўчасна (на 27-м тыдні цяжарнасці). Вага кожнай з дзяўчатак каля 800 грамаў», — паведамілі ў шпіталі. Немаўляты змешчаныя ў інкубатар. Тата нованароджаных прызнаўся, што ў будучыні яны з жонкай спадзяюцца на з'яўленне яшчэ аднаго дзіцяці — сына. Як адзначаюць медыкі, нараджэнне пяцярых — рэдкі, унікальны выпадак, які па статыстыцы адбываецца ў адным выпадку на 52 мільёны. Нядаўна ў расійскай сям'і Артамкіных таксама нарадзіліся пяць дзяўчатак — роды праходзілі ў брытанскім Оксфардзе, паколькі ўсе радзільныя дамы Масквы адмовіліся весці гэтую шматпладовую цяжарнасць.

■ **І «Савіньён», і «Кіндзмараулі» і іншыя віды французскага і грузінскага віна ў колькасці 88 бутэлек ёмістасцю 0,75 літра прадаў гамяльчанам жыхар абласнога цэнтра і трапіў у поле зроку міліцыі. Работнікам яе давялося затым здзівіцца, калі яны агледзелі гараж гэтага беспрацоўнага 1977 года нараджэння. Там яны выявілі яшчэ 3452 бутэлькі такога ж алкагольнага напою на суму 69 040 тысяч рублёў. На падставе гэтага факта (незаконная прадпрымальніцкая дзейнасць) была ўзбуджана крымінальная справа.**

Поўны абзац

■ Трэйдар з індыйскага штата Біхар страціў усе свае зберажэнні з-за тэрмітаў, якія з'елі яго грошы ў банкаўскай ячэйцы. Са слоў Дварыкі Прасада, у верасні 2005 года ён паклаў у дзяржаўны Цэнтральны Банк Індыі 450 тысяч рупій (11 тысяч долараў) у валюце, 232 тысячы рупій (5660 долараў) каштоўнымі паперамі, а таксама залатыя і срэбныя ўпрыгажэнні. Трэйдар прызнаўся, што знаходзіўся ў канфлікце з жонкай і хацеў захаваць зберажэнні, паклаўшы іх у банкаўскі сейф. Аднак калі ён адкрыў яго ў студзені 2008 года, дык знайшоў толькі пыл і рэшткі каштоўных папер. У банку сцвярджаюць, што вывезлі папярэджанне аб тэрмітах 8 мая 2007 года і рэкамендавалі забраць каштоўныя паперы з сейфаў. Са слоў прадстаўніка банка, калі ад кліентаў сталі паступаць скаргі на мурашак, памяшканне было апрацавана інсектыцыдам. Паводле іх меркавання, кліенту няма ў чым вінаваціць банк, бо ячэйка засталася цэлай і непашкоджанай.

■ Конкурс прыгажосці гэтага года ў Англіі прыцягнуў увагу сусветнага грамадства з-за Хлоі Маршал, якая, мякка кажучы, не «праходзіць» па сучасных стандартах манекеншчыцы. Хлоя Маршал выйграла конкурс прыгажосці роднага графства Сурэй і атрымала права ў фінале змагацца за тытул самай прыгожай дзяўчыны Вялікабрытаніі. Ёй 16 гадоў, і яна носіць 16-ы памер адзення, які адпавядае расійскаму 50-му. У прынцыпе гэта сярэдні памер для брытанак, аднак, на фоне іншых удзельніц конкурсу прыгажосці Хлоя выдзяляецца вельмі моцна. Большасць яе саперніц носяць восьмы або дзесяты памеры, адпаведна 40-ы і 42-і па расійскай сістэме. Пры вазе ў 79,8 кг рост Маршал — пяць футаў дзесяць дзюймаў — каля 1 метра 75 сантыметраў. Як прызнаецца сама дзяўчына, у яе, як і ў любой жанчыны бываюць «дні абжорства». Але пры гэтым яна шмат часу аддае спорту, зусім не саромеецца сваёй фігуры і дакладна не жадае худзець. Хлоя сцвярджае, што радая дапамагчы дзяўчатам з такой жа фігурай, як у яе, павысіць самаацэнку.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Спорт-тайм

Гаспадары паўфіналу Кубка вызначаны

Федэрацыя футбола правяла жараб'ёўку, мэтай якой было выяўленне гаспадароў першых матчаў 1/2 фіналу Кубка Беларусі 2007/2008. Такім чынам, 16 красавіка ў Барысаве згуляюць чэмпіён і сталічны МТЗ-РІПА, а ў Салігорску — «Шахцёр» і сталічнае «Дынама». Паядынкі ў адказ адбудуцца 30 красавіка.

30-годдзе — на корце!

18-гадовая беларуская тэнісістка Вікторыя Азаранка 7 красавіка ўпершыню паднялася на 16-е месца ў рэйтынгу парных ігракоў. На мінулым тыдні яна дайшла да паўфіналу буйнога турніру ў Маямі (ЗША) з прызавым фондам 3,77 млн долараў. У папярэднім рэйтынгу спартсменка займала 20-ю пазіцыю. Таццяна Пучак засталася на 31-м месцы, Дар'я Кустава паднялася з 80-га на 79-е.

Беларуская тэнісістка Ганна Орлік, якой нядаўна споўнілася 15 гадоў, 7 красавіка дэбютавала на спаборніцтвах Жаночай тэніснай асацыяцыі. У Амелі-Айлэндзе (Фларыда, ЗША) у першым крузе спартсменка прайграла 23-й ракетцы свету Сібіле Бамер — 3:6, 6:7, (2:7).

У адзіночным рэйтынгу Асацыяцыі тэнісістаў-прафесіяналаў Максім Мірны застаўся на 188-м месцы, Уладзімір Валчкоў падняў-ся з 393-га на 380-е, Уладзімір Ігнацік — з 602-га на 601-е, Андрэй Каратчэня — з 637-га на 581-е. Гэты квартэт ігракоў заяўлены на матч Кубка Дэвіса супраць каманды Швейцарыі, які адбудзецца 11—13 красавіка ў Мінску. Рэйтынг швейцарскай чацвёркі выглядае наступным чынам: Станіслас Ваврынка — 30-ы, Стэфан Балі — 168-ы, Міхаэль Ламер — 258-ы, Іў Алегра — 803-і.

Швейцарцы прыбылі ў Мінск у мінулыя выхадныя. Іх настаўнік Северын Люці адзначыў, што хуткія корты на руку гаспадарам, якія любяць гуляць на звышхуткім пакрыцці, за беларусаў і падтрымка балельшчыкаў, тым не менш, нягледзячы на адсутнасць сусветнага лідара Ражэ Федэрэра, госці не збіраюцца саступаць.

Раналда — самы тоўсты футбаліст свету

Брытанская газета The Sun склала спіс дзесяці самых тоўстых футбалістаў за ўсю гісторыю. Першае месца заняў бразільскі форвард «Мілана» Раналда. Акрамя яго ў спіс увайшлі таксама Уільям Фолк, Нікі Куін, Іан Молбі, Ферэнц Пушкаш, Нэвіл Саутхол, Ніл Раддок, Эндзі Рыд, Томас Брулін і Джон Хартсан.

«Чэлсі» застаўся без Чэха

«Чэлсі» пацвердзіў, што галкіпер Пётр Чэх, які атрымаў раваныя раны падбародка і губ на трэніроўцы, перанёс аперацыю. Такім чынам, вароты «Чэлсі» ў матчы ў адказ супраць «Фенербахчэ» ў межах 1/4 фіналу Лігі чэмпіёнаў будзе абараняць Карла Кудзічыні.

Беларусы паспрачаюцца за Кубак Стэнлі

Сёлета ў НХЛ выступаюць адразу чацвёра беларускіх хакеістаў. Такога значнага «беларускага дэсанту» ў наймацнейшай хакейнай лізе планеты не было ні ў адным з папярэдніх сезонаў. Паводле вынікаў рэгулярнага чэмпіянату, абодва клубы, колеры якіх абараняюць нашы суайчыннікі, прабіліся ў лік 16 камандаў, што павядуць барацьбу за самы стары і прэстыжны трафей клубнага хакея — Кубак Стэнлі. У складзе 24-разовага ўладальніка Кубка Стэнлі «Манрэаль Канадыенс» у паход па трафей адпраўляюцца трое беларускіх форвардаў: браты Андрэй і Сяргей Касціцыны, а таксама Міхаіл Грабоўскі. Чацвёртым беларусам у сёлетнім розыгрышы Кубка Стэнлі з'яўляецца вопытны 33-гадовы абаронца «Каларада эвеланш» Руслан Салей, які праводзіць у НХЛ 11-ы сезон.

ПаWWWуцінне ад Вікторыі Захаравай

ТІВО ШУКАЕ ТУЗІН ЛЕПШЫХ...

Да 10 красавіка працягнецца прыём заявак на сушуканне Інтэрнэт-прэміі «ТІВО-2008». Конкурс на лепшы беларускі Інтэрнэт-рэсурс сёлета праходзіць у шосты раз. На ўзнагароды прэтэндуюць работы, створаныя ў Байнэце, якія вызначаюцца дасягненнямі ў галіне інфармацыі, мастацтва, культуры і адукацыі. З 2003 года ўдзел у конкурсе ўзялі ўжо больш як 2600 беларускіх Інтэрнэт-рэсурсаў, а летась, напрыклад, паступіла больш як 520 заявак.

Сёлета пераможцы вызначаюцца па 12 намінацыях: «Органы дзяржаўнага кіравання», «Адукацыя і навука», «Карпаратыўны сайт», «СМІ ў Інтэрнэце», «Гандаль, каталогі, бібліятэкі, сеткавыя рэсурсы», «Культура і мастацтва», «Спорт, турызм і забавы», «Здароўе і медыцына», «Дзеці і юнацтва», «Іншамоўны рэсурс пра Беларусь», «Інфармацыйны партал», «Відэарэсурсы ў Інтэрнэце». Акрамя таго, журы пад старшынствам першага намесніка міністра інфармацыі Ліліі Ананіч мае намер адзначыць лепшы дызайн, змест і тэхналагічнасць сярод дасланых работ, а таксама стваральнікаў праграмнага забеспячэння для стварэння сайтаў.

Да канца наступнага тыдня эксперты выставяць свае ацэнкі ў кожнай намінацыі, а журы падвядзе канчатковыя вынікі Інтэрнэт-прэміі. Узнагароджанне пераможцаў і прызёраў адбудзецца на спецыялізаванай міжнароднай выставе «ТІВО-2008» 25 красавіка на сцэне Футбольнага манежа.

...TUT.BY УЖО ЗНАЙШОЎ

4 красавіка, у Дзень Інтэрнэта, былі падведзены вынікі 6-га штогадовага конкурсу беларускіх кантэнт-праектаў, які па традыцыі ладзіць партал TUT.BY. Менавіта ён дае некамерцыйным Інтэрнэт-праектам, арыентаваным на беларускіх карыстальнікаў, магчымасць заявіць аб сабе. Тое, што ў іх гэта няблага атрымліваецца, пацвярджае рэкордная колькасць сёлетніх удзельнікаў — больш як 200 сайтаў.

«У 2000 годзе ў Беларусі было ўсяго 500—600 сайтаў, на момант, калі мы пачалі праводзіць конкурс — каля 2000, але іхняя якасць значна саступала колькасці. І развіццё праектаў Байнэта неабходна было стымуляваць, — прыгадаў старшыня конкурснага журы Юрый Зісер. — Калі пару гадоў таму давозілася судзіць «пустышкі», якія толькі адкрыліся і мелі ў лепшым выпадку 2 раздзелы дый форум, то цяпер справы ідуць усё лепш і лепш. Хоць, напрыклад, спецыялізаваных карпаратыўных праектаў яшчэ бракуе — незапоўненых ніш даволі многа».

На дадзены момант сайтаў у Байнэце каля 30 тысяч, а ў свеце — больш як 160 мільёнаў. А гэта значыць, наспела неабходнасць рыхтаваць не толькі спецыялістаў, якія будуць стваряць сайты, але і прафесіяналаў, здольных іх напаўняць — стваряць той самы кантэнт (папросту кажучы, змест, напаўненне рэсурсу). Як адзначыў намеснік дэкана журфака БДУ Аляксандр Градзюшка, даўно мінулі тыя часы, калі можна было проста перанесці тэксты з газеты ў Інтэрнэт і сказаць: «У нас ёсць сайт». Цяпер неабходна ўмець карыстацца тэхналогіямі web 2.0, мультымедыя, забяспечваць інтэрактыўную сувязь з карыстальнікамі. Вось чаму з гэтага года факультэт журналістыкі БДУ першым у СНД пачне рыхтаваць 25 чалавек web-журналістаў. Праўда, з выкладчыкамі пакуль што праблема, дый увогуле гэта справа расцягнецца як мінімум на 5 гадоў — але энтузіястаў, якія хочуць і могуць развіваць беларускі кантэнт, хапае і цяпер. Менавіта ім дасталіся ўзнагароды 6-га конкурсу кантэнт-праектаў у 12 намінацыях.

Так, лепшым у намінацыі «Мая Беларусь» стаў праект «Мінск стары і новы» http://www.minsk-old-new.com (ён жа, да слова, атрымаў гран-пры — што прынесла аўтару доступ у Інтэрнэт на 1000 у.а.). У намінацыі «Культура» ўсе тры прызавыя месцы занялі чамусьці... сайты пра дызайн, а прызы ў катэгорыі «Адпачынак і забавы» размеркаваліся паміж сайтамі пра сталічныя сауны, японскую гульню сёгі ў Беларусі і аглядальнікам «Усе санаторыі Беларусі». Журы асобна адзначыла высокі ўзровень работ у катэгорыі «Адукацыя», а таксама актыўнасць рэгіёнаў — у прыватнасці, некалькі ўзнагарод узялі рэсурсы з «прапіскай» у Гродне. Была ўручана таксама спецыяльная прэмія імя Уладзіміра Каткоўскага — за напаўненне Байнэту беларускамоўнай інфармацыяй пра нашу сучаснасць і спадчыну. Гэты прыз заснавалі бацькі беларускамоўнага блогера і распрацоўшчыка сайтаў, каб ушанаваць памяць сына, які летась заўчасна пайшоў з жыцця. Узнагароду імя Каткоўскага атрымаў гродзенскі маладзёжны праект «Твой стыль».

Сведения о годовом балансе, прибыли и убытках за 2007 г. по ОАО «ЗНАМЯ ИНДУСТРИАЛИЗАЦИИ»

млн руб.

АКТИВ	Код строкі	На начало года	На конец отчетного периода
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ:			
Основные средства	110	12 183	13 572
Нематериальные активы	120	1	1
Доходные вложения в материальные ценности	130		
Вложения во внеоборотные активы	140	4 436	5 016
ИТОГО по разделу I	190	16 620	18 589
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	6 102	6 684
Налоги по приобретенным активам	220	598	493
Дебиторская задолженность	230	484	439
Денежные средства	250	20	21
ИТОГО по разделу II	290	7 206	7 639
БАЛАНС	300	23 826	26 228
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	5 163	5 283
Резервный фонд	420	10	10
Добавочный фонд	430	12 386	14 582
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	450	9	48
ИТОГО по разделу III	490	17 575	19 923
IV. ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	520	2 134	2 730
Кредиторская задолженность	530	4 117	3 574
Задолженность перед учредителями	540		1
ИТОГО по разделу IV	590	6 251	6 305
БАЛАНС	600	23 826	26 228

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

за 2007 г.

Наименование показателей	Код строки	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
1. Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	10 879	8 731
2. Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	854	708
3. Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку)	020	10 025	8 023
4. Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	9 698	7 742
5. Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-040-050)	060	266	218
6. Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов (080-090+/-100+/-110)	120	-45	-39
7. Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (140-150)	160	78	37
8. Налоги, сборы и платежи из прибыли	210	251	207
9. Чистая прибыль (убыток) (200-210-220)	240	48	9

ИНФОРМАЦИЯ ПО СОСТОЯНИЮ

на 01.01.2008 г.

Показатель	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Количество акционеров, всего	лиц	3 091	3 091
в том числе: юридических лиц	лиц	2	2
в том числе: физических лиц	лиц	3 089	3 089
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	миллионов рублей	20,2	10,00
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	рублей	34,5	17,00
Обеспеченность акции имуществом Общества	тысяч рублей	33	24
Количество простых акций, находящихся на балансе Общества	штук		
Просроченная дебиторская задолженность	миллионов рублей	195	137,00
Просроченная кредиторская задолженность	миллионов рублей	436	660,00
Среднесписочная численность работающих	человек	985	1034

УНП 300200360

Наблюдательный совет
Дирекция

Фонд «Минскоблгосимущество»

«14» мая 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, проводит аукцион

по продаже единого предмета аукциона — капитальных строений, находящихся в республиканской собственности, и права заключения договора аренды земельного участка

Сведения о капитальных строениях и их местонахождении, год постройки, основные характеристики капитальных строений	Сведения о продавце недвижимого имущества и арендодателе земельного участка	Условия использования земельного участка	Площадь земельного участка, отведенного для обслуживания капитальных строений, га	Срок аренды земельного участка, лет	Начальная цена продажи единого предмета аукциона, руб.	Сумма задатка единого предмета аукциона, руб.
ЛОТ № 1: Столовая (инв. № 600/С-60154), 1960 года постройки, общей площадью 324,4 кв.м. Фундамент блочный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия деревянные, крыша кровельная сталь, полы – плитка. Имеется инженерное оборудование: электроснабжение, водопровод, канализация; **Здание спального корпуса № 2** (инв. № 600/С-60158), 1960 года постройки, общей площадью 477,4 кв.м. Фундамент блочный, стены бревенчатые, перегородки и полы дощатые, крыша кровельная сталь. Имеется инженерное оборудование: электроснабжение, водопровод, канализация; **Здание спального корпуса № 3** (инв. № 600/С-60160), 1960 года постройки, общей площадью 309,5 кв.м. Фундамент блочный, стены кирпичные, перегородки дощатые, перекрытия деревянные, крыша шиферная. Имеется электроснабжение; **Здание административное № 4** (инв. № 600/С-60162), 1960 года постройки, общей площадью 136,3 кв.м. Фундамент кирпичный, стены бревенчатые, крыша шиферная. Имеется электроснабжение и водопровод; **Домик сборно-разборный** (инв. № 600/С-60163), 1985 года постройки, общей площадью 77,2 кв.м. Фундамент блочный, стены щитовые, крыша шиферная, перегородки и полы дощатые. Имеется электроснабжение; **Здание — хозпостройка** (инв. № 600/С-60164), 1960 года постройки, общей площадью 56,3 кв.м. Фундамент деревянные столбы, стены и перегородки дощатые, крыша шиферная; **Здание туалетов** (инв. № 600/С-60157), 1955 года постройки, общей площадью 14,7 кв.м. Фундамент, стены и перегородки кирпичные, крыша шиферная, полы бетонные. Имеются электроснабжение, водопровод и канализация; **Здание котельной (склад)** (инв. № 600/С-60155), 1952 года постройки, общей площадью 115,0 кв.м. Фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, крыша шиферная, полы дощатые, плитка. Имеется инженерное оборудование: электроснабжение, водопровод, канализация; **Водокачка (водонапорная башня)** (инв. № 600/С-93135), 1952 года постройки, общей площадью 10,8 кв.м. Фундамент, стены кирпичные, крыша шиферная, перекрытия деревянные; а также арка деревянная, забор с металлической сеткой, забор деревянный, две беседки, трансформаторная подстанция, сад фруктовый. Капитальные строения расположены в дер. Аннополь Минского района Минской области.	**Продавец:** учреждение образования «Международный государственный экологический университет имени А.Д. Сахарова», тел. 299-51-37, 299-51-36 **Арендодатель:** Минский районный исполнительный комитет	Для размещения объекта оздоровительного назначения	2,7491	51	596 121 068	50 000 000
ЛОТ № 2: Здание котельной (инв. № 621/С-1387), 1985 года постройки, общей площадью 131,6 кв.м. Фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, крыша совмещенная, перекрытия железобетонные. Инженерное оборудование отсутствует. Капитальное строение расположено по ул. 1 Мая, в г. Несвиже Минской области.	**Продавец:** республиканское унитарное предприятие «Несвижский завод медицинских препаратов», тел: 8 (01770) 557 02 **Арендодатель:** Несвижский районный исполнительный комитет	Для размещения магазина	0,0490	51	27 712 122	2 700 000

К участию в аукционных торгах допускаются: юридические лица, индивидуальные предприниматели, граждане Республики Беларусь и иностранные граждане, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, представителем иностранного юридического лица дополнительно представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

гражданином Республики Беларусь и иностранным гражданином — паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, представителем гражданина Республики Беларусь и иностранного гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН:

1. возместить затраты по подготовке и проведению аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка;

2. внести плату, взимаемую за право заключения договора аренды;

3. заключить договор купли-продажи недвижимого имущества и договор аренды земельного участка в течение 2-х раб

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

9 красавіка 2008 г. № 14 (117)

ПАДУМАЦЬ І ПРАГАЛАСАВАЦЬ,

АЛЬБО РАЗВАЖАННІ ПАСЛЯ СЕСІІ

Напрыканцы сакавіка прайшла сесія Ляхавіцкага раённага Савета дэпутатаў. Са справаздачай аб рабоце райсавета за мінулы год выступіў яго старшыня Яўген ЮРЛЕВІЧ.

У дакладзе гаварылася пра стан спраў на тэрыторыі раёна, пра дзейнасць прэзідыума Савета. Усё ішло даволі гладка. Пытанняў да старшыні не было. А затым пачалі выступаць дэпутаты райсавета.

Цікавую ідэю прапанаваў дэпутат Вячаслаў Сельмановіч. На яго думку, неабходна стварыць фонд падтрымкі дэпутатаў. Наяўнасць такога фонду дасць магчымасць пры неабходнасці таму ж сельсавету карыстацца невялікімі сумамі грошай. Напрыклад, калі спатрэбіцца купіць фарбу, то адпадзе неабходнасць хадзіць па розных інстанцыях і выпрошваць дапамогу — можна атрымаць яе ў фондзе.

Уладзімір Буткевіч таксама падтрымаў ідэю Вячаслава Сельмановіча — яму як старшыні сельскага Савета асабліва добра знаёмыя фінансавыя праблемы, з якімі даводзіцца сутыкацца пастаянна.

Але адкуль возьмуцца грошы ў такім фондзе? Дэпутат Сельмановіч думае, што пэўныя сумы маглі б пералічваць у фонд прадпрыемствы і арганізацыі раёна. А кіраўнік райсавета мяркуе, што грошы для фонду павінны быць закладзены ў бюджэце раёна.

Праўда, у райфінаддзеле лічаць, што для стварэння Фонду падтрымкі дэпутатаў няма юрыдычнай падставы, таму на гэта ніхто не пойдзе. Маўляў, у Лунінцы такі фонд быў створаны, а ў выніку ўзнікла шмат праблем. Пачаліся праверкі, прэтэнзіі з боку кантралюючых структур.

З іншага боку, хіба не ганьба, калі ў такой структуры ўлады, як сельсавет, часам няма грошай нават на пахавальны вянок?

Па некаторых іншых пытаннях таксама разгарэліся спрэчкі.

Некалі перад уездам у Ляхавічы стаяла царква, але сёння на яе месцы размясціўся рынак, а новую царкву ўзвялі пры могілках. На месцы ж былой царквы вырашылі паставіць памятны знак-капліцу вышынёй у 11 метраў. На будоўлю патрэбна 100 мільёнаў рублёў. Такіх грошай людзі, зразумела, не збяруць, значыць, пэўную суму неабходна выдзеліць з бюджэту. Начальнік будаўнічай арганізацыі папрасіў 40 млн рублёў — у гэтым выпадку прыедзе брыгада будаўнікоў з Украіны і за некалькі месяцаў узвядуць тую капліцу.

Але ёсць пытанне. Ці будзе той знак, які павінен сустракаць кожнага на ўездзе ў райцэнтр, з'яўляцца творам мастацтва? Знак за пяцьдзесят тысяч долараў — гэта ўжо не знак, а нешта большае. А значыць, ён павінен прайсці мастацкую экспертызу. І ўвогуле — хто плаціць грошы, той і музыку заказвае...

А найбольшыя спрэчкі разгарэліся, калі на трыбуну падняўся чарговы дэпутат і, спасылаючыся на пастанову Савета Міністраў, прапанаваў змяніць назвы шэрагу вёсак у раёне. У зачытаным спісе вёска Дарава ператваралася ў аграгарадок Дараўскі, Русінавічы ў аграгарадок Русінавіцкі, Жарабковіч — у Жарабковіцкі.

Дэпутаты ўжо гатовы былі падняць рукі і, калі б не дэпутат Віталь Бусько, то прагаласавалі б.

— Дык што, вёска Жарабковічы, якой паўтысячы гадоў, якая мае багатую гісторыю і традыцыі, павінна знікнуць? — абурыўся Віталь Іванавіч. — А хто нам на гэта даў права?!

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ГАСПАДАРКА АСАБІСТАЯ — А КАРЫСЦЬ АГУЛЬНАЯ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Напрыканцы сакавіка прайшло пасяджэнне прэзідыума Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў, на якім разглядалася рэалізацыя Закона «Аб асабістых падсобных гаспадарках грамадзян». У абмеркаванні гэтай надзвычай актуальнай тэмы ўдзельнічалі і кіраўнікі малочных прадпрыемстваў Прыдзвінскага краю. Ішла шчырая размова. Не ўтойваліся праблемы. Вельмі паказальнымі былі наступныя лічбы. У Віцебскай вобласці летась насельніцтва паставіла дзяржаве 93 працэнты ад агульнага аб'ёму бульбы, 13 працэнтаў — збожжавых, 89 працэнтаў — агародніны, каля 16 працэнтаў ад усяго аб'ёму малака...

Старшыня абласнога Савета Аляксандр АЦЯСАЎ адзначыў, што прыватныя гаспадаркі і вяскоўцаў неабходна падтрымліваць усімі магчымымі спосабамі.

— Яны пастаўляюць сыравіну на прадпрыемствы. Адпаведна, папаўняюць падаткамі бюджэт. І, зразумела, самі маюць дадатковы даход, — расказаў Аляксандр Ягоравіч. — Дзеля развіцця асабістых падсобных гаспадарак было шмат чаго прадугледжана як у найважнейшай праграме адраджэння вёскі, так і ў прынятых указах Прэзідэнта, пастановах Савета Міністраў, рашэннях аблвыканкама, абласнога Савета дэпутатаў. На жаль, памяншаецца колькасць прыватных гаспадарак, у тым ліку і жывёлы. Я прааналізаваў адпаведныя даныя, пачынаючы з 1991 года. Тады ў рэгіёне ў насельніцтва было 112,7 тысячы кароў. Пік назіраўся ў 1996 годзе — 129 тысяч кароў. Цяпер на асабістых падворках іх засталося 44,4 тысячы. Разам з тым закуп малака ў разліку на 1 карову штогод павялічваецца. У тым жа 1996 годзе ён складаў амаль 717 літраў, а ў 2007 годзе — ужо 1755. Але ўзнікае рэзоннае пытанне: ці на самай справе робіцца ўсё магчымае для падтрымкі прыватных гаспадарак?

Тэндэнцыя да змяншэння

Першы намеснік старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Віцебскага аблвыканкама — начальнік упраўлення жывёлагадоўлі Віктар СЛАВЕЦКІ зрабіў падрабязны аналіз рэалізацыі вышэйназванага закона ў Віцебскай вобласці. І, у прыватнасці, канстатаваў, што летась сельгаспрадукцыя насельніцтва з асабістых падсобных гаспадарак займала 44 працэнты ў агульным валавым аб'ёме.

— Трэба ўважліва ўдумацца ў гэтую лічбу. Зразумела, само сабой адпадае пытанне, ці трэба падтрымліваць развіццё прыватных гаспадарак, — адзначыў ён. — Калі не займацца прыватным сектарам, фактычна паказчыкі пастаўкі прадукцыі вобласцю мы не зможам выканаць. Пытанне падтрымкі прыватных гаспадарак — галоўны прыярытэт для мясцовых органаў улады і кіраўнікоў малаказаводаў. Але ж не можа не хваляваць наступная статыстыка. Спецыялісты падлічылі, што ў 2007-м колькасць прыватных гаспадарак паменшылася на 2 працэнты, на 15 працэнтаў стала меней буйной рагатай жывёлы. 57 працэнтаў прыватных гаспадарак не трымаюць жывёлу наогул і толькі 23 працэнты трымаюць кароў.

Дадатковы заробак

Віктар ШУЛЯК, першы намеснік старшыні аблспажыўсаюза, адзначыў, што ў насельніцтва купляецца 98 працэнтаў садавіны і 100 працэнтаў мёду. Сёлета праведзена даследаванне сядзіб, заключаны дагаворы на вырошчванне часнаку, цыбулі. Спажывецкі саюз гарантуе своечасовы разлік на ўзроўні дзяржаўных і дагаворных цэнаў — летась выплацілі насельніцтву 24,9 мільярда рублёў, у сярэднім кожнаму грамадзяніну — 90 тысяч. А ў Пастаўскім раёне 250 тысяч, Глыбоцкім — пад 170 тысяч на аднаго жыхара. Сёлета болей за 91 тысячу дагавораў заключана з грамадзянамі на здачу сельгаспрадукцыі...

Генеральны дырэктар Віцебскага канцэрна «Мясамалочныя прадукты» Яўген Імхавік адзначыў, што райсаветам, выканкамам і вытворцам трэба актыўна весці закуп малака і мяса з прыватных гаспадарак. У якасці прыкладу ён прывёў Пастаўскі раён, дзе мясцовы малаказавод сам напрамую займаецца закупам.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ТЕМА ДНЯ

ОСТРЫЕ ВОПРОСЫ ЗА «КРУГЛЫМ СТОЛОМ»

— Главная задача, которую сегодня должны ставить перед собой органы местного управления и самоуправления первичного уровня — это улучшение качества жизни людей, — заявил в ходе очередной встречи с председателями сельских и поселковых Советов депутатов председатель Постоянной комиссии Совета Республики по региональной политике и местному самоуправлению Анатолий МАЛОФЕЕВ.

Мероприятие, организованное в рамках Совета по взаимодействию органов местного самоуправления, проходило в Институте высших управленческих кадров Академии управления при Президенте Республики Беларусь в ставшем уже традиционным формате «круглого стола». Это значит, что все участники, независимо от рангов и должностей, могли вести с аудиторией открытый, откровенный диалог, не только передавая положительный опыт, но и обнажая болевые точки.

Основной темой для обсуждения стали вопросы, связанные с реализацией на местах Указа Президента № 21 «О повышении роли органов местного управления и самоуправления в решении вопросов жизнеобеспечения населения», поскольку именно этот документ является определяющим и направляющим в работе Советов первичного уровня.

— Сегодня мы находимся на первом этапе его реализации. Нам нужно создавать систему в работе органов первичного звена власти, а ее пока нет, — считает Анатолий Малофеев. — То есть, в некоторых Советах она имеет место, но в целом о создании системы говорить еще рано.

Изучая вопросы взаимодействия органов местного самоуправления с исполнительной властью, Анатолий Александрович побывал во многих регионах республики. Подвижки там, подчеркнул он, конечно же, есть, и подвижки серьезные. Радует внешний вид многих сельсоветов, чистота и порядок на улицах, уровень компьютеризации первичных органов власти, состояние административных зданий. За всем этим стоит забота государства, его внимание к проблемам низового звена.

— Но многое по-прежнему зависит от вас, — сказал, обращаясь к аудитории, Анатолий Малофеев. — Вот, например, были мы в Речицком районе Гомельской области. Заехали в Борсуковский сельский Совет, поговорили с председателем — у нее все четко поставлено, все отработано, она все знает, готова ответить на любой вопрос. И на территории всюду порядок, и в административном здании чисто, аккуратно, занавески красивые висят... Поехали в другой сельский Совет. По ступенькам поднимаемся и первое, что видим — отвалившуюся плитку... Казалось бы, мелочь. Но из таких «мелочей» складывается лицо власти и, как следствие, отношение к ней. Все ведь от человека зависит. И если председателю сельского Совета сегодня «все равно», так оно и всегда будет «все равно». А возможно, с ним просто никто не поработал, не объяснил простую истину: если ты сам чего-то стоишь, то и отношение к тебе будет соответствующее.

Очень непростой для первичного уровня власти вопрос формирования и наполняемости бюджета стал «камнем преткновения» и для участников «круглого стола». Каждая область решает проблемы финансового обеспечения территорий по-своему, изыскивает дополнительные резервы и возможности. Но проблемы здесь есть, и проблемы серьезные.

— Все знают, что такое Чернобыльская зона. В этих районах масса проблем. А на благоустройство сельсовету выделяется всего 1,5—2 миллиона рублей на год. Что это за сумма? Такое отношение надо в корне менять! — считает Анатолий Малофеев. — Ведь налоговой базы мы там не создадим — по крайней мере, в ближайшее время. Значит, речь сегодня нужно вести об увеличении объема дотаций этим районам. Там же все системы коммуникаций старые, прокладывались они на скорую руку, документов на них нет, брать их на свой баланс никто не хочет... Двадцать лет прошло, а мы все сидим и ждем, пока «грянет гром». А вопрос, в принципе, решаемый — необходима минимальная сумма для выполнения эскизной документации. Ведь сегодня никто не ревизирует эти сети, никто не знает даже, где они лежат, профилактического ремонта не делается! Чего мы ждем? И почему обязательно нужны пожары и катастрофы, чтобы подняться и начать что-то делать? Поэтому — я обращаюсь сейчас к председателям сельских Советов пострадавших районов — не сидите и не ждите, не будьте аморфными. Вы — власть. Собирайте сессию, ставьте эти вопросы, выходите на другие уровни. А то мы только в кулуарах можем возмущаться... Но в кулуарах не принимают решений. А здесь нужны конкретные действия.

Принципиальная оценка работы областных исполнительных комитетов по выполнению поручений главы государства о повышении роли органов местного управления и самоуправления первичного уровня в решении вопросов жизнеобеспечения была дана в конце прошлого года Администрацией Президента. По словам Анатолия Малофеева, республиканским органам госуправления, исполнительным и распорядительным органам (от облисполкомов и далее), Советам депутатов было предложено рассмотреть на местах, как идет реализация Указа Президента от 12 января 2007 года № 21, и принять меры.

— Формализм в этом деле недопустим, — подчеркнул Анатолий Малофеев. — Никакой отчетности для «галочки» быть не должно. Оцените ситуацию реально: кто и что на вашей территории сделал или не сделал. Потому что контроль будет строжайший.

Тему финансового обеспечения бюджетов первичного уровня власти продолжила начальник отдела региональных бюджетов главного управления бюджетной политики Министерства финансов **Зоя КРУГЛИКОВА**. Как финансист она высказала озабоченность тем, что уровень дотационности большинства бюджетов первичного звена по-прежнему остается высоким. В связи с этим не исключено, что уже в ближайшее время в Указ № 21 будут внесены некоторые изменения, касающиеся источников пополнения бюджетов сельских и поселковых Советов. В частности, уже сегодня прорабатывается вопрос о зачислении в бюджеты Советов первичного уровня части прибыли вновь созданных на их территории предприятий. Кроме этого, Совету первичного уровня может быть оказана безвозмездная спонсорская помощь как юридическим, так и физическим лицом. Этого источника доходов в бюджетах сельисполкомов пока нет, но предложение будет рассмотрено в ближайшее время.

Большинство финансистов сегодня выступают и за то, чтобы вернуть на первичный уровень подоходный налог с физических лиц — соответствующее предложение после его рассмотрения в установленном порядке будет передано в Совмин.

— Но многие вопросы, касающиеся улучшения жизнеобеспечения населения, можно решать и на местах, самостоятельно, — считает Зоя Кругликова. — Например, некоторые сельхозпредприятия по договоренности с сельским Советом уже ввели у себя дополнительную ставку рабочего по благоустройству территории, и таким образом решили ряд вопросов.

Одно из направлений, по которому в 2008 году предполагается выделять дополнительные ассигнования — снос ветхих домов. Не будет обижена и система ЖКХ — предполагается направить в области денежные средства на приобретение специальной коммунальной техники, предназначенной для благоустройства территорий.

(Окончание на 2-й стр. «МС».)

КУПІЎ БЫ ХУТАР, АЛЕ...

Ці можна папоўніць бюджэт экатурызмам на Ганцаўшчыне?

Ганцавіцкі раён, што на Брэстчыне, амаль не мае значных прамысловых прадпрыемстваў. Таму бюджэт яго невялікі. А каб яго крыху павялічыць, трэба шукаць крыніцы папаўнення. З іншага боку, на Ганцаўшчыне без цяжкасцяў можна знайсці мясціны, дзе прырода захавалася амаль што ў спрадвечным, некранутым стане.

Узяць хоць бы Падвялікі Мох — унікальны лесабалотны комплекс з рэдкімі раслінамі і жывёламі. Толькі тут можна сустрэць вярбу чарнічную ці пуханоса альпійскага. А з жывёл — чорнага бусла, змеяеда, шэрага жураўля, балотную чарапаху і нават вельмі рэдкую, не толькі ў нашых мясцінах, арэшнікаву соню. Некранутыя балоты і дзюны ўнікальныя і самабытныя не толькі ў раёне, рэспубліцы, але і ў Еўропе ў цэлым.

Вось гэтую непаўторную жамчужыну ў 2005 годзе пераўтварылі ў гідралагічны заказнік «Падвялікі Мох».

Папулярныя сярод рыбаловаў і адпачываючых азёры, поўныя прыгажосці (і рыбы таксама) — Горнае, Люсінскае, Шчыльнае, Дубоўскае...

Мой суразмоўца, выканаўчы дырэктар Ганцавіцкага раённага арганізацыйнага структурнага падраздзялення Рэспубліканскага дзяржаўнага грамадскага аб'яднання паляўнічых і рыбаловаў Генадзь СІДАРЭНКА ***(на фота)*** можа гадзінамі распавядаць аб прыгажосці і непаўторнасці родных мясцін. Сам Генадзь Анатольевіч — паляўнічы бывалы, з захапленнем расказвае пра звычкі і павадкі ласёў, дзікоў, касуль ды іншых звяроў і птушак, якіх пакуль хапае ў ганцавіцкіх лясах.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

РАЗБОР ПАЛЁТАЎ

РАБОТА ЁСЦЬ. НЯМА СІСТЭМЫ

Цёплая зіма і ранняя вясна стварылі спрыяльныя ўмовы для актывізацыі работ па навядзенні парадку на зямлі і добраўпарадкаванні населеных пунктаў. Аналіз таго, што ўжо зроблена ў гэтым накірунку за першы квартал года, а таксама вызначэнне планаў на красавік, які аб'яўлены ў сталічнай вобласці месяцам навядзення парадку, сталі асноўнымі тэмамі чарговай сесіі Мінскага абласнога Савета дэпутатаў. У яе рабоце ўдзельнічалі старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Леанід Крупец, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, кіраўнікі абласных профільных камітэтаў і арганізацый, старшыні раённых Саветаў.

Падводзячы вынікі работы за першыя тры месяцы 2008 года, старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Святлана Герасімовіч адзначыла, што зроблена ўжо нямала. Адбыліся два абласныя суботнікі, падчас якіх прыводзіліся ў парадак могілкі, аднаўляліся агароджы, прыбіраліся дарогі і вуліцы населеных пунктаў. Было спілавана каля тысячы аварыйных дрэў. Тым не менш, падкрэсліла старшыня аблсавета, работа магла быць больш выніковай. У прыватнасці, невысокай пакуль застаецца актыўнасць мясцовага насельніцтва: далёка не ўсе ўзялі ўдзел у суботніках і навялі парадак на сваіх прыдамавых тэрыторыях. А гэта паказчык работы дэпутатаў і старшынь Саветаў як пярвічнага, так і базавага ўзроўню.

— Я маю на ўвазе не толькі асабісты прыклад, — патлумачыла Святлана Міхайлаўна, — але і здольнасць арганізаваць адпаведную работу ў сваёй выбарчай акрузе. У аддаленых вёсках у нас яшчэ застаецца шмат старых пустых дамоў, якія псуюць знешні выгляд населенага пункта і ствараюць пажаранебяспечную сітуацыю. Трапляюцца агароджы, якія трэба ці адрамантаваць, ці замяніць на новыя. Многа работы на могілках. Вось тут і павінна праявіцца арганізатарская роля дэпутата! Асабліва гэта тычыцца тых, хто працуе не першае скліканне. Вакол кожнага павінен быць сфарміраваны свой актыў — людзі, якія падтрымліваюць дэпутата, падзяляюць яго пазіцыю, з'яўляюцца ініцыятарамі ўсіх добрых спраў. Няма такой групы — значыць, і вынікі не вельмі бачныя; створаны актыў — значыць, і спрацавалі лепш. Многае зроблена ў гэтым плане ў Старадарожскім, Капыльскім, Любанскім раёнах. Аднак ёсць і такія Саветы, дзе старшыня знаходзіцца на сваёй пасадзе і два, і тры скліканні, а вырашыць пытанне фарміравання актыву так і не здолеў. Значыць, ён не выканаў сваю галоўную задачу! Тут у мяне ёсць заўвагі па Калодзішчах, па Рудзенску.

Красавік, аб'яўлены ў вобласці месяцам навядзення парадку на зямлі, павінен стаць самым выніковым у гэтай рабоце, падсумавала Герасімовіч. З абласнога бюджэту ўжо выдаткаваны сродкі на знос старых пустых дамоў, на рамонт адміністрацыйных будынкаў сельвыканкамаў. Да майскіх святаў вобласць павінна стаць чыстай і добраўпарадкаванай. І тут навідавоку будзе работа кожнага дэпутата, кожнага старшыні сельскага і раённага Саветаў. Час дыктуе новыя патрабаванні. Тое, што ўчора было выдатным, сёння з'яўляецца недастатковым. Новыя задачы патрабуюць новых метадаў іх вырашэння. Ранейшыя падыходы састарэлі, адзначыла Герасімовіч.

Дзе канчаецца зона адказнасці?

Самая «відавочная» праблема добраўпарадкавання, характэрная не толькі для сталічнай вобласці, — бытавое смецце. І яго збор, вывяз і ўтылізацыя павінны быць рэгулярнымі, сістэмнымі і праводзіцца ў цесным узаемадзеянні ўсіх адпаведных службаў, падкрэсліў у сваім выступленні старшыня Мінскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Уладзімір Закаблукаў. Гаворачы аб выніках работы за першы квартал 2008 года, ён паведаміў, што службы ЖКГ заключылі з сельвыканкамамі вобласці 155 дагавораў на вывяз цвёрдых бытавых адходаў, яшчэ 192 — з садаводчымі таварыствамі. Добраўпарадкаваны 730 могілак, 663 мемарыяльныя аб'екты, 211 міні-палігонаў і 121 пляцоўка часовага складзіравання цвёрдых бытавых адходаў (ЦБА), ліквідаваны 790 несанкцыянаваных звалак.

Тым не менш, праблем яшчэ хапае. Шмат нараканняў выклікае дзейнасць землекарыстальнікаў і ўладальнікаў участкаў. Многіх выяўленых парушэнняў прыродаахоўнага заканадаўства можна было б пазбегнуць, калі б больш актыўна працавалі мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, спецыялізаваныя службы. Комплексныя праверкі паказалі, што на многіх ускраінных вуліцах сельскіх населеных пунктаў у нездавальняючым стане знаходзіцца асфальта-бетоннае пакрыццё, тратуары, агароджы. Жыхары ў месцах агульнага карыстання складзіруюць будматэрыялы, металалом, бытавое смецце. Шмат нараканняў у гэтым плане выклікае Барысаўскі, Мінскі, Дзяржынскі, Смалявіцкі, Пухавіцкі, Слуцкі, Уздзенскі, Крупскі раёны.

Асобая тэма — стан палос адводу шашэйных і чыгуначных дарог, месцаў вакол пунктаў прыдарожнага сэрвісу. Работнікі камітэта сістэматычна выяўляюць факты забруджвання бытавым смеццем і несанкцыянаваныя звалкі на прыдарожнай паласе ўздоўж трасы Мінск — Віцебск. У Мядзельскім і Любанскім раёнах засмечаны зоны масавага адпачынку, у Вілейскім — не заўсёды своечасова праводзіцца ачыстка кантэйнераў у пунктах прыдарожнага сэрвісу. У Нясвіжскім і Капыльскім выяўлены несанкцыянаваныя звалкі ў мясцовых кар'ерах.

Уладзімір Закаблукаў адзначыў, што часам дарожныя службы і сельгаспрадпрыемствы, землі якіх прылягаюць да аўтадарог, не могуць вызначыцца, дзе чыя зона адказнасці. І пакуль яны спрачаюцца, прыдарожныя палосы «зарастаюць» смеццем.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ГАСПАДАРКА АСАБІСТАЯ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

І гэты вопыт будзе вывучацца і распаўсюджвацца ў іншых рэгіёнах. Яўген Імхавік прызнаў, што сістэма захворвання малаказборшчыкаў і малаказдатчыкаў патрабуе ўдасканалення — адпаведнае даручэнне было атрымана ад старшыні аблсавета. Тэрмін выпрацоўкі падыходаў — да 1 мая.

Начальнік упраўлення развіцця прадпрымальніцтва і спажывецкага рынку Віцебскага аблвыканкама Валянцін Цвяткоў падкрэслівае, што закуп малака, іншай сельскагаспадарчай прадукцыі — у чыстым выглядзе вясковае прадпрымальніцтва, пра якое мы на ўсіх узроўнях гаворым, для развіцця якога шукаем падыходы. «З боку нашага ўпраўлення мы гарантуем поўную практычную падтрымку ў гэтым пытанні», — адзначыў ён.

Калі не будзем займацца прыватным сектарам, не зможам выканаць пастаўкі сельгаспрадукцыі

Участкі — на «агульнае поле»

Намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Іосіф Палачанін падкрэсліў, што падтрымка прыватных гаспадарак — дзяржаўная задача: «А калі ўзнікаюць пытанні, трэба іх вырашаць. Тэлефануйце мне напрамую, знойдзем спосабы зняць канкрэтныя праблемы».

Намеснік губернатара звярнуў увагу на недастатковую работу аблспажыўсаюза па закупе мяса ў насельніцтва: «У некаторых раёнах гэта работа вядзецца крайне слаба. Што датычыцца закупу мяса ў грамадзян, існуе такая практыка: заехалі на ферму, купілі жывёлу. А трэба ехаць да людзей, якія яе трымаюць! — заклікаў ён. — Асобныя раёны слаба працуюць па закупе маладняку буйной рагатай жывёлы ў насельніцтва. Многія нават не засвойваюць выдзеленыя дзяржавай на гэтыя мэты грошы». Іосіф Палачанін закрануў пытанне аб неабходнасці ўвядзення ўчасткаў, што апрацоўвае насельніцтва, у агульны севазварот — вынясенні іх «на адно агульнае поле»: «У выніку не трэба будзе ганяць па прыватных агародах сучасную магутную сельгастэхніку. І своечасова тэхналогія апрацоўкі зямлі будзе выконвацца, і ўраджайнасць павысіцца».

Не толькі лозунгі

Пасля пасяджэння прэзідыума я звярнуўся па каментарый да старшыні Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Аляксандра Ацясава.

— Неабходна прызнаць, што толькі адміністрацыйнымі мерамі вырашыць усе праблемы закупу сельгаспрадукцыі ў насельніцтва (а яе з кожным годам прыбаўляецца) ужо немагчыма. Прайшоў той час, калі закуп таго ж малака вымяраўся колькасцю пасяджэнняў у вобласці і раёнах, «навучаннем» тых жа старшынь сельвыканкамаў. Часта даводзіцца чуць наступнае: маўляў, мы ўсе на ўсіх узроўнях займаемся закупам. Але што канкрэтна робіцца, акрамя агучвання прыгожых лозунгаў, незразумела.

Павінна працаваць эканоміка, новыя прагрэсіўныя формы. Пры падрыхтоўцы да пасяджэння прэзідыума абласнога Савета дэпутатаў на працягу 2 месяцаў мы разам з аблсельгасхарчам, абласнымі падатковай і фінансавай службамі, аблмясамалпрамам і спажыўкааперацыяй з удзелам рэгіёнаў і прадпрымальнікаў вырашалі гэтыя праблемы. Што зроблена ў нашай вобласці?

Па-першае, цану за збор 1 тоны малака — 70 тысяч рублёў — мы палічылі крайне недастатковай, больш за тое стратнай, што ў сваю чаргу дрэнна ўплывала на зарплату малаказборшчыкаў (яна была крайне нізкай). З сакавіка гэтага года па вобласці зацверджана новая цана — 110 тысяч рублёў.

Па-другое, і гэта датычыцца ў першую чаргу камунальных унітарных прадпрыемстваў, прыватных унітарных прадпрыемстваў, індывідуальных прадпрымальнікаў, звенняў пры сельвыканкамах — падаткі па віду дзейнасці (нарыхтоўка малака ад насельніцтва) налічваліся і на грошы, якія яны атрымлівалі для разлікаў з насельніцтвам. Такі падыход абсалютна няправільны (гэта ж «транзітныя» грошы), і ён пагаршае фінансавы стан суб'ектаў гаспадарання. Асноўная прычына праблемы — у самім дагаворы (куплі-продажу) двух бакоў, удзельнікаў гэтай дзейнасці. У сакавіку абласным аб'яднаннем мясамалпрам з удзелам фінансавых і падатковых органаў распрацавана і даведзена да малакапрадпрыемстваў, раёнаў новая форма «Дагавор даручэння». Ён дазваляе суб'ектам гаспадарання перайсці на спрошчаную сістэму падаткаабкладання і выключае са сферы падаткаабкладання грошы насельніцтва за закупленае малако.

Па-трэцяе, зноў жа да размовы аб адміністраванні. Дэталёвае вывучэнне пытання закупу малака ў насельніцтва паказвае, што там, дзе гэтым занялася прадпрымальнікі, рэзка ўзрасла колькасць закупленага малака, значна павысілася яго якасць. А галоўныя малаказдатчыкі задаволены іх работай. Прадпрымальнікі і мяшок камбікорму прывязуць, і нешта ў рамонт адвязуць. А ў выпадку «форс-мажору» і грошы «ў крэдыт» могуць даць, бо ведаюць, што малаказдатчыкі абавязкова адпрацуюць. Вось, напрыклад, Лёзненскі раён. Ад агульнага аб'ёму закупленага там малака — 80 працэнтаў на «рахунку» прадпрымальнікаў. Раён выйшаў у лік лідараў па закупе малака ў вобласці (летась закуплена 2148 кілаграмаў у разліку на карову). У Глыбоцкім раёне закупам займаюцца як гаспадаркі, так і 9 ІП (яшчэ 5 у стадыі рэгістрацыі). У 2007-м па раёне закуплена 2512 кілаграмаў на карову. У 2008 годзе ў вобласці ўжо зарэгістраваны 4 прыватныя ўнітарныя прадпрыемствы, якія займаюцца зборам малака (у Лёзненскім, Ушацкім раёнах). Гэты накірунак мы будзем развіваць. Гэта і ёсць рэалізацыя праграмы адраджэння вёскі ў частцы развіцця прадпрымальніцтва, дзякуючы якому вырашаецца пытанне занятасці і павышэння зарплаты вясковага насельніцтва.

Па-чацвёртае, сёння мы рэалізуем Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 12 студзеня 2007 г. № 21. Актыўна абмяркоўваем падыходы па рэалізацыі Указа, у тым ліку і на старонках «Местного самоуправления». Але адзначу, што ў запале абмеркаванняў аб даходнай і расходнай частках бюджэтаў пярвічнага ўзроўню, вадзе і дарогах, штатах і праблемах добраўпарадкавання неяк «зацёрся» пункт 2 Указа, што якраз дае адказы на ўсе вышэйпералічаныя пытанні. Вядома ж, не ў кожным сельсавеце можна стварыць камунальныя ўнітарныя прадпрыемствы (КУПы). Але калі старшыня Савета думае на перспектыву (у першую чаргу аб тым, як вырашыць праблемы насельніцтва і замацаваць аўтарытэт мясцовай улады), калі ён — чалавек ініцыятыўны, то ён будзе ствараць такое прадпрыемства. Вопыту ў гэтым накірунку і ў нас, і ў іншых рэгіёнах рэспублікі дастаткова.

У вобласці сёння такая работа актыўна вядзецца ў Лепельскім раёне. У Каменскім сельсавеце, якім кіруе Мікалай Сініцын, КУП дзейнічае даўно і вельмі эфектыўна. Яшчэ ў 4 сельсаветах ідзе рэгістрацыя статутаў КУПаў. Але дапамога і падтрымка ў першую чаргу з боку раёна ў стварэнні КУПаў павінна быць штодзённай і канкрэтнай. І мы ў сваю чаргу на абласным узроўні дапаможам тэхнікай

Па-пятае. Калі гаварыць пра збор з нарыхтоўшчыкаў, згодна з тым жа Указам № 21 ён залічваецца ў бюджэты пярвічнага ўзроўню. Таму на сесіі аблсавета ў снежні 2007 года мы зацвердзілі новую інструкцыю для ажыццяўлення гэтага збору, дзе значна скарацілі льготы нарыхтоўшчыкаў як па дзікарослай, так і па сельгаспрадукцыі. Нашы разлікі паказваюць, што ў 2008 годзе сума збору з нарыхтоўшчыкаў у бюджэтах сельсаветаў павялічыцца ў 2—3 разы. А калі старшыня сельскага Савета будзе зацікаўлена працаваць у першую чаргу сумесна са спажывецкай кааперацыяй, падключыцца да канкрэтнай работы, тады гэтыя даходы могуць павялічыцца і ў 5, і болей разоў...

Ёсць яшчэ шмат іншых накірункаў, па якіх вядзецца работа, і праблем, якія неабходна вырашаць. Але галоўнае — выпрацоўваецца стратэгія, якая рэалізуецца на практыцы. Каб развівалася вёска, людзі павінны адчуць, што пра іх клапоцяцца, аказваюць рэальную дапамогу тым, хто мае прыватную гаспадарку. Бясспэрэчна, яна прыносіць рэальную карысць як уладальнікам, так і дзяржаве. Гэта не толькі статыстыка пацвярджае, але і само жыццё.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

РАБОТА ЁСЦЬ. НЯМА СІСТЭМЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

У нездавальняючым стане знаходзяцца многія фермы і жывёлагадоўчыя комплексы Любанскага, Стаўбцоўскага, Бярэзінскага раёнаў. Сховішчы гною перапоўнены, некаторыя працякаюць. За парушэнні землекарыстання ў мінулым годзе камітэт выдаў 32,8 тысячы прадпісанняў, з якіх выкананы толькі 28 тысяч. Шмат заўваг у інспектараў традыцыйна выклікае Мінскі раён.

— Мінскі раён, сапраўды, самы складаны. Я днямі была ў Хацежынскім сельсавеце, які два тыдні правяралі ўсе магчымыя службы. Што змянілася? Падмялі вакол будынка Савета. На ўсё астатняе страшна глядзець, — дадала Святлана Герасімовіч.

— Калі над добраўпарадкаваннем не працуюць мясцовыя ўлады, ДРБУ, іншыя спецарганізацыі, сіламі аднаго нашага камітэта, які здзяйсняе дзяржаўны кантроль, сітуацыю змяніць цяжка, — падкрэсліў Уладзімір Закаблукаў.

— Пра Мінскі раён гаворка асобая. Паглядзіце, што робіцца ў Калодзішчах, — звярнуўся да прысутных Леанід Крупец. — Гэта ж суцэльная сцёкавая яма! Усе аб'екты засмечаны, паўсюль звалкі. Неабходна распрацаваць праграму добраўпарадкавання Калодзішчаў... А ў Самахвалавічы заедзьце — паглядзіце, у якім стане мясцовы сквер. Навошта мы аб'явілі месяц навядзення парадку на зямлі? Каб хоць неяк зрушыць гэты воз з месца. Сістэмнай работы пакуль яшчэ няма. І ў першую чаргу — з насельніцтвам. А гэтым трэба займацца разам з дэпутацкім корпусам. Праца дэпутата неаплатная, затое ганаровая! Раз людзі вас абралі — пакажыце, на што вы здатныя. Усё можна арганізаваць.

Сапраўды, трэба сёння з дарожнікаў спытаць па ўсёй строгасці — што ўздоўж дарог робіцца? Зіма была цёплая, чаму нельга было кустоўе пачысціць, стаянкі і прыпыначныя пункты добраўпарадкаваць? Чаму ўсе дарожныя знакі перакошаны і размаляваны? Лічу, дрэнна працуе ДАІ. Няма парадку ў лесагаспадарчай службы. Усё засмечана — не праехаць.

Комплексны падыход

У снежні мінулага года абласныя камунальныя службы прынялі на баланс 1287 палігонаў бытавых адходаў, на ўтрыманне якіх патрэбна 6,7 млрд рублёў. Дзе іх узяць?

— Добраўпарадкаванне патрабуе комплекснага падыходу, — адзначыў у сваім выступленні дырэктар Мінскага абласнога ўнітарнага прадпрыемства «Упраўленне жыллёва-камунальнай гаспадаркі» Аляксандр Жураўскі. — Мы сёння вывозім смецце і з прыдарожных палос, і з лясных масіваў, працуем нават у зоне адказнасці Мінгарвыканкама. Праводзім сустрэчы з мясцовымі жыхарамі на прадмет заключэння дагавораў на вываз ЦБА.

— У зоне адказнасці гарвыканкама няхай працуе гарвыканкам. Вы наводзьце парадак на палігонах. Разам са старшынёй Мінскага раённага Савета дэпутатаў з'ездзіце ў Калодзішчы, потым даложыце, што вы там убачылі, і што збіраецеся зрабіць. Звярніце ўвагу на кантэйнеры — калі яны ў апошні раз вывозіліся, — заўважыў Леанід Крупец.

— Аляксандр Браніслававіч, чаму не з усімі сельвыканкамамі яшчэ заключаны дагаворы на вываз цвёрдых бытавых адходаў (усяго ў вобласці 314 сельскіх і пасялковых Саветаў)? Якія раёны дрэнна спрацавалі? — пацікавілася Святлана Герасімовіч. На што атрымала адказ:

— Мы гатовы заключыць дагаворы. Хацеў бы звярнуць увагу на Барысаўскі, Вілейскі, Маладзечанскі, Бярэзінскі і Капыльскі раёны.

Марыя Худая, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, падкрэсліла што адно з самых сур'ёзных пытанняў — гэта пытанне фінансавання. З тымі сумамі, якія плацяць людзі за вываз смецця, камунальнікі не могуць цалкам кампенсаваць свае затраты. Патрэбны дадатковыя сродкі — на набыццё тэхнікі і на арганізацыю работы. Гэта могуць быць паступленні з мясцовых бюджэтаў ці з фонду аховы прыроды.

— Калі старшыні Саветаў дойдуць да кожнага жыхара і той заключыць дагавор на вываз смецця, сума стане меншай, — сказала Святлана Герасімовіч. — Іншая справа, што да кожнага мы яшчэ не дайшлі.

...Пасля «разбору палётаў» і пастаноўкі задач на перспектыву старшыні абласнога Савета і абласнога выканкама звярнулі ўвагу прысутных на тое, што ёсць сёння на Міншчыне і становчыя прыклады добраўпарадкавання, на якія трэба раўняцца, пра якія трэба гаварыць. «Нямала зроблена ў Салігорску, у Слуцку, у тым жа Мінскім раёне, — пацвердзіў Леанід Крупец. — На дрэннае трэба «націскаць», але і становчае неабходна паказваць!»

Інга МІНДАЛЁВА.

КУПІЎ БЫ ХУТАР, АЛЕ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Нашы некранутыя лясы і пушчы вельмі цікавяць замежных турыстаў-паляўнічых.

— Хутка чакаем да сябе ў госці польскіх аматараў паляванне, — гаворыць Генадзь Анатольевіч. — Пойдзем на глушца і цецерука. Гэтых птушак у Еўропе ўжо няма, ці амаль няма. Глушэц любіць ціхія, спакойныя месцы, дзе яго ніхто не патурбуе. А цецерукі цягнуцца бліжэй да балота.

Пасля ўдалага палявання.

У мінулым годзе мы прынялі 16 замежных паляўнічых — грэкаў, палякаў, італьянцаў, французаў. У асноўным гэта людзі вельмі дысцыплінаваныя, шануюць правілы і законы краіны, куды прыехалі. І палююць не дзеля мяса ці футра. Гэта своеасаблівае захапленне, спартыўны азарт.

— Мы б маглі і значна больш замежных турыстаў прывабіць у нашу краіну, — гаворыць Сідарэнка. — Людзі ж вязуць да нас грошы. І немалыя. Яны гатовы іх у нас патраціць. Але ж патрэбны добрыя ўмовы, каб дастойна прыняць гасцей. Якраз гэты момант і ёсць самае балючае месца. Інфраструктура пакуль што не наладжана пэўным чынам. Размяшчалі мы сваіх гасцей, напрыклад, у адной з былых калгасных гасцініц, так званым Панскім доме, што недалёка ад Ганцавічаў. Кошт пражывання даволі высокі. Але ж ён не адпавядае якасці паслуг, што там прапануюць.

Маральна я гатовы да таго, каб асабіста наладзіць сваю справу ў гэтым накірунку. Знайшоў бы і фінансы. Бо ўпэўнены, яны акупяцца. Я дакладна ўяўляю, як гэта будзе выглядаць. Дарэчы, у нас ёсць чым зацікавіць гасцей. І праграма іх знаходжання будзе насычанай і разнастайнай. Гэта і лазня, і знаёмства з горадам, ды іншымі славутымі, вартымі ўвагі мясцінамі, напрыклад, Мірскім замкам, Нясвіжам. Наступным днём «у гумавых ботах» знаёмілі б іх з нашымі лясамі і балотамі. У нас захаваліся традыцыі спрадвечных народных промыслаў. Ёсць і конна-спартыўныя школы. А беларуская традыцыйная кухня — пальчыкі абліжаш...

Купіў бы хутар у прыгожым месцы для экатурызму. Але ж для мяне як гарадскога жыхара заканадаўства пабудавала шмат перашкод, і як іх пераадолець, пакуль не ведаю.

Па-першае, я павінен быць зарэгістраваны на гэтым хутары, пастаянна там пражываць. Але ж я жыву ў горадзе. Маю жыллё, дзе і прапісаны. Для экатурызму яно ж не здатнае! А калі, крый Божа, задумаю больш за пяць пакояў здаваць турыстам (пасля таго, як вырашу першае пытанне), то мне трэба будзе шмат часу і сілаў змарнаваць, каб пачаць спакойна працаваць у гэтым накірунку... Да таго, у канцы 2010 года чакаюцца змяненні ў арганізацыі аграэкатурызму. Як рэаліст я адчуваю, што закон стане больш жорсткім і справу будзе весці цяжэй. Бо нават тыя, хто ўжо працуе, асцерагаюцца ўкладваць сродкі, нешта будаваць, застылі ў чаканні: ці будзе сэнс працаваць далей?

Марыя ЖЫЛІНСКАЯ.
Фота аўтара.

ПАДУМАЦЬ І ПРАГАЛАСАВАЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Кіраўнік райсавета папрасіў прынесці прыгаданую пастанову, а калі прачытаў яе, заявіў, што не падтрымлівае ўзнятага пытання, бо яно надуманае.

У пастанове Савета Міністраў гаворыцца: «...Забяспечыць: прадстаўленне ў Савет Міністраў да 1 красавіка 2008 года рашэнні раённых Саветаў дэпутатаў аб пераўтварэнні сельскіх населеных пунктаў у аграгарадкі ў 2005—2006 гадах і наданні ім статуса аграгарадка;

у аграгарадках падтрыманне аб'ектаў вытворчай, сацыяльнай і інжынерна-транспартнай інфраструктуры ў адпаведным стане і прыняцце неабходных мераў, якія садзейнічаюць іх устойліваму сацыяльна-эканамічнаму развіццю».

Пастанова працытавана поўнасцю, і ў ёй пра змену назваў населеных пунктаў размовы не ідзе.

Ужо не ўпершыню прыходзіцца сутыкацца з падобнымі выпадкамі. Чыноўнікі разводзяць рукамі і ўзнімаюць да неба вочы: маўляў, што мы можам зрабіць, калі ТАМ вырашылі. І часта за гэтым стаіць асабістая некампетэнтнасць, бо пазнаёміўшыся з той ці іншай пастановай, не знаходзіш там падставы для неабдуманых дзеянняў. Чыноўнікі на месцах прыходзяць у рух, праяўляюць энергічнасць не там, дзе трэба, і затым ціха выпускаюць пару.

Назвы пакінулі былыя, хоць вёскі ўжо і сталі аграгарадкамі. Гэты выпадак яшчэ раз нагадаў, што і галасаваць трэба, як у той прымаўцы: сем разоў адмераць перад тым, як адрэзаць...

Сымон СВІСТУНОВІЧ.
Ляхавіцкі раён.

ОСТРЫЕ ВОПРОСЫ ЗА «КРУГЛЫМ СТОЛОМ»

(Окончание. Начало на 1-й стр. «МС».)

В ответ на резонный вопрос аудитории — где эти средства искать, ведь область большая? — Зоя Николаевна посоветовала обращаться на базовый уровень и решать вопросы, связанные с благоустройством, вместе с районной исполнительной властью. Представитель Минфина озадачила некоторых из присутствующих, сообщив, что статьи на освещение и благоустройство в бюджете должны быть разграничены, и никакой «взаимозамены» здесь быть не может. (Если в районе не предусмотрены расходы на благоустройство сельсоветов, то это в корне неправильно). Тем более, что в связи с подорожанием электроэнергии объемы финансирования этого направления в 2008 году значительно возрастут.

Достаточно острая дискуссия в ходе работы «круглого стола» разгорелась вокруг нормативов бюджетной обеспеченности, в соответствии с которыми (по Указу № 21) и должны выделяться дотации бюджетам первичного уровня. Многие председатели сельских Советов сетовали на то, что дотации из района выделяются им по абсолютно непонятному принципу, без какой бы то ни было системы. В результате получаются перекосы, когда один сельсовет, где проживает 1200 человек, имеет бюджет в 90 миллионов рублей, в то время как другой, с количеством жителей под 3500, довольствуется... 76 миллионами.

Зоя Кругликова согласилась с тем, что вопрос поставлен абсолютно правильно. Но, пояснила она, расчет нормативов бюджетной обеспеченности — процесс очень сложный. Это работа не одного дня. Она заключается в том, что бы рассчитать (на уровне села, города), объем потребления социальных услуг (бытовых, торговых, медицинских и т.д.) на одного жителя. А на местах зачастую неправильно понимают этот норматив и рассчитывают его путем простого деления минимально необходимых расходов территории на количество жителей.

— На сегодняшний день, — заявила Зоя Кругликова, — достоверных и взвешенных нормативов бюджетной обеспеченности у нас нет, хотя работа в этом направлении ведется по всем отраслям.

Между тем, необходимость расчетов нормативов бюджетной обеспеченности для регулирования социально-экономического развития административно-территориальных единиц четко прописана в Указе № 21 — о чем напомнил участникам «круглого стола» ответственный секретарь Совета по взаимодействию органов местного самоуправления **Алексей СТЕПАНЕНКО.**

— Я был в рабочей командировке по Гомельской области — там председатели сельских Советов недоумевают: почему одному дали столько, а другому — столько? И пока мы не выйдем на нормативы бюджетной обеспеченности, у нас будет продолжаться эта неразбериха. Я понимаю так: бюджет должен распределяться исходя из каких-то объективных показателей. Где они? Мы второй год ждем от Минфина решения этого вопроса... Вот и получается, что одному председателю Совета дают на освещение двадцать миллионов, а второму — шесть. Он уже их израсходовал и теперь не знает, что делать дальше. Здесь, по-моему, очевиден определенный перекос, который нам всем, сообща, нужно исправлять.

Наталия КАРПЕНКО.

УСЁ Ў НАШЫХ РУКАХ

ЯКАСНЫЯ ПАСЛУГІ ПА МІНІМАЛЬНЫХ ЦЭНАХ

Мікалай СІНІЦЫН, старшыня Каменскага сельскага Савета дэпутатаў Лепельскага раёна, член Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання:

— Старшынёй сельвыканкама працую 11 гадоў. Пераканаены, што на гэтай пасадзе самае галоўнае — быць настойлівым. Нас людзі выбралі, каб вырашаць праблемы іх жыццезабеспячэння — старых, хворых, адзінокіх і г.д. У нас 30 працэнтаў пенсіянераў, якія ўсё жыццё адпрацавалі на карысць дзяржавы, перажылі вайну. І мы павінны зрабіць так, каб яны ні ў чым не мелі патрэбы. Як гэтага дасягнуць, паспрабую патлумачыць на ўласным прыкладзе.

Практычна праз тры гады пасля майго абрання я арганізаваў пры сельвыканкаме механізаванае звяно, далей — камунальнае ўнітарнае прадпрыемства. Мы працуем ужо 7 гадоў, плацім дзяржаве падаткі па поўнай праграме. Перажылі масу праверак — АБЭЗ, пракуратуры... Ды хто толькі ні прыязджаў!.. Але мы выстаялі, выжылі і сёння аказваем людзям, якія жывуць за 30 км ад цэнтра сельсавета, любую паслугу. Пазваніў чалавек па тэлефоне: так і так, мне патрэбны прычэп дроў — праз два дні гэтыя дровы ў яго на дварэ. Неабходна іх распілаваць — калі ласка, зробім! Агарод узараць, бульбу пасадзіць — толькі патэлефануйце. Для гэтай мэты ў мяне маецца спецыяльная тэхніка: два трактары, тры камбайны, бульдозер... На адным з пасяджэнняў Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, а таксама ў ходзе вучобы на курсах пры Акадэміі кіравання я ўзнімаў пытанне аб неабходнасці набыцця тэхнікі ў лізінг, бо раней такой магчымасці ў нас не было... Сёння магу канстатаваць: мы ўжо атрымалі ў лізінг новы трактар МТЗ-82, праплаціўшы за яго ўсяго толькі стартавую цану — крыху болей за 3 мільёны рублёў. Гэта для нас не вельмі вялікія грошы. Затое цяпер мы можам павялічыць колькасць паслуг насельніцтву ў два разы.

Каб не быць галаслоўным, назаву яшчэ некалькі лічбаў. За мінулы год, напрыклад, мы аказалі паслуг насельніцтву на 67 млн рублёў, з іх транспартных — на 27 млн. І гэта — маючы ўсяго толькі пяць адзінак тэхнікі. А тры гаспадаркі, якія знаходзяцца на тэрыторыі сельсавета, са сваімі 100 адзінкамі тэхнікі аказалі платных паслуг толькі на 20 мільёнаў — у тры разы менш, чым наш КУП.

Значыць, прадпрыемства, якое мы стварылі пры сельвыканкаме, жыццёва неабходнае і патрэбнае людзям. Вяскоўцы ідуць да нас з заказамі, ведаючы, што мы аказваем якасныя паслугі своечасова, па мінімальных дзяржаўных цэнах і без нейкіх там дадатковых патрабаванняў (прынесці «паўлітра» ці яшчэ штосьці падобнае).

Калі заказчык — удзельнік вайны ці адзінокі грамадзянін, мы яму ўсё зробім бясплатна, любую гаспадарчую праблему вырашым. Трэба камусьці зямлю канём зараць — калі ласка, у мяне ёсць 8 коней. У СВК няма ніводнага бульдозера, а ў мяне ён ёсць. Таму мы і адчуваем сябе гаспадарамі на сваёй тэрыторыі. Усе нашы затраты акупляюцца. Каб таму ж пенсіянеру аказаць бясплатную паслугу, але пры гэтым самім не «прагарэць», неабходна круціцца, не сядзець на месцы, шукаць сферу прымянення сваіх магчымасцяў.

Напрыклад, гарпаліва прывозіць вяскоўцу прычэп дроў за 180 тысяч рублёў, а мы тую ж самую паслугу аказваем за 85 тысяч рублёў. Ёсць для чалавека розніца? Безумоўна. Прычым нашы дровы больш якасныя, таму што я іх бяру непасрэдна ў лесе і не даводжу да такога стану, калі яны пачынаюць гніць.

Галоўнае для нас — давер людзей. Наша мэта не зарабіць (хоць і гэта важна), а ў першую чаргу дапамагчы чалавеку.

Сёння нам падуладна і спрадвечная праблема добраўпарадкавання могілак — на 7 могілках работнікі нашага КУПа поўнасцю пассякалі дрэвы (каля 300). Між тым, спілоўванне аднаго дрэва для многіх маіх калег — старшынь сельскіх Саветаў — абыходзіцца мінімум у 200—300 тысяч! Дапамагло тое, што ў маладосці я сам займаўся альпінізмам. Ёсць у нас і спецыяльная брыгада... Бяруць мотапілу, лезуць на дрэва, пілуюць яго зверху на кавалкі... Ніводнага помніка яшчэ не сапсавалі. А дровы аддаём жылкамгасу.

Тое, як мы існавалі раней, і тое, як адчуваем сябе сёння, пасля стварэння КУПа, — неба і зямля. Нам стала ў шмат разоў лягчэй, хоць задач мы вырашаем больш. Таму я ўсім ініцыятыўным людзям раю: не бойцеся, стварайце свае прадпрыемствы пры сельвыканкаме. Асабліва калі гаспадаркі на вашай тэрыторыі не надта моцныя.

І апошняе. Работнікі КУП Каменскага сельвыканкама атрымліваюць у сярэднім па 300 тысяч рублёў у месяц, дырэктар — 500 тысяч. Магчыма, гэта і невялікі заробак, але ўсё ж большы, чым у нашых сельскагаспадарчых прадпрыемствах. Ды і людзі нашы на вагу золата — усё, што хочаш, зробяць.

Раковский сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области (Продавец)

проводит открытый аукцион по продаже 2 (двух) земельных участков для индивидуального жилищного строительства: Лот 1 — земельный участок в деревне Раков, площадь участка — 0,1463 га, начальная цена 14 630 000 белорусских рублей; Лот 2 — земельный участок в д. Раков, площадь участка 0,1458 га, начальная цена 14 580 000 белорусских рублей. Целевое назначение земельных участков — строительство и обслуживание жилого дома. Проектируется центральное водоснабжение, имеется в непосредственной близости газ. Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10 % от начальной цены и сбор за участие в аукционе в размере четырех базовых величин перечисляется двумя квитанциями в Главное управление МФ РБ по Минской области РБ, р/с 3600614140152 в филиале № 605 МОУ АСБ «Беларусбанк», код 513, г. Воложин, ул. Партизанская, 13, УНП 600537220, назначение платежа 04901.

Аукцион состоится 8 мая 2008 года в 10.00 по адресу: д. Раков, площадь Свободы, 11, 2 этаж, зал заседаний. Заявления на участие и необходимые документы принимаются до 4 мая (включительно) 2008 года до 17.00 по адресу: д. Раков, пл. Свободы, 11, кабинет секретаря.

Контактный телефон (8 01772) 52 2 36.

ДЗЕ ПАТРЭБНЫ ЎЧАСТКОВЫ?

Начальнік упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама Леанід Фармагей прапанаваў дэпутатам Віцебскага абласнога Савета вывучыць сітуацыю ў раёнах, каб вызначыць, у якіх канкрэтна населеных пунктах неабходны ўчастковыя інспектары міліцыі.

На яго погляд, участковыя на месцах значна паўплываюць на паніжэнне ўзроўню злачыннасці, забяспечаць болей эфектыўную ахову парадку.

Цяпер у рэгіёне 232 участковыя, 63 працэнты з якіх пражываюць на тэрыторыях, дзе працуюць. Для параўнання, яшчэ два гады таму гэты паказчык быў меней за 40 працэнтаў. Пытанне вырашаецца і дзякуючы таму, што ўчастковым выдзяляецца жыллё — 20 кватэр ужо выдзелены, яшчэ 24 плануецца.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗДАРЭННЕ

ЗАГІНУЎ У ГАРАЖЫ

У Столінскім раёне падчас пажару загінуў чалавек. Пажар здарыўся ноччу ў гаражы аднаго з жыхароў пасёлка Рэчыца. Калі падраздзяленне МНС затушыла агонь, на заднім сядзенні машыны «Волга» знайшлі цела 52-гадовага гаспадара. Прычынай узгарання спецыялісты лічаць выкарыстанне самароблага абагравальніка. Па нейкай прычыне чалавек застаўся нанач у гаражы і абаграваў памяшканне. На бяду.

Яна СВЕТАВА.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:

МАЛАФЕЕЎ А. А., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні;

САСОНКА М. П., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце;

СЯЛІЦКІ В. С., старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў;

СІВАКОЎ В. А., старшыня Аршанскага гарадскога Савета дэпутатаў;

ЯРКОВІЧ В. І., старшыня Круглянскага сельскага Савета Магілёўскай вобласці.

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК: Наталля КАРПЕНКА.
Кантактны тэлефон 292 21 03.

Краіна здароўя

Выпуск № 19 (75)

Раіць спецыяліст

Генеральнай УБОРКАЙ — ПА АЛЕРГЕНУ

1 грам пылу з падушкі ці коўдры можа ўтрымліваць 200—15 000 кляшчоў-сапрафітаў. Вось гэта заапарк!

Паліноз — хвароба, якую выклікае пыленне раслін, прыносіць алергікам нямала пакутаў. Аднак звычайны бытавы пыл, які заўсёды разам з намі, бадай, яшчэ больш небяспечны алерген, чым пылок раслін. Калі ў вас раптоўна з'яўляюцца кашаль, хрыпы, прыступы ўдушша, ноччу дрэнна дыхаецца, то зусім верагодна, што так сябе праяўляе бытавая алергія, — гаворыць *дацэнт кафедры алергалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Людміла МАСЛАВА.*

Пакаёвы пыл, у якім жывуць кляшчы-сапрафіты, выклікае самую цяжкую дыхальную алергію і можа справакаваць захворванне на бранхіяльную астму. 1 грам пылу з падушкі ці коўдры можа ўтрымліваць 200—15 000 кляшчоў-сапрафітаў.

Кніжны і газетны пыл выклікае так званую «бібліятэчную» алергію з рознымі праявамі — ад чхання да прыступаў удушша.

Пыл раздражняе слізістыя абалонкі — лёгкіх, бронхаў, вачэй, скуры і г.д. Гэта можа прывесці да язваў у насавой перагародцы, узнікнення рыніту, бранхіту, астмы, пнеўманіі, кан'юнктывіту, дэрматыту і г.д. А пыл, які трапіў у лёгкія, выклікае розныя іх захворванні — пнеўмаканіёзы.

У пакаёвым пыле тыднямі і месяцамі жывуць і цудоўна сябе адчуваюць многія патагенныя мікраарганізмы, вірусы: стрэптакокі, стафілакокі, туберкулёзная і дыфтэрыйная палачка.

Некаторыя віды пылу, напрыклад, марганцавы, выклікаюць атручэнне.

Цэментны, азбеставы, шклаватны пыл павышаюць рызыку анкалогіі.

Моцным алергенам з'яўляецца пыл бытавой хіміі. Калі вы мыеце посуд, падлогу ці вокны цударатворамі, выкарыстоўваеце пральны парашок, то пасля іх высыхання ўтвараецца тонкая плёнка «хіміі», а потым пыл.

Улічваючы, што чалавек праводзіць дома дастаткова шмат часу штодзень, хваробы, выкліканыя бытавымі алергенамі носяць круглагадовы характар. Спачатку праявы хваробы могуць узнікаць толькі пры масіўным кантакце з пылам (падчас уборкі, рамонту). З цягам часу захворванне ўзмацняецца і дае аб сабе ведаць штодзень раніцай, з'яўляюцца прыступы чхання, слёзацячэння, і ўрэшце прыходзіць самае цяжкае ўскладненне — прыступы ўдушша па начах ці позна вечарам.

Ці можна максімальна засцерагчыся ад бытавых алергенаў? Так, калі прытрымлівацца пэўных правілаў.

- Абавязкова праветрывайце пакоі па некалькі разоў на дзень. Спіце пры адчыненай фортцы. Штодзень прымайце душ. Знаходзьцеся як мага больш часу на свежым паветры — 2—3 гадзіны ў будні і 8—10 па выхадных.
- Не дазваляйце хатнім жывёлам валяцца на ложках і канапах. Каты і сабакі з'яўляюцца моцнымі акумулятарамі хатняга пылу.
- Па магчымасці пазбаўляйцеся ад сінтэтычных паласаў. Пры трэнні ад хады яны назапашваюць статыстычную электрычнасць, якая прыцягвае пыл.
- Ніколі не рабіце сухую ўборку. Не вытрэсвайце адзенне, не трасіце пасцельныя рэчы — толькі пральня і хімчыстка.
- Часцей ачышчайце рашоткі вентыляцыі і не закрывайце іх дэкаратыўнымі прыстасаваннямі. Мыйце радыятары ёршыкам ці пэндзлем. У продажы ёсць спецыяльныя прылады для мыцця батарэй, да прыкладу, лапатка з паралону на доўгай ручцы.
- У жылых пакоях (ці хоць бы ў спальні) павінна быць як мага меней мэблі, драпіровак, фіранак, карцін, дываноў. Кнігі павінны захоўвацца на закрытых паліцах ці ў шафах. У спальні не трымайце верхняе адзенне, а таксама старыя непатрэбныя рэчы. Каб пыл не назапашваўся ў шафах, захоўвайце адзенне ў спецыяльных мяшках.
- Часцей працірайце камп'ютар, тэлевізар. Паверхневыя электрычныя зарады прыбораў прыцягваюць і ўтрымліваюць пыл. Акрамя таго іанізаваны іх выпраменьваннем пыл асабліва шкодны для здароўя, ён больш хімічна актыўны, чым «незараджаны».
- Вільготнасць у жылых памяшканнях пажадана падтрымліваць на ўзроўні 50 працэнтаў. Сонечнае святло забівае кляшчоў пры 3-гадзіннай экспазіцыі.
- Выкарыстанне мыючых пыласосаў, бытавых фільтраў таксама дазваляе істотна знізіць колькасць алергенных часцінак у жылых памяшканнях. Адным з апошніх бытавых прыбораў, створаных у свеце для барацьбы з хатнімі алергенамі, з'яўляецца параачышчальнік.

Вольга ШАЎКО.

Карысна ведаць

ЗАСЛУГА ЧЫРВОНАКАЧАННАЙ КАПУСТЫ

- Дзякуючы высокаму ўтрыманню пігменту валодае антырадыяцыйнымі ўласцівасцямі;
- у яе лістах шмат вітамінаў, мінеральных соляў — натрыю, магнію, кальцыю, жалеза, фосфару, ёду;
- у параўнанні з белакачаннай у ёй менш клятчаткі, але больш караціну;
- па ўтрыманні вітаміну С гэта капуста перавышчае белакачанную, і вітамін не разбураецца ў час зімовага захоўвання;
- у чырвонакачаннай капусце выяўлены рэчывы, якія павышаюць пругкасць сценак крывяносных сасудаў, нармалізуюць пранікальнасць капіляраў, што папярэджвае сасудзістыя захворванні ў чалавека;
- фітанцыды чырвонакачаннай капусты перашкаджаюць развіццю туберкулёзнай палачкі.

І БЯЗДОМНЫ МОЖА ПРАЙСЦІ ДАСЛЕДАВАННЕ

У Віцебскай вобласці ўжо дзейнічаюць 13 стацыянарных рэнтгенаапаратаў новага пакалення «Пульмаскан» і 5 рэнтгенаўскіх кабінетаў на колах «Пульмаэкспрэс».

Як расказалі «Звяздзе» ў Віцебскім абласным клінічным супрацьтуберкулёзным дыспансэры, гэта апаратура айчыннай вытворчасці. Каб зрабіць здымак, не трэба выкарыстоўваць традыцыйную плёнку. Здымак можна вывесці на звычайную паперу. А каб захаваць яго надоўга, медыкі могуць запісаць вынік даследавання на электронны носьбіт. Але самае галоўнае — радыяцыйная нагрузка на пацыента падчас даследавання ў разы меншая. Для параўнання, традыцыйная флюараграфія дае дозу 0,5 мілізіверта, а апараты новага пакалення толькі 0,04.

Летась флюараграфічнае даследаванне прайшлі 89,8 працэнта насельніцтва. Сярод даследаваных ёсць і бяздомныя, якіх прывозяць у дыспансэр са спецпрыёмніка. У выніку падазрэнняў на наяўнасць у іх захворвання на туберкулёз, праводзіцца стацыянарнае лячэнне. І потым з дапамогай міліцыі можна будзе прасачыць за станам здароўя такіх пацыентаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ДЫЯГНОСТЫКА АСТЭАПАРОЗУ

У Мінску сёлета будзе закуплены ўнікальны апарат для дыягностыкі астэапарозу. Ён будзе ўстаноўлены ў 1-й гарадской клінічнай бальніцы, у якой дзейнічае гарадскі цэнтр профілактыкі астэапарозу. Урачы змогуць праводзіць хуткую, амаль імгненную дыягностыку захворвання і ацэньваць рызыку пераломаў. Цяпер такі апарат ёсць у Рэспубліканскім цэнтры медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння. Чарга на даследаванне складае 3 месяцы. Яшчэ адзін апарат ёсць у Гомелі.

Пытальнік

Колькі дзён водпуску ў настаўніка-дэфектолага?

Падкажыце, калі ласка, ці захавалася пасля ўнясення змяненняў у Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь, ранейшая працягласць водпуску ў настаўніка-дэфектолага, які працуе ў пункце карэкцыйна-педагагічнай дапамогі ў дзіцячых ясляхсадку?

Валянціна Трафімовіч,
г. Салігорск.

Як патлумачлі журналісту «Звязды» ў аддзеле працы і заработнай платы Міністэрства адукацыі нашай краіны, згодна з трэцім пунктам Пераліку арганізацый і пасадаў педагагічных работнікаў, працягласць асноўнага водпуску якіх складае больш як 24 дні (глядзі дадатак да пастановы Савета Міністраў ад 24.01.2008 года № 100), працягласць водпуску ў настаўнікаў-дэфектолагаў складае 56 дзён.

Сямейны псіхолаг
Святлана Анішчанкава

СТВАРЭННЕ НОВАГА СВЕТУ

У дом прыйшло шчасце. Гучна і радасна, патрабуючы ўвагі і любові. «Эй, людзі! Вы чуеце, я пасланы вам на дапамогу, падтрымаць вас, каб вы даведаліся, што такое сапраўдныя радасць і яскравыя фарбы». Нарадзілася новае жыццё. Працавітае, сумленнае, перамагаеноснае ва ўсім. Умова адна — каб любілі ўсе без выключэння, аддаючы сябе без астатку. Так патрэбна для стварэння новага свету.

Яшчэ зусім нядаўна яны былі такія адзінокія: мужчына і жанчына — не ведалі, што надзелены геніяльнасцю стварэння. Пасля выпрабавання каханнем сэнс прыйшоў, сам пастукаў у дзверы, павітаўся і стаў поўнаўладным гаспадаром. З гэтага часу яны — моцная каманда. Ім трэба прайсці агонь, ваду, медныя трубы — у дапамогу арсенал з кахання, даверу, страху, нянавісці, адчаю і шчасця.

З моманту з'яўлення дзіцяці ў жыцці маладой сям'і ўсё мяняецца. Гэта вялізны крок наперад у развіцці мужчыны і жанчыны. Ніколі яна не стане ранейшай няцямлівай дзяўчынай, цяпер яна — маці... Ніколі ён не вернецца ў мінулае з яго няведаннем і наіўнасцю, цяпер ён — прадаўжальнік роду, апора. Маладая сям'я, якая падтрымліваецца каханнем, шчаслива адаптуецца да новых умоў жыцця. Прыме адказнасць, ацэніць каштоўны дар, даруе памылкі адно аднаму і дабавіць сваю порцыю святла ў гэты свет.

Сёння, аднак, многія маладыя пары, якія атрымалі вопыт бацькоўства і мацярынства, не вытрымліваюць выпрабавання. Ідэалізаванае ўспрыманне, няведанне псіхалогіі мужчыны і жанчыны, вымушаныя шлюбы і адсутнасць падтрымкі з боку больш вопытных сваякоў — усё гэта ўмовы, якія спрыяюць распаду сям'і. Распаўсюджаная сітуацыя, калі, непадрыхтаваныя маральна і фізічна да цяжкасцяў, маладыя людзі ўяўляюць сваё жыццё ў ружовым святле.

Але шчасце не даецца дарам. Яго трэба зарабіць. Сілаў на клопат аб дзіцяці ідзе шмат, часу для забаў не хапае, цярпенне на зыходзе. На змену першым радасным дням прыходзяць доўгія поўныя турбот будні і бяссонныя ночы. Як правіла, асноўная нагрузка кладзецца на плечы маладой мамы, якая ўжо адхадзіла цяжарная і нарадзіла, патраціўшы нямала эмацыянальных і фізічных сілаў. Наступныя месяцы няспыннага клопату, кармлення грудзьмі, трывогі за здароўе малога даюцца жанчыне нялёгка. Без падтрымкі любячага, цярплівага мужа можа наступіць зацяжная дэпрэсія, наступствы якой непрадказальныя.

Але ўсё ж маці — стан натуральны. Паступова і грунтоўна падрыхтаваная прыродай жаночая сутнасць з галавой паглыбляецца ў мацярынства, агрэсіўна ахоўваючы ад найменшай небяспекі сваё немаўля. Бацькоўства ж — стан набыты, і ў многім залежыць ад двух асноўных фактараў. Першы — умовы сталення мужчыны ў дзяцінстве. Другі — адэкватнае ўспрыманне жонкай магчымасцяў мужа, яе здольнасць разгледзець у ім тое добрае (а гэта ёсць абавязкова ў кожнага, проста ў некаторых надта глыбока схавана), на чым можна пабудаваць сям'ю.

Пры спрыяльным асяродку ў сям'і бацькоў мужчына, які стварыў уласную сям'ю, гатовы ўзяць на сябе адказнасць за дзіця, падтрымаць жанчыну. Ён будзе натуральным чынам прыняты сваёй жонкай і сям'я будзе жыць і развівацца паўнацэнна. У адваротным выпадку жонка-маці адасобіцца ад мужа, рызыкуючы назаўсёды эмацыянальна аддаліць бацьку ад дзіцяці. У такой сям'і фактычна існуе апазіцыя «маці—дзіця» ў адносінах да «бацькі-здабытчыка». Не ўмеючы наладзіць зносіны з дзіцем і жонкай, адчуваючы сваю непатрэбнасць, малады мужчына знаходзіць выйсце ў асабістых захапленнях, не заўсёды зручных для сям'і, якую ён утрымлівае.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Абмежаванне кантакту бацькі з дзіцем выклікае ў малога дэфіцыт эмацыянальнай цеплыні. Зносіны з бацькам з'яўляюцца неад'емнай часткай паўнацэннага фарміравання асобы. Грунтуюцца яны, у першую чаргу, на прызнанні бацькам дзіцяці. Не будучы прызнаным у дзяцінстве адным або двума бацькамі, у будучым чалавеку будзе надзвычай цяжка зразумець сутнасць патрабаванняў яго ўласных дзяцей. Ён з вялікай верагоднасцю зноў паўторыць тыя памылкі, якія калісьці дапусцілі яго бацькі. Заганны круг замкнецца яшчэ раз.

У дадзеным выпадку паспяховае бацькоўства магчымае толькі пры вельмі мудрай пазіцыі жанчыны. Каханне на тое і дадзена людзям у дапамогу — убачыць усё добрае, што ёсць у чалавеку. Не бачыш — значыць не кахаеш. Але калі жанчына кахае мужчыну, то, нягледзячы на няўдалыя перадумовы, яна захоча і зможа выцягнуць на свет божы ўсё тое каштоўнае, што ў яго захоўваецца глыбока ў душы. Тут важна адэкватнае ўспрыманне маладой жонкай магчымасцяў свайго мужа — яшчэ нявопытнага бацькі. Не трэба патрабаваць усяго і адразу. Жаночая і мужчынская псіхіка кардынальна адрозніваюцца і нясуць розную праграму. Там, дзе мужчына яшчэ не адаптаваўся, жанчына ўжо гаспадыня. Не трэба шукаць у яго паводзінах абыякавасці да дзіцяці. Мужчынская эмацыянальнасць знешне праяўляецца неактыўна, але перажываюць мужчыны не менш за жанчын.

Неабходна даць маладому тату час прывыкнуць да новай ролі. Цяпер не толькі кардынальна змянілася ўсё яго жыццё, але і жонка стала іншай. І да гэтай «новай» жонкі трэба знайсці падыход. Жанчына-маці часта агрэсіўная ад стомленасці і трывог, не такая дагледжаная, і разам з тым — уладна патрабуе ўвагі. Але такую неабходную ёй падтрымку жанчына, якая нарадзіла дзіця, можа атрымаць толькі пры ўмове адэкватна ўспрынятай рэчаіснасці. Галоўнае — каб каханы чалавек быў побач. Калі ён будзе ўсёй душой імкнуцца да сваёй сям'і, значыць усё атрымаецца. Ён яшчэ многага не ўмее, але стараецца, трэба дапамагчы яму стаць добрым бацькам і мужам.

Да часу некранальны душэўны залаты запас маладога мужчыны-бацькі — адзінае, да чаго беспамылкова можа апеляваць жанчына, якая імкнецца стварыць гармонію ў сям'і. Прадбачачы пазітыўныя эмоцыі мужа, правакуючы іх, чакаючы дабра ад чалавека, які падарыў самы дарагі падарунак, жанчына зможа рэалізаваць дадзеныя ёй ад прыроды магчымасці — пасеяць насенне цудоўнага саду, які будзе расцвітаць шчасцем кожны сезон.

P.S. *Хачу прапанаваць чытачам ад тэорыі перайсці да практыкі. І хоць завочна і за адзін раз цяжка аказаць эфектыўную псіхалагічную падтрымку, але ўсё ж канкрэтныя жыццёвыя сітуацыі, погляд на іх збоку, могуць дапамагчы нам усім лепш зразумець адно аднаго. Пішыце, званіце, задавайце сямейнаму псіхолагу Святлане Анішчанкавай свае пытанні, спрачайцеся, райцеся. Кантактны тэлефон 287 18 69. E-mail: svetlana-psikholog@yandex.ru Пішыце таксама на адрас рэдакцыі з паметкай «Сямейны псіхолаг».*

«ФАРМАЦЭЎТЫЧНЫЯ ДЖУНГЛІ»

Менавіта так можна ахарактарызаваць сітуацыю, якая склалася апошнім часам на сусветным фармацэўтычным рынку. Па ацэнках экспертаў, на сёння ў свеце каля 300 тысяч найменняў зарэгістраваных лекавых прэпаратаў. Аднак у пераважнай большасці велізарны асартымент, які фармвытворцы прапануюць лечачым урачам, складаецца з лекавых сродкаў непацверджанай эфектыўнасці, тэрапеўтычных аналагаў і фармацэўтычных копій, а таксама з камбінацый некалькіх вядомых лекавых рэчываў. І як, скажыце, медыкам арыентавацца ў такім разнастайным «арсенале»? Па даных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, да 40 працэнтаў прызначэнняў лекавых сродкаў — нерацыянальныя. Днямі ў Мінску на базе БелМАПА прайшоў міжнародны сімпозіум «Эканоміка ў ахове здароўя», які сабраў спецыялістаў у галіне фармакалогіі з розных краін СНД.

— Рост выдаткаў на лекавае забеспячэнне ва ўсіх краінах свету пастаянна расце. Па-першае, старэнне насельніцтва суправаджаецца ростам колькасці хранічных захворванняў, што вымагае ад сістэм аховы здароўя дадатковых сродкаў. А па-другое, на фармацэўтычным рынку з'яўляюцца інавацыйныя лекавыя сродкі, якія могуць калі не спыніць, то радыкальна змяніць цячэнне хваробаў і істотна палепшыць якасць жыцця пацыентаў, — падзяліўся сваімі думкамі з калегамі *дацэнт кафедры клінічнай фармакалогіі Расійскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук Аляксандр БЫКАЎ.* — Праўда, для стварэння аднаго інавацыйнага прэпарата патрабуецца да 1 млрд еўра. Таму для таго, каб акупіць свае выдаткі, фірмы-вытворцы вымушаны падтрымліваць высокія цэны. У краінах Еўрасаюза маюцца добра развітыя сістэмы сацыяльнай падтрымкі насельніцтва і высокі ўзровень кампенсацыі выдаткаў на лекавае забеспячэнне — у некаторых краінах да 80 працэнтаў. Між іншым, еўрапейцы, якія прызвычаіліся да высокага ўзроўню жыцця, не хочуць эканоміць на якасці медыцынскай дапамогі і патрабуюць, каб ім прадаставалася максімальна эфектыўнае лекавае лячэнне. Але як забяспечыць прынцыпы сацыяльнай справядлівасці ва ўмовах абмежаваных фінансавых рэсурсаў? Ці мэтазгодна выкарыстоўваць увесь арсенал лекавых сродкаў, што выпускаецца? І на якія лекі трэба рабіць стаўку ў першую чаргу?

Адказы на гэтыя пытанні дае фармакаэканоміка, якая нарадзілася на Захадзе 20 гадоў таму. Фармакаэканоміка — гэта не спосаб зніжэння выдаткаў на ахову здароўя, а спосаб павышэння іх эфектыўнасці. Першае фармакаэканамічнае даследаванне, якое параўноўвала выдаткі і эфектыўнасць лячэння, было праведзена ў 1986 годзе. У той час аб'ектам даследавання сталі людзі, хворыя на СНІД. У прыватнасці, было падлічана, што для падаўжэння жыцця пацыента са СНІДам усяго на адзін год патрабуецца сума ў 10 тысяч долараў ЗША. І ставілася пытанне, а ці будуць такія прэпараты фінансавацца дзяржавай? Адказ, на шчасце, аказаўся станоўчым, і сёння прэпараты для лячэння хворых на СНІД уваходзяць у Пералік асноўных лекавых сродкаў Сусветнай арганізацыі аховы здароўя.

Дарэчы, сёння нацыянальныя Пералікі жыццёва важных лекавых сродкаў маюцца практычна ва ўсіх краінах свету. У Беларусі гэты пералік налічвае 480 міжнародных непатэнтаваных назваў, што адпавядае 2779 гандлёвым назвам.

— Пералік асноўных лекавых сродкаў носіць у нас функцыянальны характар, — паведаміў у сваім выступленні *першы намеснік міністра аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Роберт ЧАСНОЙЦЬ.* — Па-першае, ён дазваляе сістэме аховы здароўя канцэнтраваць рэсурсы на закупках лекавых сродкаў, якія маюць найбольш пераканаўчыя доказы іх эфектыўнасці. Да таго ж лекавыя сродкі Пераліку ўваходзяць у клінічныя пратаколы лячэння. У межах пераліку ажыццяўляецца таксама і льготнае лекавае забеспячэнне пацыентаў. Дзяржаўная палітыка ў галіне льготнага забеспячэння — адно з найбольш складаных і сацыяльна вострых пытанняў. І менавіта на пытанні, звязаныя з льготамі на лекі, прыпадае значная колькасць зваротаў грамадзян. Між іншым, летась Пералік асноўных лекавых сродкаў быў пашыраны на 69 пазіцый, у тым ліку на 42 пазіцыі — па айчынных лекавых сродках. Усяго ў Пералік уключаны 195 найменняў лекавых сродкаў, якія выпускаюцца ці фасуюцца ў Беларусі.

І ўсё ж праблемы з фарміраванем Пераліку асноўных лекавых сродкаў ёсць ва ўсіх краінах свету. Хоць бы таму, што паміж дзяржавай, вытворцамі, урачамі, страхавымі фондамі і пацыентамі нярэдка разгараюцца канфлікты інтарэсаў. У Маскве нейкі час таму прадпрымалася спроба выключыць з Пераліку асноўных лекавых сродкаў тыя, што медыкі лічаць малаэфектыўнымі, аднак старэйшае пакаленне пацыентаў іх адстаяла, сцвярджаючы, што ім дапамагаюць менавіта гэтыя лекі. Нацыск пацыентаў давялося трымаць і беларускаму Міністэрству аховы здароўя пры фарміраванні Пераліку, калі раптам высветлілася, што дзякуючы агрэсіўнай рэкламе фармацэўтычных вытворцаў у некаторых пацыентаў ужо паспелі сфарміравацца пэўныя стэрэатыпы, што той ці іншы прэпарат ім проста жыццёва неабходны.

Знаёмыя гэтыя праблемы і крайнам са страхавой медыцынай, дзе пры вызначэнні кампенсацый кіруюцца фармулярамі, куды ўваходзяць прэпараты толькі з даказанай эфектыўнасцю. Але эфектыўнасць інавацыйнага прэпарата яшчэ трэба даказаць, і гэта справа не аднаго дня. Вось чаму ў 1995 годзе было створана Міжнароднае таварыства фармакаэканамічных даследаванняў і вынікаў лячэння (ISPOR), якое аб'яднала ўрачоў, фармацэўтаў, эканамістаў, медыцынскіх сёстраў, навуковых работнікаў, работнікаў фармацэўтычнай прамысловасці і прадстаўнікоў даследчых кампаній. Дарэчы, з пункту гледжання спецыялістаў ISPOR, эканамічна эфектыўны лекавы прэпарат зусім не з'яўляецца сінонімам таннага лекавага прэпарата.

Ацаніць сапраўдную карціну з выкарыстаннем тых ці іншых прэпаратаў дапамагаюць фармакаэпідэмічныя даследаванні. У Расіі, напрыклад, падчас падобнага даследавання было ўстаноўлена, што лечачы сваё захворванне толькі менш за чвэрць хворых з артэрыяльнай гіпертэнзіяй. Нават з трэцяй ступенню гіпертэнзіі лечыцца толькі кожны трэці пацыент. 64 працэнты хворых на артэрыяльную гіпертэнзію прымаюць прэпараты каротказмяшчальнага дзеяння. 20 працэнтаў прымаюць лекавыя сродкі «па неабходнасці». І толькі 13 працэнтаў пастаянна прымаюць лекавыя прэпараты.

— Гіпертанію нельга вылечыць, але яе можна кантраляваць з дапамогай лекавых прэпаратаў, пры ўмове, што лекавая тэрапія будзе доўжыцца ўсё жыццё, — пераканаўчая *прафесар кафедры клінічнай фармакалогіі Расійскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, доктар медыцынскіх навук Марына ЛЕОНАВА.* — Мы, у прыватнасці, высветлілі, што пацыентам прызначаліся ў агульнай складанасці 120 найменняў лекавых прэпаратаў, аднак дзве трэці з іх не адпавядалі сучасным патрабаванням. Гэта значыць, што для лячэння выкарыстоўваліся маральна састарэлыя прэпараты кароткатэрміновага дзеяння.

Даведка «Звязды»:

Па даных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, каля 30 працэнтаў насельніцтва ў свеце не маюць рэгулярнага доступу да асноўных лекавых сродкаў. Розніца ва ўзроўні выдаткаў на лекі паміж беднымі і найбольш заможнымі краінамі свету вар'іруецца на душу насельніцтва ад 10 да 600 долараў ЗША ў год.

Укараненне сучасных інавацыйных прэпаратаў у практычную медыцыну дазволіла:

— за 40 гадоў павялічыць сярэднюю працягласць жыцця на 8 гадоў;

— за 20 гадоў на 21 працэнт павялічыць пяцігадовую выжывальнасць анкалагічных хворых;

— смяротнасць ад ВІЧ/СНІДу скарацілася на 70 працэнтаў у параўнанні з 1995 годам.

Шчасця і здароўя вам, дарагія чытачы!

Яшчэ адна сур'ёзная праблема — гэта праблема біяэквівалентнасці джэнэрыкаў арыгінальным прэпаратам (у Беларусі джэнэрыкі і традыцыйныя прэпараты складаюць 78 працэнтаў ад агульнай колькасці лекаў). З аднаго боку, джэнэрыкі з'яўляюцца больш таннымі копіямі арыгінальных прэпаратаў, на якія скончыўся тэрмін іх патэнтнай аховы, што робіць іх для пацыентаў больш даступнымі. Але, з іншага боку, далёка не заўсёды выкарыстанне джэнэрыкаў гарантуе той жа лячэбны эфект, як ад выкарыстання арыгінальнага прэпарата.

— У ЗША ёсць спецыяльная «Аранжавая кніга», дзе пералічваюцца ўсе лекавыя сродкі з пазнакай, эквівалентныя яны ці не арыгінальнаму прэпарату. І на падставе гэтай кнігі складаюцца пратаколы лячэння, — паведаміў *загадчык кафедры клінічнай фармакалогіі і тэрапіі БелМАПА, доктар медыцынскіх навук, прафесар Аляксандр ХАПАЛЮК.* — На мой погляд, хворым трэба прызначаць не тыя прэпараты, якія павінны лячыць, а тыя, якія лечаць.

Як ужо зразумелі нашы чытачы, джэнэрыкі характэрныя не толькі для небагатых краін, але і для краін Захаду. Узяць хоць бы тыя ж статіны, якія для хворых на атэрасклероз патрэбныя не менш, чым антыбіётыкі для пацыентаў з пнеўманіяй. З усіх краін свету толькі ў Японіі 70 працэнтаў хворых прымаюць арыгінальныя прэпараты, а ў астатніх карыстаюцца пераважна джэнэрыкамі. Напрыклад, у Вялікабрытаніі і Канадзе 50 працэнтаў стацінаў — гэта джэнэрыкі, а ў Італіі джэнэрыкаў — да 75 працэнтаў.

На думку *выканаўчага дырэктара Асацыяцыі міжнародных фармацэўтычных вытворцаў у Беларусі Аляксея СЫЧОВА,* працэдура фарміравання нацыянальнага Пераліку асноўных лекавых сродкаў павінна быць празрыстай і шматступеньчатай, з прыцягненнем розных экспертаў, практыкуючых урачоў, фармвытворцаў і прадстаўнікоў прафесійных грамадскіх аб'яднанняў.

Сур'ёзныя надзеі сёння ўскладаюцца на развіццё ў Беларусі службы клінічных фармаколагаў. Апошнія будуць выконваць ва ўстановах аховы здароўя ролю кансультантаў — дапамагаць урачам падабраць для пацыентаў прэпарат, аптымальны па суадносінах «цана—якасць—эфектыўнасць». Пасада такога спецыяліста ўжо ўнесена ў класіфікатар медыцынскіх прафесій.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Бяспечнае харчаванне

Памідор без цяжкіх металаў

Вучоныя-селекцыянеры ўсяго свету працуюць сёння над стварэннем раслін будучыні. Знешне яны, безумоўна, не зменяцца: мы пазнаем любімыя бульбу, цыбулю, тамат... А вось па сваіх вартасцях гэта будуць, як кажуць, зусім іншыя культуры. У нашым выпадку, напрыклад, можна нават на забруджаных радыенуклідамі землях вырошчваць «чыстыя» гатункі.

Паводле слоў дырэктара Інстытута генетыкі і цыталогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандра КІЛЬЧЭЎСКАГА, усе сучасныя навукі знаходзяцца пад уплывам экалагізацыі. У тым ліку генетыка з селекцыяй, дзе ўзнік і актыўна развіваецца новы накірунак даследаванняў, — экалагічная селекцыя раслін.

— Падчас стварэння новай расліны, новага гатунку неабходна забяспечыць стабільнае атрыманне багатага ўраджаю, максімум прадукцыі, здольнай закрыць праблему харчовай бяспекі, — тлумачыць Аляксандр Уладзіміравіч. — Забяспечваецца гэта патрэба ўласна біялагічным падмуркам — устойлівасцю раслін да розных стрэсаў, напрыклад, да змены тэмпературы, вільготнасці і г.д. Аднак за кошт якіх механізмаў можна дабіцца гэтай самай устойлівасці? Вось на якое пытанне мы і шукаем адказ. За апошнія гады былі распрацаваны методыкі дакладнай і карэктнай ацэнкі параметраў устойлівасці генатыпаў у розных асяроддзях. Такі накірунак нашай работы называецца адаптыўнай селекцыяй...

Аднак сучасную селекцыю як ніколі хвалюе цяпер і іншае, яшчэ больш цікавае, пытанне: якім чынам пры мінімуме затрат атрымаць максімум ураджаю? Як стварыць так званыя энергетычна эфектыўныя гатункі? Зразумела, што любая расліна — своеасаблівая фабрыка ў мініяцюры. Спачатку яна спажывае пэўную энергію, пасля аддае. Дарэчы, паводле біялагічнага закона змяншэння аддачы, чым больш уносіш, тым менш атрымліваеш. Відавочна, што сітуацыя, пры якой ужываецца максімум энергіі, а аддаецца мінімум, з'яўляецца стратнай і абсалютна недапушчальнай у цяперашніх умовах. Таму перад даследчыкамі паўстае няпростая задача: стварыць такія тэхналогіі, такія расліны, якія будуць пры мінімуме затрачанай энергіі (угнаенняў, пестыцыдаў, нафтапрадуктаў і г.д.) даваць максімальную аддачу. Цяпер над гэтай задачай «ламае галаву» ўвесь цывілізаваны свет, яна абмяркоўваецца на сур'ёзных навуковых сустрэчах.

— На шэрагу сельскагаспадарчых культур даследчыкам удалося паказаць больш эфектыўнае выкарыстанне азоту, фосфару і калію, што было пацверджана намі на культуры тамату, — кажа Аляксандр Уладзіміравіч. — Эфектыўнасць адных гатункаў перад іншымі склала 3—4 разы...

Яшчэ адзін актуальны ў апошнія гады накірунак даследаванняў — селекцыя на змяншэнне назапашвання забруджвальных рэчываў, так званых палютантаў. Да іх адносяцца радыенукліды, цяжкія металы — кадмій, свінец, цынк, а таксама нітраты і пестыцыды. Праблема ў тым, што ў сучасных умовах у прамым сэнсе аказваецца «шкодным для здароўя» разглядаць тую ж раслінную ежу выключна з пазіцыі колькасці вугляводаў ці вітамінаў. Важным паказчыкам стала бяспечнасць — адсутнасць забруджвальных рэчываў. І тут вучоныя высветлілі, што назапашванне апошніх напрамую залежыць ад канкрэтнага генатыпу, іншымі словамі, пэўныя культуры, гатункі назапашваюць больш палютантаў, прычым асобныя — значна больш, у дзесяткі разоў. Такім чынам, узнікла патрэба ў мэтанакіраванай селекцыі.

— У Брагінскім раёне мы паказалі на культурах тамата, капусты, цыбулі і морквы адрозненне па назапашванні радыенуклідаў, — удакладняе Аляксандр Кільчэўскі. — У некаторых гатункаў гэта «здольнасць» была вышэйшай у 2—4 разы. Відавочна, калі мы адбяром гатункі, якія мінімальна назапашваюць радыенукліды, то значна зменшым іх паступленне з ежай. Што датычыцца цяжкіх металаў, якія актыўна асядаюць на землях, блізкіх да буйных гарадоў і аўтамагістраляў, і на якіх катэгарычна нельга нічога вырошчваць, то і тут, як высветлілася, адрозненні па пэўных гатунках і культурах таксама істотныя. Гэты накірунак нашай работы атрымаў міжнароднае прызнанне. Хоць замежныя даследчыкі, якія працуюць згодна з еўрапейскай канцэпцыяй «Расліны для будучыні», таксама прыйшлі да адпаведнай высновы...

Нашы распрацоўкі дапамагаюць селекцыянерам стварацгатункі раслін з найменшымі затратамі. Мы распрацоўваем сістэмы малекулярных маркераў для адбору тых ці іншых прыкмет. Гэта значыць, што для вывучэння, скажам, устойлівасці расліны да нейкага рэчыва зусім не абавязкова высаджваць культуру ў полі. Любое даследаванне цяпер можна правесці ў лабараторных умовах, калі патрэбны нам ген будзе шукацца з дапамогай малекулярных маркераў. Такія падыходы мы распрацоўваем як у раслінаводстве, так і ў жывёлагадоўлі. Мы займаемся навуковым забеспячэннем Дзяржаўнай праграмы «Біятэхналогія» — «ДНК-тэхналогіі для сельскай гаспадаркі і аховы здароўя».

Святлана БАРЫСЕНКА.

НА ЗАМЕТКУ

Актыўна назапашваюць свінец наступныя гатункі пладоў тамата: Irka, Opus і Riposta. Надзвычай акумулююць кадмій Radek, Opus, S.a. mini. Іх не рэкамендуецца вырошчваць на тэрыторыях, забруджаных дадзенымі палютантамі. Мінімальнае назапашванне свінцу даюць гатункі Калінка, Ружа, Спрынт, мінімальнае назапашванне кадмію — Даходны, Талаліхін, Ружа.

Інфарм-укол

ПЯТРУШКА ДЛЯ СЭРЦА І СТРАЎНІКА

Пералічыць усе карысныя вартасці пятрушкі проста немагчыма. Паспрабуем назваць хоць бы асноўныя.

Гэта расліна багатая на эфірны алей, на вітаміны А, С, В1, В2, РР, К, мікраэлементы — калій, кальцый, фосфар, жалеза, магній, цынк і іншыя. Пятрушка ўтрымлівае багата хларафілу, які ўплывае на працэсы акіслення ў арганізме. Яе сок дапамагае падтрымліваць нармальнае функцыянаванне наднырачнікаў і шчытападобнай залозы, умацоўвае сасуды і капіляры. Ачышчае ныркі, пячонку, жаўцягонныя шляхі, выкарыстоўваецца як мачагонны сродак. Стымулюе вылучэнне стрававальных ферментаў. Пятрушку прымяняюць пры расстройствах страўніка, гастрытах з паніжанай кіслотнасцю. Акрамя таго, цуда-расліна спрыяе зажыўленню ранаў і апёкаў, лечыць запаленчыя хваробы дзяснаў.

НЕРВОВАЙ СІСТЭМЕ ПАДАБАЮЦЦА РАЗЫНКІ

Разынкі — не адзіная назва сушанага вінаграду. Калісьці вылучалі такія іх разнавіднасці, як кішміш, сабза, бдана, шыгані і інш. Усе яны вырабляюцца з розных гатункаў вінаграду.

Разынкі ўмацоўваюць нервовую сістэму, дзейнічаюць як заспакаяльны сродак. Гэта добры сродак супраць анеміі і агульнай слабасці, ліханманкі і

Тэлесеткі

Летапіс у метрах кінастужкі

У ліпені 2009 года споўніцца 65 гадоў з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Але канал АНТ пачынае рыхтавацца да гэтай даты загадзя — і з гэтага тыдня пачынае праект «Кінаметры вайны». Кожную нядзелю будуць паказвацца самыя вядомыя фільмы пра вайну, знятыя на «Беларусьфільме».

Праект уключае каля 50 мастацкіх фільмаў і дакументальных праграм пра іх стварэнне. У першай частцы цыкла, разлічанай на красавік і май, напрыклад, гледачам прапануюцца 7 карцін: «Альпійская балада», «Вянок санетаў», «Яшчэ пра вайну», «Я родам з дзяцінства», «Зімародак», «Знак бяды», «Чорная бяроза». Як расказалі ў прэс-службе АНТ, кожная карціна будзе суправаджацца аповедам відавочцаў і ўдзельнікаў здымак. Як рабіўся той ці іншы фільм, што засталося па-за кадрам, якімі былі ўзаемаадносіны акцёраў і рэжысёраў на здымачнай пляцоўцы — пра ўсё гэта распавядзе вядучы праекта «Кінаметры вайны», акцёр тэатра імя М. Горкага Іван Мацкевіч. Напрыклад, першы фільм цыкла — «Альпійская балада» (1965 г., рэжысёр Барыс Сцяпанаў) — папярэдзяць інтэрв'ю і ўспаміны аператара Анатоля Забалоцкага, сына акцёра Станіслава Любшына, актрысы Любові Румянцавай, якая, дарэчы, гэтаксама як аператар карціны, у 1966 годзе атрымала за гэты фільм узнагароду Саюза кінематаграфістаў СССР. Праўда, пакажуць нам карціну не ў нядзелю, а ў суботу — перанос адбудзецца з-за трансляцыі спаборніцтваў Кубка Дэвіса.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

МОДНАЯ ШКОЛЬНАЯ ФОРМА

Калекцыю школьнага адзення стварылі ў магілёўскай студыі моды «Авангард»

Студыя «Авангард» у Палацы дзіцячай творчасці ўжо 14 гадоў займаецца модай. Магілёўскія школьніцы шыюць, вяжуць і дэманструюць адзенне — моднае і арыгінальнае. Дзяўчаты называюць гэта стварэннем уласнага непаўторнага стылю.

Свой погляд на сучасную і модную школьную форму яны выказалі ў актуальнай калекцыі.

— Ну чаму дзеці павінны абавязкова хадзіць у чорным, шэрым і карычневым? — рытарычна пытаецца 13-гадовая Карына Сакалова. — Цёмныя колеры — гэта нават не падобна на сучасных дзяцей і школу. Мне сумна ад такой аднастайнасці. Хочацца нечым вылучыцца.

У калекцыі школьнай формы юных магіляўчанак — зусім не сумныя сілуэты. Сукенкі стрыманых зялёна-бэзавых таноў, але ўпрыгожаныя рукавамі-«ліхтарыкамі», карункавымі фальбонкамі і ўстаўкамі ў вясёленькія кветачкі. Касцюмы з натуральнай воўны прыемнага светлага колеру: спадніцы з разрэзамі, карсэты і шалікі. І да ўсяго гэтага дадаюцца гетры — вязаныя альбо пашытыя.

— Пад карсэт апранаецца кашуля, разрэзы абсалютна прыстойныя, і модныя гетры тут вельмі да месца, — тлумачаць дзяўчаты.

Аднак нягледзячы на поўную «палітка-рэктнасць» калекцыі, ніхто з маладых мадэльераў так і не вырашыўся апрануць ніводны касцюм з калецыі на ўрокі.

— Я баюся, што настаўнікі не зразумеюць мяне, — шчыра адказала за ўсіх Жэня Конева, вучаніца 8-га класа адной з магілёўскіх школ. — Таму што ўсе лічаць, што дзелавы стыль — гэта чорная спадніца і белая кашуля. Хоць дзецям гэта не пасуе.

— У нашай калекцыі атрымалася такая школьная форма, якая падабаецца самім дзяўчатам, — тлумачыць кіраўнік студыі «Авангард» Таццяна Харужэўская. — Мы паказвалі яе на фестывалях моды, яна была добра ўспрынята. Можа, і трэба было б паказаць яе школьным педагогам... Але пакуль гэтыя сукенкі і касцюмы дзяўчаты апранаюць у вольны ад школы час.

Частка калекцыі «Авангарда» — для малодшых школьнікаў. Гэта вязаныя касцюмы ў цёплых зялёных і жоўтых колерах, мяккі абутак са штучнага футра.

— Мне б хацелася, каб школьная форма была яскравых колераў, — прызнаецца вучаніца 2-га класа Маша Белавусава.

— Форма не павінна быць абавязкова цёмнай, — упэўнена вучаніца 9-га класа Таццяна Тарэлкіна. — Мне падаецца, што яны робяць чалавека змрочным, псуюць настрой. Добра, калі б дарослыя ўлічылі меркаванні дзяцей і стварылі калекцыі з прыгожых натуральных тканін, прыемных колераў. Тады б мы з радасцю яе апраналі.

Школьная форма з наступнага навучальнага года будзе абавязковая для ўсіх класаў. Прадпрыемствы рыхтуюць свае калекцыі адзення дзелавога стылю для дзяцей. Але калі школьнікі і іх бацькі не здолеюць знайсці ў беларускіх крамах школьны касцюм, які падабаўся б на сто працэнтаў, не трэба забывацца на шматлікія спосабы самастойна ўпрыгожыць форму, зрабіць масавы выраб больш індывідуальным.

— З любымі спадніцай, штанамі і жакетамі можна апрануць арыгінальную блузку любога колеру, з цікавымі гузікамі і фурнітурай, — раяць удзельніцы атэлье «Авангард». — І не абавязкова аднатонную: тут дапушчальныя клетка, палоскі, гарохі і кветкі. У кайстрах пакуль ніхто не абмяжоўвае школьніц, і таму можна набыць нешта моднае, сучаснае. Можна выкарыстоўваць аплікацыі са стразаў, апрануць прыгожы рэмень, прышпіліць да лацкана брошку.

— Наўрад ці за такія праявы індывідуальнасці ў школе будуць рабіць заўвагі, — спадзяюцца сёстры Насця і Юля Лянеўскія. — Адзенне павінна адпавядаць унутранаму свету чалавека. І нам, дзяўчатам, хочацца прыўнесці ў дзелавую школьную форму часцінку жаноцкасці і, безумоўна, сучаснай моды.

— Я жадаю ўсім дзецям ісці ў нагу з часам і не адставаць ад моды, нават у школьнай форме, — падсумоўвае Таццяна Харужэўская.

Ілона ІВАНОВА.

Модныя тэндэнцыі сёлетняй вясны ад магілёўскай студыі моды «Авангард»:

- Здымайце ўсё чорнае, шэрае і ўвогуле цёмнае. Актуальныя яскравыя колеры: жоўты, аранжавы, салатавы, зялёны. Яскравае адзенне — яскравы настрой.
- Нізкая пасадка спадніцаў і штаноў а-ля Брытні Спірс канчаткова сыходзіць з моды: састарэлыя мадэлі ў гардэробе трэба замяніць на новыя — з высокай таліяй.
- Аксесуары гэтага сезона — бранзалеты і пацеркі, самыя розныя.
- Трэба звярнуць увагу на кайстры вялікага памеру, з якімі зручна хадзіць і на школьныя ўрокі, і на пляж у час канікулаў.
- У кроі адзення модныя рукавы-«ліхтарыкі» і спадніцы-«балоны». Можна пашукаць у матчыным куфры: модныя два дзесяткі гадоў таму «балоны» сталі вінтажнымі. Па «ліхтарыкі» трэба звярнуцца да бабуляў.
- Галоўнае правіла модніцы: не проста «тупа» апранаць моднае, але перадусім тое, што сапраўды ўпрыгожыць.

ПЕРАЗВОН МЕДАЛЁЎ

У Маскве прайшла Міжнародная выстаўка прадуктаў харчавання, напояў і сыравіны для іх вытворчасці «Прадэкспа-2008», у якой удзельнічалі звыш дзвюх тысяч прадпрыемстваў з 59 краін свету. Дастойна на ёй выглядалі тавары Гомельскага лікёра-гарэлачнага завода. Бальзамы «Чорная каралева» і «Палессе» былі адзначаны адпаведна сярэбраным і бронзавым медалямі.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ФОРСМАЖОРНЫЯ МАНДАРЫНЫ

Ну проста супердабрачыннасць выказваюць у магазіне «Апельсін» (знаходзіцца на рагу Лагойскага тракта і вуліцы Кальцова) да сваіх пакупнікоў і асабліва — да людзей з нізкімі даходамі. Налятайце — мандарыны замежныя па 2550 рэ за кілаграм. Цана — ніжэйшая, чым на рынку, дзе яшчэ такую знойдзеш... Вітаміны...

Аднак не будзем замілоўвацца гэтай акцыяй: мандарыны-та — «з гнільцой». Дакладней — звонку як быццам і нічога, а ўнутры — павысушваныя. Словам — муміфікаваныя. Ці патрэбны каму гэтыя муміфікаваныя вітаміны? Наконт гэтага і было зададзена пытанне работнікам магазіна з гэткай прыгожай назвай «Апельсін».

Тут пагадзіліся: не патрэбны. А разам з тым паскардзіліся: навязвае гэтыя мандарыны прыватнае гандлёвае ўнітарнае прадпрыемства «Шыкар».

Тэлефануем у «Шыкар», трубку здымае Алена Віктараўна, якая тут жа пачынае тлумачыць: мандарыны — іспанскія; дарога — далёкая; судны, мытня, форс-мажор — вось вам і прычыны. Аднак самы важкі аргумент у прадстаўніцы ПТУП «Шыкар» наступны: дык затое ж — танныя, уцэненыя... Застаецца на гэта сказаць: «гнілы» тавар нікому не патрэбны, няхай ён нават будзе зусім бясплатны, пра што ў «Шыкары» і ў тым жа магазіне «Апельсін», напэўна, самі няблага ведаюць, ці, ва ўсякім разе, здагадваюцца. Калі ўжо зрабілі тую ж уцэнку. І ўпіхваць гэты тавар спажыўцу — значыць зусім не паважаць яго, увогуле — яўна аблапошваць. Спажывец жа не можа ўбачыць, што там знаходзіцца ўнутры гэтага замежнага мандарынавага цуду, за знешне прыстойнай абалонкай.

У Галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама поўнасцю пагадзіліся, што ўсё гэта з'яўляецца прамым падманам спажыўца. Ва ўпраўленні пры гэтым далі мудрую параду: няхай бы ў магазіне побач з цаной павесілі прыпіску наступнага зместу — мандарыны танныя, але дрэнныя. Словам, выдайце спажыўцу ўсю інфармацыю, чаго, дарэчы, патрабуе і закон аб абароне яго правоў. У Галоўным упраўленні падкрэслілі: няхай не дураць людзей, у любым выпадку тавар павінен быць якасным; гэта — асноўнае патрабаванне і да тавару, і да тых, хто яго прадае.

Аднак ужо іншае пытанне: хто будзе кантраляваць, бо любы ж форс-мажор многія прадстаўнікі нашага яшчэ зусім слабацывілізаванага гандлю, вядома ж, будуць імкнуцца павесіць на кішэню спажыўца?

Тут жа прыгадаем: раней у сістэме гандлю была спецыяльная гандлёвая інспекцыя, якую, аднак, па зусім невядомых прычынах ліквідавалі. Няйначай, палічылі, што час цывілізацыі ўжо надышоў, з'явілася маса гандлёвых суб'ектаў, канкурэнцыя... Карацей кажучы, ранейшага самага шчырага абаронцы спажыўца ўжо няма. Але ж ёсць адпаведны закон, які ўжо называўся, ёсць спецыяльныя таварыствы па абароне правоў спажыўца, ёсць стандарты, сертыфікаты... Шчыра прызнаем: усё гэта пакуль што слаба працуе, хоць варта пры гэтым прызнаць пэўны ўклад ва ўсю адпаведную справу тых жа таварыстваў. За ўсім гэтым неяк не адчуваецца ўладнай дзяржаўнай рукі. Мы яўна не дасягнулі таго ўзроўню грамадскіх адносінаў, каб любы факт падману спажыўца (няхай гэта будзе ўсукванне яму няякаснага, пратэрмінаванага тавару і г.д.) разглядаўся як надзвычайнае здарэнне. Што, дарэчы, добра пацвярджае і тое, што ва ўжо ўказаным магазіне «Апельсін» (і яшчэ ў адным «Апельсіне» па вуліцы ж Кальцова) і ў наступныя дні спакойна гандлявалі сваімі муміфікаванымі мандарынамі (так было на час падрыхтоўкі гэтых нататкаў). Дарэчы, а што вымушае сам магазін прымаць няякасны тавар (нагадаем: у ім паскардзіліся на тое, што такі тавар яму навязваюць)? Аказваецца, паміж ім і ПТУП «Шыкар» існуюць нейкія асобныя дагаворныя адносіны. Што гэта за адносіны — невядома, ды мы і не імкнуліся пра гэта дазнацца; але падобная «дагаворанасць», як ужо зразумела, яўна не на карысць спажыўцу. І ці не выказвае яна сябе часам і ў некаторых іншых выпадках? Зноў-такі пытанне: хто па-сапраўднаму пракантралюе? І па-сапраўднаму абароніць?

Іван БАРАНОЎСКІ.

Кватэрнае пытанне

Калі дом і праўда стары...

Мы, маладая сям'я (двое дзяцей) жывём у непрыватызаванай двухпакаёўцы. Забяспечанасць жыллём складае менш як 15 кв. метраў на аднаго чалавека. Але на кватэрны ўлік нас не бяруць, бо жонцы ў спадчыну дастаўся стары, трухлявы дом у нашым горадзе. Ці правільна робіць выканкам, адмаўляючы нашай сям'і ў пастаноўцы на кватэрны ўлік?

Л. Берташ.

Паводле агульнага правіла, згодна з Палажэннем, зацверджаным Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29.11.2005 г. № 565, на кватэрны ўлік прымаюцца грамадзяне, забяспечанасць якіх агульнай плошчай жылога памяшкання, дзе яны пражываюць, на аднаго чалавека сям'і складае менш як 15 кв. метраў.

Пры гэтым у адпаведнасці з падпунктам 3.1.2 Палажэння забяспечанасць агульнай плошчай вызначаецца зыходзячы з сумы агульнай плошчы ўсіх жылых памяшканняў, якія знаходзяцца ў дадзеным населеным пункце ва ўласнасці або ў карыстанні грамадзяніна і членаў яго сям'і, з якімі ён прымаецца на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Акрамя таго, пунктам 4 Палажэння ўстаноўлена, што грамадзяне, якія маюць ва ўласнасці ў дадзеным населеным пункце жылыя памяшканні, у якіх яны не пражываюць, не могуць быць прызнаны маючымі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, за выключэннем выпадкаў, калі пры ўсяленні ў гэтыя жылыя памяшканні яны стануць маючымі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Таму, калі ў суме агульная плошча ў сям'і перавышае 60 кв. метраў, то выканкам мае права адмовіць у пастаноўцы гэтай сям'і на кватэрны ўлік.

Разам з тым пры разглядзе дадзенага пытання неабходна мець на ўвазе, што адной з падстаў для прыняцця на ўлік (незалежна ад узроўню забяспечанасці агульнай плошчай) з'яўляецца пражыванне ў жылым памяшканні, якое прызнана не адпавядаючым санітарным і тэхнічным патрабаванням, што прад'яўляюцца да жылых памяшканняў (падпункт 3.1.3 Палажэння). Таму, калі (як гэта ўказана ў пісьме) дом, атрыманы ў спадчыну, з'яўляецца трухлявым, то ён можа быць ва ўстаноўленым парадку прызнаны не адпавядаючым установленым санітарным і тэхнічным патрабаванням. У гэтым выпадку адпаведнае рашэнне выканкама павінна прыкладацца да заявы аб прыняцці сям'і на кватэрны ўлік.

Віктар САВІЦКІ.

Паритетбанк

ОАО «Паритетбанк» г. Минск, ул. Гамарника 9/4

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2008 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2007 г.	2006 г.
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101	1	4 945,7	1 478,4
3	Средства в Национальном банке	1102	2	3 792,2	3 021,4
4	Ценные бумаги:	1103		36 136,6	53 266,3
	для торговли	11031	3	—	—
	удерживаемые до погашения	11032	3,1	—	—
	в наличии для продажи	11033	3,2	36 136,6	53 266,3
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	4	4 925,1	7 804,2
6	Кредиты клиентам	1106	5	138 360,9	46 756,3
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	6	—	—
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	7	14 389,9	13 682,0
9	Прочие активы	1109	8	4 020,3	2 846,0
10	ИТОГО активы	110		206 570,7	128 854,6
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
12	Средства Национального банка	1202	9	30 000,0	46 012,9
13	Кредиты и другие средства банков	1205	10	22 516,9	11 333,3
14	Средства клиентов	1206	11	41 064,2	21 122,1
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208		5 148,6	964,7
16	Прочие обязательства	1209	12	1 426,2	1 419,0
17	ВСЕГО обязательства	120		100 155,9	80 852,0
18	**КАПИТАЛ**				
19	Уставный фонд	1211	13	93 368,4	43 368,4
20	Эмиссионный доход	1212		—	—
21	Резервный фонд	1213		267,3	87,3
22	Накопленная прибыль	1214	14	8 603,3	1 799,7
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	15	4 175,8	2 747,2
24	ВСЕГО капитал	121		106 414,8	48 002,6
25	ИТОГО обязательства и капитал	12		206 570,7	128 854,6
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**				
27	Требования	1301	16	89 751,8	32 151,4
28	Обязательства	1302	17	17 330,8	10 343,5

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 января 2008 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2007 г.	2006 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		22 064,0	13 099,6
2	Процентные расходы	2012		3 551,5	3 175,7
3	Чистые процентные доходы	201	18	18 512,5	9 923,9
4	Комиссионные доходы	2021		2 805,0	1 811,6
5	Комиссионные расходы	2022		133,1	153,7
6	Чистые комиссионные доходы	202	19	2 671,9	1 657,9
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	20	899,5	832,4
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	21	36,5	(-6,4)
9	Доход в форме дивидендов	205		—	—
10	Чистые отчисления в резервы	206	22	2 603,7	3 852,3
11	Прочие доходы	207	23	711,4	1 201,9
12	Операционные расходы	208	24	11 586,3	7 499,7
13	Прочие расходы	209	25	624,6	401,1
14	Налог на прибыль	210		1 027,4	56,9
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		6 989,8	1 799,7
	Базовая прибыль на простую акцию			—	—
	Разводненная прибыль на простую акцию			—	—

ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИЯХ В КАПИТАЛЕ за 2007 год

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статей капитала / Наименование показателей	Символ	Уставный фонд	Эмиссионные разницы	Резервный фонд	Накопленная прибыль	Фонд переоценки статей баланса	Всего капитал (сумма граф 3-7)
1	2	3	4	5	6	7	8	9
1	**Раздел I. За год, предшествующий отчетному**							
2	Остаток на 1 января 2006 г.	3011	43 368,4	0,0	43,6	43,7	1 343,3	44 799,0
3	Изменения статей капитала, в том числе:	3012	0,0	0,0	43,7	1 756,0	1 403,9	3 203,6
3.1	прибыль (убыток со знаком «минус»)	30121	X	X	X	1 799,7	X	1 799,7
3.2	направление прибыли на пополнение фондов	30122	0,0	X	43,7	-43,7	X	0,0
3.3	операции с учредителями (участниками):	30123			X		X	0,0
3.3.1	внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников)	301231			X	X	X	0,0
3.3.2	выплата дивидендов акционерам	301232	X	X	X		X	0,0
3.3.3	операции с собственными выкупленными акциями	301233		X	X	X	X	0,0
3.4	проведение переоценки статей баланса	30124	X	X	X	X	1 403,9	1 403,9
3.5	перераспределение между статьями капитала	30125	0,0	0,0	0,0	0,0	0,0	0,0
3.6	прочие изменения	30126	0,0	0,0	0,0	0,0	0,0	0,0
4	Остаток на 1 января 2007 г.	3013	43 368,4	0,0	87,3	1 799,7	2 747,2	48 002,6
5	**Раздел II. За отчетный год**							
6	Остаток на 1 января 2007 г.	3011	43 368,4	0,0	87,3	1 799,7	2 747,2	48 002,6
7	Изменения статей капитала, в том числе:	3012	50 000,0	0,0	180,0	6 803,6	1 428,6	58 412,2
7.1	прибыль (убыток со знаком «минус»)	30121	X	X	X	6 989,8	X	6 989,8
7.2	направление прибыли на пополнение фондов	30122	0,0	X	180,0	-180,0	X	0,0
7.3	операции с учредителями (участниками):	30123	50 000,0	0,0	X	-6,2	X	49 993,8
7.3.1	внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников)	301231	50 000,0	0,0	X	X	X	50 000,0
7.3.2	выплата дивидендов акционерам	301232	X	X	X	-6,2	X	-6,2
7.3.3	операции с собственными выкупленными акциями	301233	0,0	X	X	X	X	0,0
7.4	проведение переоценки статей баланса	30124	X	X	X	X	1 428,6	1 428,6
7.5	перераспределение между статьями капитала	30125	0,0	0,0	0,0	0,0	0,0	0,0
7.6	прочие изменения	30126	0,0	0,0	0,0	0,0	0,0	0,0
8	Остаток на 1 января 2008 г.	3013	93 368,4	0,0	267,3	8 603,3	4 175,8	106 414,8

ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ на 1 января 2008 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2007 г.	2006 г.
1	2	3	4	5	6
1	**ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ**				
2	Полученные процентные доходы	7010		22 043,3	13 098,2
3	Уплаченные процентные расходы	7011		(-3 473,0)	(-3 164,8)
4	Полученные комиссионные доходы	7012		2 804,3	1 809,4
5	Уплаченные комиссионные расходы	7013		(-134,3)	(-151,4)
6	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	7014		895,6	1 043,8
7	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	7015		36,5	(-6,4)
8	Доход в форме дивидендов	7016		—	—
9	Прочие полученные доходы	7017		682,8	804,5
10	Прочие уплаченные расходы	7018		(-11 396,7)	(-7 024,6)
11	Уплаченный налог на прибыль	7019		(-1 108,0)	(-56,9)
12	Итого денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и обязательствах	701		10 350,5	6 351,8
13	Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке	7020		1 446,5	(-2 171,2)
14	Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения)	7021		16 228,5	(-43 358,3)
15	Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов и других денежных средств в банках	7022		4 431,8	(-4 108,8)
16	Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам	7023		(-92 934,3)	(-4 431,6)
17	Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах	7025		(-1 033,2)	17 683,4
18	Итого потоки денежных средств от изменения операционных активов	702		(-71 860,7)	(-36 386,5)
19	Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка	7030		(-16 000,0)	(-9 000,0)
20	Чистый прирост (снижение) денежных средств в форме кредитов и других средств банков	7032		11 484,5	(-6 424,7)
21	Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов	7033		19 535,3	9 502,8
22	Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком	7034		3 442,2	(-302,4)
23	Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах	7035		(-893,0)	(-18 589,7)
24	Итого потоки денежных средств от изменения операционных обязательств	703		17 569,0	(-24 814,0)
25	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности	70		(-43 941,2)	(-54 848,7)
26	**ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ**				
27	Приобретение основных средств, нематериальных и других долгосрочных активов	7110		(-2 676,9)	(-3 252,8)
28	Продажа основных средств, нематериальных и других долгосрочных активов	7111		13,0	247,4
29	Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц	7112		—	—
30	Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц	7113		—	—
31	Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения	7114		—	(-11 435,7)
32	Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения	7115		—	73 679,7
33	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности	71		(-2 663,9)	59 238,6
34	**ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ**				
35	Эмиссия акций	7211		50 000,0	—
36	Выкуп собственных акций	7212		—	—
37	Продажа ранее выкупленных собственных акций	7213		—	—
38	Выплата дивидендов	7214		—	—
39	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности	72		50 000,0	—
40	Влияние изменений официального курса на денежные средства и их эквиваленты	73		55,2	47,3
41	Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов	74		3 450,1	4 437,2
42	Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода	740	1	x	1 798,9
43	Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода	741	1	7 965,1	x

Председатель Правления **С.Л. Панковец**

Главный бухгалтер **М.М. Абраменко**

Дата подписания 10 марта 2008 г.

Аудиторское общество с ограниченной ответственностью

220012, г. Минск
пер. Калининградский, 16
тел./факс 280 35 39
e-mail: auditel@mail.ru

АУДИТЭЛ

р/с 3012007218011
в «Приорбанк» ОАО
ЦБУ 100 г. Минск, код 749
УНП 100591487

№ 39
12 марта 2008 г.

Председателю Правления
ОАО «Паритетбанк» Панковцу С.Л.

АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ
по годовому отчету ОАО «Паритетбанк» за 2007 г.

Мы провели аудит прилагаемого годового отчета Открытого акционерного общества ОАО «Паритетбанк» (220090, г. Минск, ул. Гамарника, д. 9, корп. 4; зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 2 июля 1992 года № 5, УНП 100233809) за период с 1 января по 31 декабря 2007 г. включительно.

Годовой отчет ОАО «Паритетбанк» состоит из:
бухгалтерского баланса;
отчета о прибыли и убытках;
отчета об изменении капитала;
отчета о движении денежных средств;
примечаний, учетной политики и пояснительной записки к годовому отчету.

Ответственность за подготовку и представление названной бухгалтерской (финансовой) отчетности несет руководство ОАО «Паритетбанк». Наша обязанность заключалась в том, чтобы на основе проведенного аудита выразить мнение о достоверности данной отчетности во всех существенных отношениях.

Мы провели аудит в соответствии с:
— Законом Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности» от 08.11.1994 № 3373-XII (с учетом изменений и дополнений);
— Указом Президента Республики Беларусь от 12.02.2004 № 67 «О совершенствовании государственного регулирования аудиторской деятельности»;
— Правилами аудиторской деятельности, утвержденными Министерством финансов Республики Беларусь;
— Правилами лицензирования и осуществления аудиторской деятельности в банковской системе Республики Беларусь, утвержденными Национальным банком Республики Беларусь 02.07.2003 № 129 (с учетом изменений и дополнений);
— Правилами аудиторской деятельности АООО «Аудитэл».

Аудит планировался и проводился таким образом, чтобы получить достаточную уверенность в том, что бухгалтерская (финансовая) отчетность не содержит существенных искажений. Аудит проводился на выборочной основе и включал в себя изучение доказательств, подтверждающих значение и раскрытие в бухгалтерской (финансовой) отчетности информации о финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Паритетбанк», оценку принципов и методов бухгалтерского учета, порядка подготовки бухгалтерской (финансовой) отчетности, определение и анализ существенных оценочных значений, применяемых ОАО «Паритетбанк».

Мы полагаем, что проведенный аудит дает достаточные основания для выражения аудиторского мнения о достоверности во всех существенных отношениях бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАО «Паритетбанк».

По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность ОАО «Паритетбанк» отражает достоверно во всех существенных отношениях его финансовое положение на 1 января 2008 г. и результаты финансово-хозяйственной деятельности за 2007 г.

Проверенный годовой отчет соответствует требованиям законодательства Республики Беларусь. Достоверность форм годового отчета подтверждена во всех существенных аспектах.

Директор АООО «Аудитэл» **А.И. Папковский**

Руководитель аудиторской проверки **С.С. Шмарловская**

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национальным банком Республики Беларусь от 27.10.2006 г. № 5.

	Форма № 2 по ОКУД	5025501		
	Дата (год, месяц, число)	2008	01	01
Организация: *ОАО «Мостотряд № 88»*	по ОКЮЛП	100299744		
Учетный номер плательщика	*УНП*	*100299744*		
Вид деятельности: *строительство*	по ОКЭД	45000		
Организационно-правовая форма: *ОАО*	по ОКОПФ	1131	300	
Орган управления: *департамент «Белавтодор»*	по СООУ			
Единицы измерения: *млн. руб.*	по ОКЕИ	408		
Адрес: *220075 г. Минск, ул. Промышленная, 16*				

Бухгалтерский баланс с 1 января 2007 г. по 31 декабря 2007 г.

АКТИВ	Код стр.	На начало отчетного года	На конец отчетного года
1	2	3	4
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	2569	2785
Нематериальные активы	120	1	
Доходные вложения в материальные ценности	130		
Вложения во внеоборотные активы	140		
в том числе: незавершенное строительство	141		
Прочие внеоборотные активы	150		
ИТОГО по разделу I	190	2570	2785
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	737	605
в том числе: сырье, материалы и другие активы	211	528	565
животные на выращивании и откорме	212		
незавершенное производство и полуфабрикаты	213	74	32
расходы на реализацию	214		
готовая продукция и товары для реализации	215		
товары отгруженные	216	130	
выполненные этапы по незавершенным работам	217		
расходы будущих периодов	218	5	8
прочие запасы и затраты	219		
налоги по приобретенным активам	220	49	26
Дебиторская задолженность	230	333	920
в том числе: покупателей и заказчиков	231	220	843
поставщиков и подрядчиков	232	19	37
разных дебиторов	233	30	38
прочая дебиторская задолженность	234	64	2
Расходы с учредителями	240		
в том числе: по вкладам в уставный фонд	241		
прочие	242		
Денежные средства	250	331	211
в том числе: денежные средства на депозитных счетах	251		
Финансовые вложения	260		
Прочие оборотные активы	270		
ИТОГО по разделу II	290	1450	1762
БАЛАНС	300	4020	4547

ПАССИВ	Код стр.	На начало отчетного года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	63	63
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей)	411		
Резервный фонд	420	22	121
в том числе: резервы, созданные в соответствии с законодательством	421	22	121
резервы, созданные в соответствии с учредительными документами	422		
Добавочный фонд	430	3175	3563
Прибыль (убыток) отчетного периода	440		x
Распределенная прибыль (непокрытый убыток)	450	105	105
Целевое финансирование	460		
Доходы будущих периодов	470		
ИТОГО по разделу III	490	3365	3852
IV. ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510		
Краткосрочные кредиты и займы	520		
Кредиторская задолженность	530	655	683
в том числе: перед поставщиками и подрядчиками	531	411	249
перед покупателями и заказчиками	532	139	21
по оплате труда	533	66	74
по расчетам с персоналом	534		
по налогам и сборам	535	21	321
по социальному страхованию и обеспечению	536	16	15
разных кредиторов	537	2	3
прочая кредиторская задолженность	538		
Задолженность перед учредителями	540		12
в том числе: по выплате доходов, дивидендов	541		12
прочая	542		
Резервы предстоящих расходов	550		
Прочие виды обязательств	560		
ИТОГО по разделу IV	590	655	695
БАЛАНС	600	4020	4547
Справочно (из стр. 530) Долгосрочная кредиторская задолженность	601	197	135
Краткосрочная кредиторская задолженность	602	458	548

Отчет о прибылях и убытках с 1 января 2007 г. по 31 декабря 2007 г.

Наименование показателя	Код стр.	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
1	2	3	4
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	6408	5994
Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	1076	1067
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку)	020	5332	4927
Справочно: Из строки 010 сумма государственной помощи на покрытие разницы в ценах и тарифах	021		
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	5451	5194
Управленческие расходы	040		
Расходы на реализацию	050		
Прибыль (убыток) от реализации (020-030-040-050)	060	-119	-267
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы	070	1123	270
Налоги, включаемые в операционные доходы	071	180	43
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы)	080	943	227
в том числе: от сдачи активов в аренду, лизинг, временное пользование	081	277	94
от выбытия основных средств и нематериальных активов	082	104	13
прочие операционные доходы	083	562	120
Операционные расходы	090	504	293
в том числе: от сдачи активов в аренду, лизинг, временное пользование	091		184
от выбытия основных средств и нематериальных активов	092	30	
прочие операционные расходы	093	474	109
Прибыль (убыток) от совместной деятельности	100		
Доходы (потери) от участия в уставных фондах других организаций	110		
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов (080-090+/-100+/-110)	120	439	-66
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	130	174	232
Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы	131	23	
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы)	140	151	232
в том числе: от списания кредиторской задолженности	141	1	
курсовые и суммовые разницы	142	1	
безвозмездно полученные активы (включая денежные средства и суммы государственной помощи)	143		
прочие внереализационные доходы	144	149	232
Внереализационные расходы	150	105	56
в том числе: от списания дебиторской задолженности	151		
курсовые и суммовые разницы	152		
безвозмездно переданные активы (включая денежные средства)	153	1	
прочие внереализационные расходы	154	100	56
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (140-150)	160	46	176
Прибыль (убыток) (060+/-120+/-160)	200	366	-157
Налоги, сборы и платежи из прибыли	210	153	36
Прочие расходы и платежи их прибыли	220	3	
Чистая прибыль (убыток) (200-210-220)	240	210	-193
Справочно (из строки 240)			
сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль	250		
количество организаций	260	1/210	
сумма полученной прибыли			
количество организаций	270		1/193
сумма полученного ими убытка			

Активы и обязательства, учитываемые за балансом	Код стр.	На начало отчетного года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
Арендованные (в том числе полученные в пользование, лизинг) основные средства	001		
Товарно-материальные ценности, принятые на ответственное хранение	002		
Материалы, принятые в переработку	003		
Товары, принятые на комиссию	004		
Оборудование, принятое для монтажа	005		
Бланки строгой отчетности	006		
Списанная в убыток задолженность неплатежеспособных дебиторов	007		4
Обеспечения обязательств и платежей полученные	008		
Обеспечения обязательств и платежей выданные	009		
Амортизационный фонд воспроизводства основных средств	010	749	884
Основные средства, сданные в аренду (лизинг)	011		
Нематериальные активы, полученные в пользование	012		
Амортизационный фонд воспроизводства нематериальных активов	013	1	1
Потеря стоимости основных средств	014	6	6

Руководитель С.И. Буринский
Главный бухгалтер И.А. Дьячкова

Людзі-легенды

ЗАЛАТАЯ З АЛМАЗАМІ ШПАГА ГЕНЕРАЛА ГУРКІ

Узнікла пагроза ўвогуле страты для Беларусі гераічнай спадчыны яе ўраджэнца

У яго гонар названа адна з цэнтральных вуліц Сафіі, у Балгарыі яго паважаюць і стары, і малады, а на радзіме яго прозвішча вядомае, на жаль, у асноўным гісторыкам, даследчыкам даўніны ды краязнаўцам. Сумна, але факт — у нас беспадстаўна амаль забыты, бадай, галоўны герой руска-турэцкай вайны 1877—1878 гадоў, наш суайчыннік генерал-фельдмаршал Іосіф Уладзіміравіч Гурка.

Цікавая рэч: чым глыбей я знаёміўся з ваеннай біяграфіяй генерала Гуркі, тым больш здзіўляўся — чаму яшчэ такі надзвычай цікавы, арыгінальны і каларытны гістарычны персанаж не знайшоў дастойнага адлюстравання ў літаратуры і кінематографе. Багаты фактычны матэрыял даваў шырокі прасцяг для «раскруткі» бурнага і захапляльнага сюжэта бестселера ці блокбастара.

...Усю Еўропу ўскалыхнулі звесткі аб крывавай масавай разні туркамі ўдзельнікаў Красавіцкага паўстання 1876 года ў Балгарыі, калі ад зброі асманскіх карнікаў загінулі тысячы чалавек. Сумленныя і гарачыя расійскія маладыя афіцэры ірваліся вызваляць братоў-славян. Сярод іх быў і Гурка.

Ужо першая значная самастойная баявая аперацыя Гуркі прынесла яму вядомасць у краіне і аўтарытэт у войсках. Пад яго камандаваннем 12-тысячны Перадавы (Паўднёвы) атрад рускіх сілаў з поспехам выканаў вельмі складаную задачу — «авалодаць балканскімі праходамі». Імклівы штурм і рашучае авалоданне старажытнай сталіцай Балгарыі Тырнава, а затым не менш імклівы, літаральна за некалькі дзён захоп стратэгічна важнага перавала праз Балканы, заняцце Казанлыка і Шыпкі выклікала паніку ў Канстанцінопалі.

На полі бою, па назіраннях сведкаў, малады военачальнік дзейнічаў цвяроза, мужна і часам нестандартна. Ён за Малымі Балканамі ўступіў у бой з утрая пераўзыходзячымі сіламі туркаў і атрымаў шэраг важных перамог. За бліскучую аперацыю Гурку было прысуджана званне генерал-ад'ютанта.

Ён быў з тых камандзіраў, якія мелі і не баяліся выказваць свой пункт погляду насуперак меркаванню начальства. Так, Гурка здолеў пераканаць генерала Тотлебена, які ўзначальваў асаду Плеўны, правесці ў раёне Сафійскай шашы (па гэтым шляху ішло забеспячэнне заселых у горадзе туркаў боепрыпасамі, харчаваннем і жывой сілай) шэраг нечаканых для ворага аперацый. У выніку Плеўна трапіла ў поўнае акружэнне рускімі войскамі. За гэту баявую паслугу Гурка атрымаў сапраўды царскі падарунак — упрыгожаную алмазамі залатую шпагу. На вайне раскрыўся палкаводчы талент нашага земляка. Калі яго вельмі смелая задума зімовага пераходу праз Балканы была адвергнутая штабам рускай арміі (там палічылі гэта небяспечнай і нават пагібельнай авантурай), то ён праз галаву вышэйстаячых генералаў напрамую звяртаецца да Аляксандра II. Той адобрыў рызыкоўны план Гуркі. І вось 13 снежня 70-тысячны Заходні атрад рускіх салдат і балгарскіх апалчэнцаў рушыў праз Балканы. Цяжкія гарматы і амуніцыю даводзілася цягнуць на сабе па зледзянелых горных сцежках, начаваць ля вогнішчаў, недаядаць... За гэту непахісную настойлівасць і веру ў перамогу салдаты празвалі Гурку генералам «Уперад». Праз 8 дзён яго атрад спусціўся ў Сафійскую даліну. Туркі не былі гатовыя да такога сюрпрызу. Пасля ўпартых баёў 23 снежня была вызвалена Сафія. Такім чынам быў вырашаны выхад руска-турэцкай вайны. А неўзабаве быў падпісаны вядомы Сан-Стэфанскі мірны дагавор на выгадных для Расіі ўмовах. У лісце імператару на прадстаўленне Гуркі да высокай узнагароды і звання генерала ад інфантэрыі былі, у прыватнасці, такія пафасныя словы: «... за асабістыя баявыя паслугі і цэлы шэраг бліскучых подзвігаў».

У мірны час яго папулярнасць і прызнанне ў грамадстве былі адэкватнымі ўкладу ў вызваленне народаў Балкан ад асманскага іга. Асобныя гісторыкі нават называлі яго «пераможцам руска-турэцкай вайны 1877—1878 гадоў». Пра генерала хадзілі розныя легенды, яго выказванні расцягнулі на цытаты. Напрыклад, аб тым, што бой не з'яўляецца нічым асаблівым. Гэта тое ж самае, што і на вучэннях з баявымі патронамі, толькі трэба больш вытрымкі і парадку. Сучаснікі Гуркі, асабліва ў арміі, успомнілі і потым часта цытавалі яго фразу: «Жыць з кавалерыяй, а памяраць з пяхотай». Яшчэ перад турэцкай кампаніяй малады афіцэр імкнуўся на Крымскую вайну 1853—1856 гадоў. Трапіць туды можна было адзіным шляхам — добраахвотна перайсці з элітнай гвардыі ў звычайную пяхоту. Крок па тым часе ў сэнсе кар'еры і становішча ў грамадстве быў, мякка кажучы, не вельмі разумным. Аднак ротмістр гвардыі Гурка перавёўся ў Чарнігаўскі полк у чыне маёра. Праўда, паваяваць у Крыме яму не давялося — скончылася вайна. Назад у гвардыю яго прынялі ахвотна.

Ён кар'еру рабіў на полі бою, не любіў закулісных інтрыг, быў прамалінейным у выказваннях і меркаваннях, меў дакладныя ўяўленні аб гонары афіцэра. Аднойчы яшчэ перад руска-турэцкай вайной сумнавядомае Трэццяе жандармскае аддзяленне (палітычная паліцыя, якая вышуквала іншадумцаў і крытыкаў царскай улады) спрабавала зрабіць з яго тайнага інфарматара. Абураны Іосіф Уладзіміравіч публічна заявіў, што ён хутчэй пойдзе ў адстаўку, чым пагодзіцца на прапанову. Нездарма А. Герцэн у сваім знакамітым «Колоколе» даў такую адзнаку гэтаму ўчынку: «Аксельбанты флигель-адъютанта Гуркі — символ доблести и чести».

Яго біяграфія магла б стаць асновай для захапляльнага бестселера ці востраскжэтнага блокбастара.

Герцэну, відаць, ён спадабаўся і тым, што нярэдка па ваенных пытаннях уступаў у вострыя дыскусіі з Аляксандрам II, Аляксандрам III і апошнім царом Мікалаем II, Вялікімі князямі, іх блізкім колам, як бы сёння сказалі. Вядома, гэта негатыўна адбівалася на кар'еры, а здаралася, генерала ўвогуле адпраўлялі ў адстаўку — часова, бо яго вопыт і талент потым былі зноў запатрабаваныя.

Чаму ж мы тады забылі Гурку? Яго магутная і харызматычная постаць славутага царскага генерала-пераможцы і рэпутацыя высакароднага дваранина зусім не ўпісвалася ў класавую ідэалогію бальшавікоў. У 1925 ці 1928 годзе (дакладных звестак не знайшоў) сямейны склеп Гурак у Саха-раве разбурылі, астанкі героя і колішняга любімца Расіі тайна перазахавалі. Хоць у савецкіх ваенных акадэміях чырвоныя камандзіры старанна вывучалі баявыя аперацыі генерала Гуркі.

Сёння ў Расіі паступова ўсё часцей звяртаюцца да станоўчага гераічнага мінулага часоў імперыі. Яшчэ ў СССР кнігі Валянціна Пікуля выклікалі вялікую цікаўнасць у шырокіх чытацкіх колах да падзей руска-турэцкай кампаніі. А недасведчаны чытач можа ўвогуле паверыць, што згодна з сюжэтам папулярнага рамана Барыса Акуніна «Турэцкі гамбіт» і яго наступнай экранізацыі, дапамог абвесці вакол пальца хітрага і каварнага Сулейман-пашу самародак і спецыяліст па разблытванні тайных аперацый ворагаў імперыі Эраст Фандорын. І такім чынам унёс вырашальны ўклад у разгром туркаў на вайне 1877—1878 гадоў.

У Расіі Гурку даўно запісалі выключна ў свае нацыянальныя героі. У час работы над гэтай публікацыяй я сутыкнуўся ў асобных расійскіх крыніцах з грубымі скажэннямі фактаў біяграфіі праслаўленага генерала. Напрыклад, адны пішуць, што Гурка нарадзіўся ў Ноўгарадзе, іншыя — што ён быў польскім дваранінам, які перайшоў на службу цару. Многія «даследчыкі» залічылі яго ў чыстыя «русакі». А старшыня так званага расійскага фонду «Сувязь пакаленняў» Сяргей Машын публічна агучыў, відаць, ім жа і прыдуманую цытату Гуркі: «Айчына мая — Расія, радзіма мая — цвярская зямля, а сэрца і любоў мая — Балгарыя». Сумніўна прыгожая і напышлівая штучная фраза, бо згодна з сучаснікамі Гуркі, той у выказваннях быў «прамы, як штык».

Адкуль тады ўзялася «цвярская зямля»? Пасля выхаду на пенсію ў чыне генерал-фельдмаршала Іосіф Уладзіміравіч пасяліўся ў маёнтку ля вёскі Сахарава Цвярской губерні. Там і памёр у 1901 годзе. Гэты факт наўмысна ці па няведанні блытаецца з месцам нараджэння славутага генерала. Ужо цвярскія школьнікі пішуць сачыненні на зададзеную тэму пра свайго знакамітага ўраджэнца, шчыра захапляюцца яго подзвігамі дзеля свабоды братоў-славян.

Сёлета ў Расіі ідзе падрыхтоўка да 180-годдзя з дня нараджэння легендарнага генерала, юбілей мяркуецца адзначыць у ліпені. І будзьце ўпэўненыя, зробяць расіяне гэта на салідным узроўні. Як летась у верасні ўрачыста адзначылі ў Цвярской вобласці 130-годдзе вызвалення Вялікага Тырнава салдатамі Перадавога атрада пад камандаваннем Гуркі. У Сахарава прыехала шмат гасцей, у тым ліку і сваякі Іосіфа Уладзіміравіча, дэлегацыя з Балгарыі. Быў закладзены камень на месцы будучага помніка генералу, у мясцовым храме святога Іосіфа Валоцкага адкрылася музейная экспазіцыя пра Гурку. Частку экспанатаў даслалі ўдзячныя балгары. У час урачыстасцяў на плошчы імя генерала Гуркі ўручалі медалі Іосіфа Гуркі лепшым курсантам ваенных вучылішчаў вобласці, а таксама архіепіскапу Цвярскому і Кашынскаму Віктару. Работа па ўвекавечванні імя нашага земляка ідзе з удзелам супрацоўнікаў інстытута славянознаўства Расійскай акадэміі навук нядаўна створанага Цвярскога фонду генерал-фельдмаршала Гуркі. Апошні нават інцыяваў пошукі астанкаў генерала з дапамогай унікальнага абсталявання — робата-разведчыка з нейкім там геалакатарам. Да спраў па ўвекавечванні памяці таленавітага военачальніка-вызваліцеля падключыліся балгары. Улады горада Вяліка-Тырнава (пабраціма Цверы) разам з фондам заснавалі стыпендыю «имени Иосифа Гурко» лепшаму курсанту першага курса Цвярскога суворaўскага вучылішча — 500 рублёў штомесяц. Так што шырока невядомы Гурка толькі ў нас.

Дзякуй расіянам за памяць аб іх «прославленном русском полководце Иосифе Гурко» і адначасова нашым несправядліва забытым земляку. Толькі вось не хочацца аддаваць ім поўнасцю правы на воінскую спадчыну Гуркі. Ён усё ж беларус.

— Іосіф Уладзіміравіч — нашчадак вядомага беларускага шляхетнага роду. Яго пачынальнікам лічыцца Гурый Алехновіч Рамейка, які некалі быў намеснікам Віцебскага ваяводы. Дык вось, ад яго імя ў размоўнай форме і ўтварылася Гурка, якое часта ўжывалася побач з родавым найменнем Рамейка. Адсюль і паходзіць прозвішча Іосіфа Гуркі. Таму ніякага сумнення ў беларускім паходжанні Іосіфа Уладзіміравіча няма. Нарадзіўся ён у 1828 годзе ў радавым маёнтку, цяпер гэта мясцовасць паміж вёскамі Скураты і Сурнаўка Круглянскага раёна на самай мяжы Магілёўскай і Віцебскай абласцей,— гаворыць старшыня таварыства «Беларусь—Балгарыя» прафесар Генадзь Цыхун.

Ён адзін з энергічных прыхільнікаў паўнацэннага вяртання ў памяць нашага народа прозвішча Іосіфа Гуркі. Генадзь Апанасавіч лічыць, што і нам надышоў час аддаць даніну павагі подзвігам слыннага ўраджэнца Беларусі. А разам з ім і тым тысячам беларусаў, якія загінулі на руска-турэцкай вайне за свабоду балгарскага народа. Невыпадкова ў Балгарыі ў многіх гарадах і пасёлках многія вуліцы і плошчы носяць імя Гуркі, у яго гонар названы шэсць населеных пунктаў краіны. Сёння члены таварыства «Беларусь—Балгарыя» рыхтуюць ліст і абгрунтаванне ў Мінгарвыканкам з прапановай адну з вуліц сталіцы назваць у гонар без перабольшвання і нашага нацыянальнага героя Іосіфа Уладзіміравіча Гуркі. Дадзеную публікацыю прашу лічыць голасам у падтрымку гэтай ідэі.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Адну з вуліц сталіцы варта назваць у гонар нашага нацыянальнага героя — Іосіфа Уладзіміравіча Гуркі.

Цяжкі пераход праз Балканы.

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ

Открытое акционерное общество

Полоцкий завод «Проммашремонт»

211408 г. Полоцк, ул. Ленинградская, 101

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 1 января 2008 года

млн руб.

НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЯ	Код строки	На начало года	На конец года
АКТИВ			
1. Внеоборотные активы	190	20171	20256
2. Оборотные активы	290	5190	4178
БАЛАНС	300	25361	24434
ПАССИВ			
3. Капитал и резервы	490	19650	18556
4. Обязательства	590	5711	5878
БАЛАНС	600	25361	24434

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

млн руб.

НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЯ	Код строки	За отчетный период	Период прошлого года
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	7222	9153
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	6973	8182
Управленческие расходы	040	-	-
Прибыль (убыток) от реализации	060	-824	-379
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов	120	64	4
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов	160	-830	-409
Прибыль (убыток) за отчетный период	200	-1590	-784
Налоги и сборы, производимые из прибыли	210	236	227
Прибыль (убыток) к распределению	240	-1834	-1150
Дивиденды за 2007 год в связи с отсутствием чистой прибыли не начисляются и не выплачиваются			

Директор Семенов С.В.
И.о. гл. бухгалтера Макаревич М.Я.

УНП 300075193

ОАО «Белаттракцион»

проводит открытый аукцион по продаже собственного имущества. Подробный перечень имущества указан на сайте www.belat.com. Аукцион состоится **18 апреля 2008 г. в 14.30 по адресу: г. Минск, ул. Могилевская, 68.**

Заявление на участие принимается до 17 апреля 2008 г.
Тел./факс (8 017) 222 73 14.

Страховой полис по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств, выезжающих на территорию РФ (АЙНИ), **серии ААА № 0407372892** СООО «Белкоопстрах» **считать недействительным.**

30 апреля 2008 г. в 8.00
состоится внеочередное общее собрание акционеров

ЗАО «Припутник»

по адресу: г. Минск, пр. Рокоссовского, 1, конференц-зал.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Оглашение результатов закрытой подписки на акции Общества дополнительной эмиссии.
2. Изменение осуществления акционерами Общества преимущественного права покупки акций Общества.
3. Изменение компетенции Наблюдательного совета Общества.
4. Изменение порядка созыва общего собрания акционеров Общества.
5. Внесение изменений в Устав Общества.

С документами Общества, относящимися к повестке дня, можно ознакомиться в приемной директора ежедневно, кроме выходных и праздничных дней с 9.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00.

Форма проведения собрания: очная. Форма голосования по всем вопросам повестки дня: прямая, открытая.

УНН 100071629

Открытое акционерное общество

«СТАРАЯ ФАБРИКА»

Юридический адрес: Республика Беларусь, 220030 г. Минск, ул. Октябрьская, 19
р/с 3012213010018 в Ленинском отделении ОАО «Белинвестбанк».
код 763 УНП 100640022 ОКПО 05893882 тел./факс 227 73 00

Годовой бухгалтерский баланс за 2007 год

в млн рублей

АКТИВ	Код строки	Сумма	ПАСИВ	Код строки	Сумма
Основные средства	110	1005	Уставный фонд	410	122
Нематериальные активы	120	1	Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей)	411	25
Запасы и затраты	210	30	Резервный фонд	420	6
Дебиторская задолженность	230	46	Добавочный фонд	430	908
Денежные средства	250	5	Нераспределенная прибыль	450	46
БАЛАНС	390	1087	Кредиторская задолженность	530	30
			БАЛАНС	890	1087

Отчет о прибылях и убытках за 2007 год

Операционные доходы	070	377
Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы	071	67
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы)	080	310
В том числе: от сдачи активов в аренду, лизинг, временное пользование	081	308
Прочие операционные доходы	083	2
Операционные расходы	090	237
В том числе: от сдачи активов в аренду, лизинг, временное пользование	091	235
Прочие операционные расходы	093	2
Прибыль от операционных доходов и расходов (080-090)	120	73
Убыток от внереализационных доходов и расходов	160	36
Прибыль (120-160)	200	37
Налоги, сборы и платежи из прибыли	210	35
Чистая прибыль (200-210)	240	2

Информация об открытом акционерном обществе и его деятельности

5. Количество акционеров — всего 453, в том числе юридических лиц — 0, физических лиц — 453.
6. Информации о дивидендах и акциях:

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	миллионов рублей	0,1	1,6
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	рублей	1	13
Обеспеченность акции имуществом Общества	тысяч рублей	8,9	8,9
Количество простых акций, находящихся на балансе Общества	штук	2984	2984

7. Информация о задолженности:

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Просроченная дебиторская задолженность	миллионов рублей	—	—
Просроченная кредиторская задолженность	миллионов рублей	—	—

9. Среднесписочная численность работающих (человек) — 13.
10. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета): сдачи внаем имущества.
Баланс и отчет подтверждены аудитором Соколовым А.И. (лицензия на право осуществления аудиторской деятельности № 02200/0416525, выданная Министерством финансов РБ 16.02.2004 г., срок действия по 15.02.2009 г., квалификационный аттестат Аудитора № 0000073 от 01.10.2002 г., выдан Министерством финансов РБ. Свидетельство о государственной регистрации № 076656 от 29 августа 2002 года, выдано Мингорисполкомом 29.08.2002 г., УНП 190384466).

Директор А.Л. Григорьев
Главный бухгалтер Е.В. Хорошко

РУП "БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ" ИЗВЕЩАЕТ
о проведение аукционных торгов по продаже собственности ОАО «БРЕСТРЕСТАВРАЦИЯ»

Номер лота	**ЛОТ № 1**	
Наименование объекта	**Административное здание (1928—1941г.), общ. пл. 215 м² (инв. № 130/С-2439)**	
Местонахождение объекта	Брестская обл., г. Пинск, пл. Октября, д. 3	
Продавец (Балансодержатель)	ОАО "Брестреставрация"	
Организатор торгов	РУП "Белтехинвентаризация" Брестское областное управление	
Начальная цена продажи, руб. без НДС		**183 553 000**
Размер задатка, руб.		**18 355 300**
Право на земельный участок	**0,0265**	после продажи объекта с аукционных торгов границы земельного участка будут уточняться путем выполнения комплекса топогеодезических работ
Тип и характеристика объекта	**3-этажное административное здание с пристройкой 1928—1941 года постройки**. Фундамент кирпичный ленточный; стены кирпичные оштукатурены; перекрытие деревянное; крыша шифер; полы дощатые, паркет. Проемы оконные двойные, дверные филенчатые. В здании имеются коммуникации: центральное отопление, водопровод, электроосвещение, канализация, телефон.	
Условия продажи	аукцион без условий	
Условия оплаты	оплата производится в течение 6 месяцев с момента подписания протокола аукционных торгов	
Срок заключения договора купли-продажи	не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов	
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 3012221130016 рубли РБ в Московском отд. ОАО "Белинвестбанк" в г. Минске код 741 УНН 190305149, расчетный счет 3012221135024 доллары США	

Аукцион состоится 12 мая 2008 г. в 11.00
по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329
Брестское областное управление РУП "Белтехинвентаризация'

Для участия в аукционе необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с РУП "Белтехинвентаризация".
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам — резидентам Республики Беларусь — доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации.
4. Юридическим лицам — нерезидентам Республики Беларусь — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.
5. Юридическим и физическим лицам — нерезидентам Республики Беларусь документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.
6. Представителям юридических и физических лиц — нерезидентов Республики Беларусь — легализованную в установленном порядке доверенность.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

* Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает продавцу НДС в размере 18 % от продажной цены объекта.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:
г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00
Последний день приема заявлений — 8 мая 2008 г. до 17.00.
Контактные тел.: 8-(0162) 23-94-25, 23-92-59, 21-88-81.

УНП 190305149

КАР'ЕРА, ГРОШЫ ЦІ КАХАННЕ

Часы мінаюць, а людзі ўсё тыя ж: шукаюць кахання і ў той жа час могуць яго згубіць з-за таго, што ёсць у іх больш канкрэтныя і ўяўныя мэты. Такі герой будучага тэлефільма «Пакуль мы жывыя», які здымае рэжысёр Сяргей Сычоў.

За дзве серыі мы станем сведкамі не толькі гісторыі асобнага чалавека, галоўнага героя Карнея Андрэевіча, але нават вернемся ў нядаўняе мінулае і ўзгадаем часы Перабудовы. Менавіта перамены ў грамадстве паўплываюць на свядомасць героя, які ўжо вельмі хоча зрабіць выдатную кар'еру. Быў камсамольцам, потым актыўным партыйцам, але калі вецер падзьмуў у іншы бок, ён не вагаючыся спаліў свой партбілет дзеля таго, каб і далей рабіць кар'еру. Акрамя гэтага яго яшчэ цікавяць грошы — менавіта з-за іх ён бярэ шлюб з жанчынай, якую не кахае. Але паспяховы бізнэсмен разумее, што насамрэч думае пра жанчыну, якая з юнацкіх гадоў кахала толькі яго. Той, што прывык выкарыстоўваць людзей, на гэты раз вымушаны задумацца: ці патрэбнае ёй такое каханне?.. На ролі запрошаны ў асноўным беларускія артысты: Юлія Кадушкевіч, якая ўжо іграла ў фільме Сычова «Я помню», Віктар Манаеў, Алеся Пухавая, Вера Палякова і іншыя. Ролю галоўнага героя выканае расійскі акцёр Дзмітрый Арлоў.

Ларыса ЦІМОШЫК.

В публикации ОАО «Минский подшипниковый завод» (Продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (газета «Звязда» № 55 от 22.03.08 г.) следует читать: Аукцион состоится 9 апреля 2008 г. в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 8 апреля 2008 года до 16.00 по адресу: г. Минск

КАБ КАЛЫСКІ СВАЁЙ НЕ ЗАБЫЦЦА

ЗВЯЗДА 9 красавіка 2008 г.

Культуру сваю на поўдзень руш!..

У красавіку пра беларускае мастацтва шырока загавораць у далёкіх ад нас цёплых краінах. Дні культуры Беларусі пройдуць спачатку ў Сірыі (14—17 красавіка), адтуль дэлегацыя накіруецца ў Егіпет і прабудзе там з 17 па 24 красавіка. Далей застанецца пакарыць Туркменістан (23—25 красавіка).

Сірыйцы ўпершыню паглядзяць на беларускі балет. Для знаёмства абралі «Лебядзінае возера»: каб уразіць жыхароў паўночнай краіны і ў той жа час не надта напружваць іх строгія норавы. Наша выяўленчае мастацтва павінна адлюстраваць выстава з 25 прац сучасных аўтараў: Савіч, Тоўсцік, Зінкевіч, Альшэўскі, Шкаруба. Іх творы не патрабуюць тлумачэнняў. Як, напэўна, і беларускае кіно, якое само па сабе можа патлумачыць, што ёсць наша краіна. Для гэтага абраныя стужкі «Я памятаю» і «Шчыт Айчыны».

Для егіпцян беларуская культура ўжо не адкрыццё, таму праграма будзе пашырана за кошт балетных спектакляў — усяго іх паставяць пяць. А вось у Туркменістан Беларускі балет не паедзе. Магчыма, спачатку трэба нашым культурам прыгледзецца адна да адной: упершыню наша незалежная краіна дэманструе сваю культуру народу, з якім яшчэ нядаўна мы жылі ў адной сям'і. Тут яшчэ падумаць трэба, з чым прыехаць у госці. Вось і вырашылі, што ў Ашхабад паедзе самае праверанае беларускае мастацтва: Дзяржаўны ансамбль танца, «Песняры», «Верасы», тэатр песні Ірыны Дарафеевай, Іна Афанасьева.

Ларыса ЦІМОШЫК.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вельмі разнастайны і ў той жа час яскравы склад удзельнікаў гэтага форуму: вядомыя навукоўцы, спецыялісты ў галіне філасофіі, тэорыі і гісторыі культуры, мастацтвазнаўства, этналагі, фальклярысты. Побач з імі іх аднадумцы — педагогі, практыкі, якія плённа працуюць у школах, гімназіях, ВНУ. Поруч вясковыя бабулі і дзядулі — тыя, хто ва ўмовах сённяшняй масавай культуры захаваў здольнасць і жаданне спяваць, танчыць, граць на інструментах гэтаксама, як калісьці рабілі бацькі, дзяды і ўвогуле далёкія продкі. Для іх, сучасных носьбітаў нашай традыцыйнай побытавай культуры, магчыма, здавалася дзіўным, што, напрыклад, вясковую польку ў дванаццаць кален вывучаюць славутыя прафесары, здымаюць відэакамерамі. Ці яшчэ вось прыклад: спявае бабуля (нягучна, шчыра), і кожная нотка, кожнае простае напеўнае слоўца кладзецца ў запісы этнафоназнаўцаў як залатыя часцінкі вялікага скарбу.

А чаго варты толькі кароценькі пералік назваў навуковых дакладаў самых юных удзельнікаў — школьнікаў: «Мудрасць бабуліных песень і казак», «Традыцыйнае выхаванне ў сям'і: дзяўчынка, дзяўчына, жанчына», «Даўнія сродкі лячэння», «Традыцыйная кухня майго краю», «Песенны фальклор маёй вёскі»...

Дзеля чаго працавала канферэнцыя, да якіх высноў прыйшлі яе ўдзельнікі, узначаленыя шаноўнымі навукоўцамі-даследчыкамі?

Прывяду словы яе ўдзельніка прафесара кафедры тэорыі і гісторыі культуры Беларускага дзяржаўнага педуніверсітэта імя М. Танка Аляксея Рагулі: «Усе даклады і паведамленні, заслуханыя на канферэнцыі, маюць тэндэнцыю да навуковага асэнсавання той працы, якая ідзе ў школах, гуртках, творчых калектывах. Узнікае патрэба ўкаранення назапашанага вопыту ў выяўленні, адлюстравання яго ў дзяржаўных дакументах і школьных праграмах. За ўсім гэтым стаіць другая задача: рэканструкцыя сістэмы гуманітарнай адукацыі, бо, фактычна, сёння мы не зможам пераадолець пагрозу татальнага спустошвання чалавека».

Вывучаць, захоўваць традыцыйную культуру, выкарыстоўваць гэту каштоўную спадчыну ў выхаванні дзяцей — вось галоўная думка ўдзельнікаў канферэнцыі. Вельмі добра, што сёння існуюць праекты, у рэчышчы якіх наладжваецца пераемнасць гэтай традыцыйнай культуры. Напрыклад, праект «Традыцыйная культура і дзеці» ахоплівае цяпер больш за дзесяць тысяч школьнікаў і сотні педагогаў. Моцная навуковая суполка з ліку супрацоўнікаў лабараторыі традыцыйнага мастацтва Беларускага дзяржаўнага Інстытута праблем культуры стала інтэлектуальным цэнтрам гэтага праекта. Выніковая імпрэза — фальклорны фестываль «Берагіня», які сёлета пройдзе ўжо ў пяты раз і зноў прыцягне да сябе ўвагу не толькі ў Беларусі, але і ў краінах-суседках.

Якія ж здабыткі мае на практыцы названы праект «Традыцыйная культура і дзеці»? Агульна кажучы — ён спрыяе фарміраванню асобы грамадзяніна-патрыёта, без якой наўрад ці можна ўяўляць нацыянальную бяспеку краіны. Варта нагадаць словы ўдзельніка канферэнцыі дэкана факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва Белдзяржуніверсітэта культуры і мастацтваў Вячаслава Калацэя: «Сёння сярод нашых студэнтаў ёсць былыя ўдзельнікі школьных фальклорна-этнаграфічных гуртоў, якія займаюцца даволі рэдкім накірункам — вывучаюць этнічныя спевы, спецыялізуюцца ў этнафоназнаўстве. Апошняе як спецыялізацыя навучання ў нашым універсітэце не мае аналагаў на ўсёй постсавецкай прасторы і з'явілася ў выніку «адкрыцця» таленту на фестывалі «Берагіня». Сярод нашых студэнтаў ёсць і былыя школьнікі з вёскі Мётча».

Музыкі Сямён СЕЛІВАНАЎ і Віктар ГАЛАЙДЗЕНКА ведаюць шмат старых

Гэты абярэг выраблены ўмельцамі з Акцябрскага.

У час работы канферэнцыі зала была ўпрыгожана дзяржаўнай і мясцовай сімволікай.

Вось, як кажуць, і замкнулася кола кароткіх успамінаў і разважанняў пра канферэнцыю, што адбылася днямі ў гарадскім пасёлку Акцябрскі. Замкнулася невыпадкова на словах пра Мётчанскую школу, дзе адзінаццацікласніца Таццяна Бойка напісала даследчую работу пра сваю калыску, радавод, суседзяў. Менавіта ў гэтай навучальнай установе пад кіраўніцтвам таленавітага педагога Антаніны Абрамовіч зарадзіўся рух мясцовых даследчыкаў мастацкай спадчыны, абрадавай і пазаабрадавай культуры. У школе сталі рэгулярнымі фальклорныя вандроўкі, сустрэчы з носьбітамі мастацкіх традыцый, вучні далучаюцца да інтэлектуальнай работы — пішуць навуковыя рэфераты і даклады, удзельнічаюць у канферэнцыях рознага ўзроўню. У школе створана этнагасцёўня — гэта і этнамузей, метадкабінет, вучэбны клас, агульнаўпадабанае месца творчых сустрэч дзятвы і дарослых...

Які момант мінулай канферэнцыі падаўся самым эмацыянальна насычаным? Безумоўна, той, калі пад гармонік настаўніцы Антаніны Абрамовіч завіхурыў-паляцеў імклівы беларускі карагод. Танчылі ўсе разам: гарэзлівыя школьніцы, паважаныя навукоўцы, бабулі і дзядулі з суседніх вёсак. Бачылася ў тым карагодзе жыццядайная повязь пакаленняў.

Аўтар ідэі і кіраўнік праекта «Традыцыйная культура і дзеці» вядомы навуковец і этнахарэограф Мікалай Козенка папрасіў перадаць усім чытачам «Звязды», хто цікавіцца народнымі спевамі, танцамі, гульнямі, запрашэнне наведаць чарговы пяты фестываль «Берагіня».

Сёлета ён будзе праходзіць з 19 па 22 чэрвеня і збярэ каля шасцісот удзельнікаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Літвы. Як заўжды, гэты фальклорны фэст адбудзецца ў Акцябрскім.

Яўген ПЯСЕЦКІ.
Фота аўтара.

СВАЯЧКІ-РАБАЎНІЦЫ

У Баранавічах пацярпела 80-гадовая пенсіянерка, якая пражывае па вул. Савецкай. На яе напалі дачка і 25-гадовая ўнучка і забралі 320 тыс. рублёў. Пра гэта пенсіянерка заявіла ў міліцыю. Свячак-рабаўніц затрымалі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.22	20.01	13.39
Віцебск —	6.10	19.53	13.43
Магілёў —	6.12	19.51	13.39
Гомель —	6.12	19.45	13.33
Гродна —	6.38	20.15	13.37
Брэст —	6.41	20.13	13.32

Месяц

Першая квадра 6—11 красавіка.
З 4.28 месяц у сузор'і Блізнятаў.

Імяніны

Пр. *Матроны, Івана.*
К. *Маі, Марыі, Вадзіма, Дзмітрыя, Марціна, Марцэля.*

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА	+15..+17°С	КІЕЎ	+19..+21°С	РЫГА	+9..+11°С
ВІЛЬНЮС	+12..+14°С	МАСКВА	+21..+23°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+10..+12°С

Дзве даты

9 красавіка

1581 год — створаны Трыбунал Вялікага княства Літоўскага (Галоўны Літоўскі Трыбунал), найвышэйшы судовы апеляцыйны орган старажытнай беларускай дзяржавы. Разглядаў скаргі на рашэнні земскіх, гарадскіх судоў і мясцовай адміністрацыі. Справы вырашаліся на падставе Статутаў ВКЛ і сеймавых канстытуцый. Сесіі трыбунала праходзілі ў Наваградку, Вільні, Троках, Гродна.

1641 год — у Белавежскай пушчы ўведзены першыя абмежаванні палявання на зубра і ўведзены рэжым, блізкі да запаведнага.

Цытата дня:

«Каханне — як ртуць: можна ўтрымаць яго ў раскрытай далоні, але не ў сціснутым кулаку».

Дораці Паркер (1893-1967), амерыканская пісьменніца.

Усміхнёмся!

— Ты паяць умееш?
— Не.
— Дрэнна.
— Дрэнна — умею.

☺

Навіны навукі: нашымі вучонымі распрацаваны новы марсаход, які адбірае пробы грунта ў амерыканскага.

☺

— Алё, доктар!
— Што здарылася?
— Я з'еў паўбляшанкі шпротаў, запіваючы малаком... Пытанне: трускалкі мыць або ўжо ўсё роўна?..

☺

Калі на сярэдзіну каната прывязаць бутэльку гарэлкі, дык перацягваць яго будуць з большым азартам.

☺

Бацькі адчытваюць Вовачку:
— На мінулым бацькоўскім сходзе настаўнік фізкультуры скардзіўся, што ў цябе дысцыпліна кульгае. Ты ўжо адрэагаваў на заўвагу?
— Адрэагаваў. Цяпер настаўнік кульгае.

«Нарэшце выглядаю такім, як сябе адчуваю!»

Эксклюзіў

Руслан АЛЯХНО пра «Еўрабачанне», імідж і рэстаранны бізнэс

Сёлетняга прадстаўніка Беларусі на «Еўрабачанні» застаць на радзіме складана. То ён у Фінляндыі запісвае рэміксы на конкурсную песню, то ў Грэцыі пад рукамі вопытных стылістаў мяняе вобраз, то недзе паміж Масквой і Кіевам здымае кліп... Не дзіва, што пры такім рэжыме галоўнае жаданне — выспацца. Але жаданні жаданнямі, а працу, часткай якой з'яўляюцца стасункі з прэсай, ніхто не адмяняў.

Мы сустрэліся ва ўтульнай студыі Аляксандра Ціхановіча і Ядзвігі Паплаўскай, дзе на час знаходжання ў Мінску Руслану выдзелілі часовую «рэзідэнцыю». І, пакуль не пачалі разрывацца тэлефоны, цудоўна пагаварылі за кубкам гарбаты.

— Буду, напэўна, банальнай, але сапраўды незразумела — чаму ты так доўга збіраўся з падачай заяўкі на «Еўрабачанне»? Здавалася б, на хвалі папулярнасці, толькі стаўшы «народным» — прыехаў сюды і «парваў» усіх канкурэнтаў на нацыянальным адборы...

— Натуральна, у папярэднія гады — летась, пазалетась — у мяне былі думкі аб удзеле ў «Еўрабачанні». Аднак калі я збіраўся нарэшце падаваць заяўкі, аказвалася, што спазніўся — усе тэрміны ўжо праходзілі і адборы завяршаліся. Штосьці забывалася, штосьці не паспявалі зрабіць... І яшчэ ведаеш, у чым справа? Трэба было самому вырашыць, што — усё, гэта самае важнае. Адкінуць усе справы, адмяніць канцэрты і займацца канкрэтна і выключна падрыхтоўкай да конкурсу. Сёлета ўсё нарэшце атрымалася.

— Прадзюсары не былі супраць?

— Наадварот, сказалі: «А чаму б і не паспрабаваць?» Я вельмі рады і задаволены, што прайшоў усе гэтыя адборы і што прадстаўляю Беларусь, бо «Еўрабачанне» — новы этап, якраз скравая падзея ў маім жыцці, як творчым, так і ў звычайным. Выступіць ад Расіі? Не, увогуле не было такой ідэі, сто працэнтаў. Упэўнена магу гаварыць аб тым, што там... (усміхаецца аднымі вуснамі. — **Аўт.**) не зусім усё сумленна. Ёсць пэўныя падводныя камяні, якія вырашаюць лёс удзельнікаў гэтых праектаў, і ты з самага пачатку разумееш, што не пройдзеш.

Конкурсную песню "Hasta la Vista", да якой на адборы ў журы было нямала прэтэнзій, замежныя спецыялісты давялі да ладу — цяперашняя версія зроблена не папсовай, а поп-рокавай. «У песні з'явілася драматургія і дынаміка, яна стала больш еўрапейскай, — лічыць Руслан. — Калі першы варыянт быў фарматным для радыёстанцый, то гэты — якраз для конкурсу «Еўрабачанне». На кампазіцыю ў Фінляндыі запісана 5 рэміксаў у розных стылях, каб кожны слухач і кожная радыёстанцыя маглі выбраць свой «фармат», плюс рускамоўная версія, аўтарамі якой таксама выступілі Тарас Дзямчук і Элеанора Мельнік. Самому спеваку, які не вывучаў англійскую мову, «падцягнулі» вымаўленне, прычым не проста выкладчыкі і не проста носьбіт мовы, а замежны спецыяліст, які (дакладней, якая — абаяльная спявачка Вікторыя) непасрэдна рыхтаваў да конкурсу «Еўрабачанне» многіх іншых удзельнікаў — Сакіса Рувасу, Алену Папарызу, Костаса Мартакіса, які сёлета ўдзельнічаў у грэчаскім адборы...

— Калі ты атрымліваеш задавальненне ад работы, якая правадзіцца, тады і вынік добра бачны, — перакананы Руслан. — А калі ўсё гэта робіцца гвалтоўна, толькі таму, што трэба, — выніку не будзе. Я лічу, што прагрэс відавочны, і паіншаму быць не магло: нумар, які быў прадстаўлены ў Беларусі і які будзе паказаны на сцэне ў Сербіі — дзве зусім розныя рэчы. У нумары для «Еўрабачання» будзе шэсць чалавек, у тым ліку спяваючы балет і бэк-вакал з Грэцыі, плюс эфектныя дэкарацыі... Але гэта не галоўная фішка, фішка заключаецца зусім у іншым! (*Смяецца.*) Павінна атрымацца яскрава і відовішчна. Але гэта сакрэт.

— Ну, добра, няхай тое, што будзе адбывацца, застанецца сакрэтам. А хто паедзе цябе падтрымліваць — не толькі на сцэне, але і за сцэнай — спадзяюся, не тайна?

— Зразумела, паедзе вялікая каманда ад Белтэлерадыёкампаніі, якая ў нашай краіне займаецца конкурсам. Гэта і ўрач-фаніятар Жана Раманава, Аляксандр і Насця Ціхановічы, Дзмітрый Баранаў. Паедзе і мая Іра (дзяўчына Руслана — актрыса Ірына Мядзведзева. — **Аўт.**); у яе, дарэчы, колер валасоў, як у цябе, — хітра ўсміхаецца спявак, прыводзячы мяне ў разгубленасць.

— Не ведаю, ці ў курсе ты, але твайму кліпу самы ўплывовы рускамоўны сайт пра «Еўрабачанне» ESCkaz паставіў вышэйшую ацэнку — 10 балаў. Такіх ацэнак удастоіліся літаральна чалавек 5. Але гэта погляд пабочны, а самому наколькі спадабалася гэта праца?

— Кліп зрабіў рэжысёр Сямён Гораў, вядомы ў Расіі, ва Украіне і ў Беларусі па работе не толькі над кліпамі, але і над мюзіклами, як «Вечары на хутары паблізу Дзіканькі» і «Жаніцьба Фігаро». Я атрымаў каласальнае задавальненне ад здымак. Рэжысёру, мне здаецца, удалося раскрыць той вобраз, які ў мяне зараз, і зрабіць усё спалучэнне гарманічным — карцінку, музыку, сюжэт... Так што мяне радуе, калі чую добрыя водгукі пра кліп. Хоць чую, натуральна, і негатыўныя — і гэта таксама добра, бо ў кожнага чалавека сваё меркаванне, яны розныя, нельга спадабацца ўсім.

— Бачу, што ты валасы пастаянна папраўляеш — не прызвычаіўся яшчэ да новага вобраза?

— Ды не тое каб не прызвычаіўся — проста чуб ужо адрос, на вочы падае. Трэба ехаць зноў да грэчаскіх стылістаў і пастрыгчыся.

— Значыць, у кардынальна новым іміджы «няголенага мачо» адчуваеш сябе ўпэўнена? А то пішуць, што Руслана Аляхно ўжо і сябры не пазнаюць...

— Дык гэта ж супер! У чарговы раз пераконваюся, што буду багатым! А што да іміджу — вось табе падабаецца?

— Мне — так. Не вельмі звыкла ў параўнанні з тым, якім мы цябе бачылі год ці два таму, але цікава.

— Мне таксама падабаецца. Бо такім я заўжды быў унутрана, у душы. Але выглядаў інакш, бо гэтага вымагаў рэпертуар і прадуманыя маімі прадзюсарамі вобраз, за рамкі якога нельга было выходзіць. Гэта мноства фактараў. А зараз дзякуючы песні, дзякуючы «Еўрабачанню» я нарэшце магу выглядаць так, як сябе адчуваю. І адчуваю абсалютна камфортна.

— Кажуць, што сёлета для «Еўрабачання» будзе падрыхтавана салодкая і алкагольная сувенірная прадукцыя — зефір, мармелад, каньяк ды гарэлка. Гэта праўда?

— Я таксама пра гэта чуў. Зефір будзе выпускаць бабруйскае прадпрыемства «Чырвоны харчавік» — прыемна, што мой родны горад пасадзейнічае мне ў конкурсе і будзе мець дачыненне да прадстаўлення Беларусі ў Еўропе. Тым больш, у Еўропе амаль што няма такога прадукту — ва ўсякім разе, дакладна няма такога смачнага зефіру.

— Ты сам неяк будзеш уплываць на гэты працэс?

— Уся наша каманда бярэ ў ім удзел. Але асабіста я з'яўляюся чалавекам, які не вельмі добра ставіцца да салодкага і да алкаголю, асабліва моцнага — таму я абавязкова прыслухаюся да парад спецыялістаў. Зрэшты, пакаштаваць на смак не адмоўлюся. Мне ўвогуле здаецца, што зефір — гэта смак дзяцінства, які не змяняецца.

— Працягнем кулінарную тэму. Летась доўга мусіраваліся звесткі, што Руслан Аляхно адкрывае ў Баранавічах уласны італьянскі рэстаран. Пайшоў бізнэс?

— Бізнэс не пайшоў, бо не было калі гэтым займацца. Сабраўся было грунтоўна ўсё рабіць, вывучаў італьянскую кухню — але зразумеў, што проста не хопіць часу. І тое памяшканне, што мне падарылі, я проста перадарыў іншым людзям, якім гэта сапраўды цікава і якія цяпер шчыльна займаюцца якраз рэстаранным бізнэсам. Не ведаю нават, што там будзе — можа, кавярня, можа, крама... Але я ад гэтага адышоў.

— Чымсьці іншым, акрамя музыкі, займацца не плануеш? Твой калега па «Народным артысце» Аляксандр Панаётаў неяк абмовіўся, што піша мастацкую кнігу...

— Мне ўсё ж бліжэй тэма рэстаранаў. Я вельмі люблю гатаваць, стараюся рабіць гэта смачна і цікава, бо страва таксама можа быць творам мастацтва, яе трэба прыгожа аздабляць... Калі ўявіць, што я ўсё ж засвоіў бы рэстаранны бізнэс, то ў мяне, напэўна, быў бы такі рэстаран, у якім я кожную страву сам каштаваў бы, і нават склаў бы адмысловае меню ад Руслана Аляхно. Так што ў будучым, калі выпадзе магчымасць, з задавальненнем адкрыю рэстаран — і запрашу цябе на адкрыццё. (Мы намякнулі Русману, што магчымасць праявіць кулінарныя здольнасці будзе ў яго ў Бялградзе на аб'яднанай славянскай вечарынцы. «А што, — ажывіўся спявак, — калі дазволяць, абавязкова што-небудзь фірменнае згатую!» — **Аўт.**)

— Не хачу нагнятаць абстаноўку, але ў нас склалася такое дзіўнае стаўленне да «Еўрабачання» — усе хочуць толькі перамогі і не даруюць «правалу». Калі нешта з таго, што ты запланаваў, не атрымаецца, ці гатовы ты да другой спробы?

— Ведаеш, я — чалавек, які старэецца рэальна глядзець на жыццё, а не разважаць, што было б, калі б абставіны склаліся не так, а інакш. Я буду рабіць усё максімальна магчымае, каб выступіць годна. «Еўрабачанне», не раз пра гэта казалі — непрадказальны конкурс, і ніхто не ведае, якія фактары ўплываюць на вынік. (Сапраўды, нават маэстра Міхаіл Фінберг, які, між іншым, першым з беларусаў пабываў на «Еўрабачанні» яшчэ ў 1995 годзе, прызнаўся нам, што не разумее цяперашніх крытэрыяў ацэнкі на конкурсе. — **Аўт.**) Патрэбна і песня, і шоў, і талент — але не факт, што менавіта яны выведуць да перамогі. Гэта конкурс, і на яго трэба адпраўляцца са здаровым пачуццём канкурэнцыі і настроем на перамогу. Але не з ідэяй-фікс — перамога або нічога. Тое, што ад мяне залежыць — харэаграфія, выкананне песні — я зраблю як мага лепш. А вынік... Яго ўсё адно не ўгадаеш.

— Незалежна ад вынікаў «Еўрабачання», жыццё пасля конкурсу працягнецца. Чым плануеш заняцца ў першую чаргу — дапісаць другі альбом або адпачыць?

— Нават не думаю пра гэта, ні пра альбом, ні пра новыя песні, усе думкі — толькі пра «Еўрабачанне».

— Білан вось паабяцаў журналістам, што пасля «Еўрабачання» жэніцца...

— Цудоўна. Я таксама жанюся.

— ?

— Безумоўна, жанюся. Калі захачу. Калі прыйдзе час. Зразумела, увогуле пасля «Еўрабачання» — я нармальны чалавек, які таксама хоча мець сям'ю і наладзіць сваё асабістае шчасце...

Парады наконт удзелу ў конкурсе дае практычна кожны чалавек, які мае да яго дачыненне — але спявак прыслухоўваецца найперш да сваёй каманды, да тых, каму давярае. Старанна працуе з псіхолагам, выконвае ўсе парады ўрача-фаніятара Жаны Раманавай — штодня раніцай і вечарам мінімум па паўгадзіны неабходна рабіць спецыяльную дыхальную гімнастыку, якая не толькі ўмацоўвае звязкі і падтрымлівае голас у належным стане, але і папярэджвае розныя прастудныя захворванні. 5 красавіка Руслан Аляхно адправіўся ў Грэцыю, дзе ставіцца конкурсны нумар (так і чую галасы крытыкаў: «Зноў беларусы прыцягваюць легіянераў на дапамогу, нічога самі зрабіць не могуць!» — але чаму б і не прыцягнуць, калі гэта схема працуе?). А праз паўтара месяца, 22 мая, выйдзе на сцэну ў паўфінале «Еўрабачання» — і тады застанецца разлічваць толькі на сябе ды яшчэ, быць можа, на ўдачу.

— Ты, дарэчы, верыш ва ўдачу? Ці ў поспеху ёсць дакладна вывераныя складнікі? — цікаўлюся я ўжо на развітанне.

— Формулы поспеху не існуе, — сцвярджае Руслан. На хвілінку задумваецца над блакнотам і...



Гутарыла Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
P.S. Удачы, Руслан!

А што параўноўваюць з кімсьці з іншых артыстаў... Ну і няхай параўноўваюць! Я да гэтага гатовы і стаўлюся спакойна, бо ведаю, што я — гэта я. Дрэнна было б, калі б увогуле маўчалі, а калі гавораць — значыць, людзям не ўсё роўна, не абыякава.

Шанцаў удвая менш, адказнасці — удвая больш

На конкурсе маладых выканаўцаў, што адбудзецца падчас «Славянскага базару ў Віцебску», Беларусь сёлета могуць прадставіць бабруйчанін Віталь Яфіменка або Сандра Вальковіч з Мінска. У фінал адборачнага туру Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск-2008» прайшлі Раман Валазнёў з Мінска і Аліна Молаш з Івацэвічаў. Каму з іх давядзецца абараняць гонар краіны на фестывальнай сцэне, стане вядома напрыканцы красавіка — пачатку мая, калі адбудзецца галаканцэрт фіналістаў. Сёлета, нагадаем, змяніліся правілы абодвух конкурсаў: калі раней краіны-арганізатары мелі права выстаўляць па 2 канкурсанты, то цяпер — толькі па 1 удзельніку.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

7 Седьмая линия

Унитарное страховое предприятие

(220035, Минск, ул. Тимирязева, 65А, тел. (017) 289-92-56

Годовой баланс за 2007 год

млн руб.

АКТИВ		ПАССИВ	
1	*2*	*3*	*4*
Основные средства	**14,8**	**Источники собственных средств, всего**	**1288,1**
Нематериальные активы	**2,0**	в том числе: уставный фонд	1111,9
Финансовые вложения, всего:	**4038,1**	резервный фонд	24,2
в том числе: инвестиции в дочерние общества	—	добавочный фонд	42,6
инвестиции в другие организации	—	фонд накопления	10,1
облигации и другие долговые обязательства	4038,1	фонд потребления	—
прочие финансовые вложения	—	целевое финансирование	—
Доля перестраховщиков в страховых резервах	—	нераспределенная прибыль прошлых лет	1,3
		нераспределенная прибыль отчетного года	98,0
Дебиторы, всего:	**6,1**	**Страховые резервы и фонды, всего**	**4666,2**
в том числе: дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования	0,5	в том числе: страховые резервы	4656,3
		фонд предупредительных (превентивных) мероприятий	7,7
депо премий по рискам, принятым в перестрахование	—	гарантийные фонды	2,2
		Кредиторы, всего	**2,5**
дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	5,6	в том числе: кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования	—
Прочие активы, всего	**1896,5**	кредиторская задолженность по операциям перестрахования	—
в том числе: незавершенное строительство	—	депо премий по рискам, переданным в перестрахование	—
материальные ценности и затраты	21,3	заемные средства	—
денежные средства	1875,2	кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	2,5
собственные акции (доли)	—		
прочие активы	—		
Непокрытые убытки прошлых лет	—	**Прочие пассивы**	**0,7**
Непокрытые убытки отчетного года	—		
БАЛАНС	**5957,5**	**БАЛАНС**	**5957,5**

Отчет о финансовых результатах за 2007 год

млн руб.

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период
I. Страхование жизни		
Страховые взносы (премии)	010	1616,9
Страховые выплаты	020	400,0
Изменение резерва по страхованию жизни (+ или -)	030	-1352,2
Отчисления в гарантийный фонд	040	34,5
Расходы на ведение дела	041	116,1
Результат от операций по страхованию жизни (+ или -)	050	**-285,9**
II. Страхование иное, чем страхование жизни (+ или -)		
Страховые взносы (премии) – нетто перестрахование (+ или -)	064	—
Изменение резерва незаработанной премии – нетто перестрахование (+ или -)	067	—
Оплаченные убытки (страховые выплаты) – нетто перестрахование	082	—
Изменение резервов убытков – нетто перестрахование (+ или -)	092	—
Изменение других технических резервов (+ или -)	100	—
Изменение иных страховых резервов (+ или -)	105	—
Отчисления в фонд предупредительных (превентивных) мероприятий и гарантийные фонды	110	—
Расходы на ведение дела	120	—
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование	121	—
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование	122	—
Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -)	130	—
III. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы I и II		
Операционные доходы	140	302,4
Операционные расходы	145	23,3
Внереализационные доходы	150	161,1
Внереализационные расходы	155	3,6
Финансовый результат	157	150,7
Использовано прибыли	158	52,7
Нераспределенная прибыль (убыток) отчетного периода (+ или -)	170	**98,0**

Бухгалтерская отчетность УСП «Седьмая линия» отражает достоверно во всех существенных отношениях его финансовое положение на 01.01.2008 г. и результат финансово-хозяйственной деятельности за 2007 г.

Аудитор Волчкова А.К. Лицензия на осуществление аудиторской деятельности в страховании № 02200/0061832 от 15.02.2006 г., выданная Министерством финансов Республики Беларусь.

УНП 806000018

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zviazda.by; www.zviazda.by/ru/main (*новая версія, якая тэсціруецца*)

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.840 Індэкс 63850. Зак. № 1880. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12